№ 43 (401) 19 лістапада 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднаўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

# № 401

«Наша Ніва» пайшла на пятую сотню. За шэсьць нумароў, з студзеня 2005 году яна пачне выходзіць на 24 старонках. Рэдакцыйнае кола прадукуе столькі тэкстаў, а ў беларускім нацыянальным жыцьці адбываецца столькі падзеяў, што яны ўжо не зьмяшчаюцца на шаснаццаці старонках. А яшчэ ж тры гады таму тыя шаснаццаць здаваліся такім дасягненьнем! З Новага году штонумар мы будзем аддаваць па тры старонкі пад навіны грамадзкага і палітычнага жыцьця і літаратуру з кніжнымі аглядамі, па дзьве старонкі пад спэцыяльныя рэпартажы і міжнародныя паведамленьні, па поўнай старонцы пад спорт і музыку, тры старонкі пад камэнтары і пошту. У пятай сотні нумароў «НН» можна будзе прачытаць пра ўсё. Па-беларуску, ясна.

ПАЛІТЫКА

### Ці пачуюць коні мяса?



Разважаньні да нарады дэмакратычных кандыдатаў 28 лістапада. **Старонка 11.**

ТЭМА

### Кузьня беларускіх піратэхнікаў

Філфаку БДУ 65 гадоў. Тэма нумару. **Старонкі 8—10.**



РЭЛІГІЯ

### Сьвята Язафата

Угодкі самага супярэчлівага сьвятога ў беларускай гісторыі. **Старонка 12.**

ЭСЭ

### Дзеці нашыя і дзеці чужыя

Бяда тут ня ў тым, што дзеці робяць альбо чаго яны рабіць не асьмельваюцца. Пытаньне ў тым, наколькі яны вольныя ў сваіх думках. **Старонка 15.**

РЭПАРТАЖ



### Пэн застаецца ў краіне

«Партрэт невядомага мужчыны» набыў за 22 тысячы даляраў калекцыянэр зь Беларусі. **Старонка 3.**

# Нашы ў горадзе

**15 лістапада ў цэнтры Менску, на скрыжаваньні праспэкту Скарыны й вуліцы Казлова сярод дня ўзьняўся бел-чырвона-белы сьцяг памерам 1,5х3 мэтры. Палотнішча, вывешанае двума актывістамі «Зубра», правісела некалькі гадзінаў. Адначасова «зубры» вывесілі расьцяжку «Свабоду Марынічу» на мосьце каля чыгуначнага вакзалу. Нікога з удзельнікаў не затрымалі. «Нацыянальны сьцяг заўсёды быў сымбалем барацьбы беларускага народу. Сёньня ён стаў яшчэ й сымбалем свабоды, эўрапейскага шляху для краіны», — сказаў удзельнік акцыі. Дзеяньні «Зубра» былі прымеркаваныя да ўрачыстага падпісаньня вынікаў рэфэрэндуму Аляксандрам Лукашэнкам 17 лістапада.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Лукашэнка хваліў народ у цэлым і граміў яго па частках

**Вываз дзяцей за мяжу на аздараўленьне будзе спынены. Міністар Навумаў адкажа за фары галавой. Прагрэсуючыя хваробы грамадзтва прапануецца лячыць ранейшымі мэтадамі.**

Калі б не наяўнасьць на трыбуне новых кіраўнікоў палатаў, можна было падумаць, што па тэлевізары паказваюць запіс інаўгурацыйнае прамовы Аляксандра Лукашэнкі 2001 г., а не цырымоніі падпісаньня вынікаў рэфэрэндуму. Іншы раз паўтараліся ня проста тэзы, а і канкрэтныя ўказаньні ўраду: да прыкладу, зьменшыць колькасьць ліцэнзаваных відаў дзейнасьці, каб прадпрымальнікі «маглі адцягнуць з рынку беспрацоўя пару дзясяткаў тысяч чалавек».

З новага — А.Лукашэнка асабіста вызначыў, колькі кіраўнікоў парляманцкіх камісій мусяць быць зь якога рэгіёну, забараніў дэпутатам ствараць фракцыі і групы і выклікаць міністраў на справаздачу.

**Працяг на старонцы 2.**

## Кроў, шакаляд, самалёты

### Беларусы ўцягнутыя ў канфлікт у Кот-д'Івуары

Дагэтуль адзіным на 100% даказаным беларускім сьледам на Беразе Слановай Косткі застаецца паходжаньне «бацькі» зьнішчальнікаў «Су» Паўла Сухога, які нарадзіўся ў Глыбокім у 1895 г. А вось ці сядзелі беларусы за штурваламі размаляваных «пад акулаў» зьнішчальнікаў Су-25, якія расстралялі дзевяць француcкіх міратворцаў ды аднаго амэрыканца, дагэтуль невядома. Міністарка абароны Францыі Мішэль Альё-Мары ды намесьнік кіраўніка эўрапейскага камандаваньня ЗША генэрал Чарльз Ўолд сьцьвярджаюць, што так.

**Працяг на старонцы 6.**

## Свой сьвет штотыдзень

«Наша Ніва» з Новага году будзе выходзіць на 24 старонках штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Дом Паўлава» беларускіх крышнаітаў. Старонка 4.**

# Лукашэнка хваліў народ у цэлым і граміў яго па частках

Працяг са старонкі 1.

Дэпутаты з нэрвовым захапленьнем на тварах ківалі ў тэлекамэры. Атмасфэру ў Доме ўраду не назавеш прыязнай. Лідзія Ярмошына ў часе першага пасяджэньня палаты прадстаўнікоў двойчы назвала яе замест «палаты представителей» «палатой преступлений».

Яшчэ з новага: разам з забаронай усынаўленьня за мяжу, А.Лукашэнка загадаў спыніць «раз і назаўжды» арганізаваны вываз чарнобыльскіх дзяцей на аздараўленьне, бо малыя адтуль вяртаюцца заражанымі «спажывецтвам». Чарнобыльскія фонды чакаюць цяжкія часы. А дзецям годзе спадзявацца пабачыць, як жывецца простаму чалавеку і як працуе ўлада на захад ад Бугу.

Таксама ўпершыню А.Лукашэнка забіў у звон наконт наплыву імігрантаў з Усходу. Да нас «прыяжджае абы-хто», і нельга «дапусьціць зьмены ў дэмаграфічнай сытуацыі». «Гэта не нацыяналізм, але мы мусім прыняць меры».

Лукашэнка хваліў народ як цэлае за «волю і сьвядомасьць» і адначасова граміў яго па частках. Ён абрынуўся на паўп'яных сантэхнікаў, што «ператварылі ЖЭСы ў нажыву». Гандляроў ён назваў «таргашамі». Перапала дзяржаўным будаўнічым арганізацыям, якія «абурэлі» так, што «толькі прэзыдэнт можа імі кіраваць» і «ўчора мусіў накіраваць начальніка службы ахоны прэзыдэнта на адну такую будоўлю», бо такога разбою не было нават у савецкі час, «калі мы былі разбэшчаны» грашыма.

Ён абураўся платнасьцю мэдыцынскіх паслуг, не ўдакладняючы, што яна была ўведзена ім самім. Ён таксама раскрытыкаваў «кніжных эканамістаў»: рынак ня зьнізіць цэны на жытло, што падтрымліваюцца «зговарам будаўнікоў і рыэлтэраў». «Выкараніць беспрадзел з цэнамі на кватэры! За парушэньні пад суд! Толькі дзяржаўная воля можа зрабіць жытло даступным!» — заявіў А.Лукашэнка.

А.Лукашэнка адкінуў магчымасьць вяртаньня да дзяржаўнага размеркаваньня кватэраў, але даў загад зьмяніць сыстэму льготнага крэдытаваньня. «Дадатковыя меры па льготным крэдытаваньні» прымаюцца за час прэзыдэнтства А.Лукашэнкі ў пяты раз. Пры гэтым цэны на кватэры растуць, а якаснае жытло застаецца недаступным большасьці грамадзянаў.

Прэзыдэнт у чарговы раз загадаў памагчы сем'ям з тройнямі, спыніць практыку «абвесу і абшчоту» на базарах, а таксама палепшыць школьнае харчаваньне, бо быў ужо выпадак, калі «дзяўчынка ад голаду пачала спажываць свае ўнутраныя органы».

Ён абрынуўся на работнікаў прамысловасьці, дзе пануюць крадзяжы і халтура, у выніку чаго паўсюдна дачы пафарбаваныя ў колеры МАЗаў і БелАЗаў. Даў ён дыхту і дамам-інтэрнатам: толькі 20% гадаванцаў добра адаптуюцца да жыцьця. Астатнія ў першы ж год пасьля выхаду ў жыцьцё робяцца або ахвярамі, або злачынцамі.

> Лідзія Ярмошына на першым пасяджэньні палаты прадстаўнікоў двойчы назвала яе «палатой преступлений».

Прадстаўнікам дэмакратычнае апазыцыі гэтым разам дасталося найменш. А.Лукашэнка проста зноў параўнаў іх з фашысцкімі прыхвасьнямі. «Ганебны амэрыканскі Акт пра дэмакратыю мусіць быць адменены, інакш апазыцыі няма на што разьлічваць», — сказаў ён. Ён заклікаў апазыцыю да размежаваньня, прызнаньня пазытыўных дасягненьняў у жыцьці грамадзтва, асуджэньня санкцый супраць Беларусі.

Нашмат больш жорстка ён раскрытыкаваў таксама настаўнікаў, што арганізавалі сыстэму пабораў у школах, і выкладчыкаў ВНУ, якія нібыта масава зьдзіраюць грошы за добрыя адзнакі на экзамэнах, ня грэбуючы нават сэксуальнымі дамаганьнямі да студэнтак.

Ад ЛТП было запатрабавана самаакупнасьці. Бацькоў, якія кідаюць дзяцей — колькасьць такіх выпадкаў «калясальна» вырасла — будуць запраторваць на прымусовыя работы. Туды ж ён запатрабаваў выпраўляць і кліентаў выцьвярэзьнікаў. Усе гэтыя зьявы ён загадаў «вычышчаць і выпальваць калёным жалезам».

Краіна рызыкуе ператварыцца ў вялізны працоўны лягер, дзе адны, пакараныя, будуць прымусова працаваць, а другія, ахоўнікі — прымушаць іх да працы, пра ступень эфэктыўнасьці якой можна здагадацца.

Бадай, ніколі раней А.Лукашэнка не прызнаваў так адкрыта наяўнасьці жудкіх сацыяльных і маральных хваробаў у грамадзтве і таго факту, што яны імкліва прагрэсавалі дзесяць апошніх гадоў, але загадаў лячыць іх ранейшымі мэтадамі. На ягоную думку, вінавата не сыстэма, а канкрэтныя выканаўцы.

Напрыклад, міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў, якога, мусіць, чакае адстаўка. У якасьці віны яму залічаныя гібель міліцыянта і нават загад аб абавязковай язьдзе з уключанымі фарамі.

**Мікола Бугай**

# Час зьбіраць камяні

## Пачаўся збор подпісаў з патрабаваньнем пакінуць валун Пілсудзкага на Вялейшчыне

Камень Пілсудзкага («НН» №41) ужо 4 месяцы знаходзіцца на тэрыторыі раённых электрасетак у Вялейцы. Валун туды перавезьлі краязнаўцы Анатоль Рогач, які працуе начальнікам гэтага прадпрыемства, і **Яўген Петрыкевіч (на здымку)**. Яны пратэстуюць супраць вывазу помніка зь Вялейскага раёну. Пасля публікацыяў у «НН» ды «Рэгіянальнай газэце» пачаўся збор подпісаў з патрабаваньнем усталяваць камень Пілсудзкага ў раёне.

На Вялейшчыне традыцыйна шануюць рознага кшталту валуны, засьцерагальныя камяні і каменныя помнікі. На ўлік археолягамі пастаўленыя дзясяткі гранітаў і кварцаў. Сярод іх — «Верацішын крыж» каля Каменя, «камень-шавец» каля Куранца, «камяні-быкі» ля Сьцеберакаў, сярод якіх адзіны ў Беларусі камень з выявай рогу-рытона, а ў рэчышчы Вяльлі ляжыць легендарны камень «лысіна Паца». Любоў да дарункаў апошняга ледавіка праяўляецца таксама ў тым, што горад густоўна аздоблены альпійскімі горкамі. Сапраўдны шэдэўр — каменная кампазыцыя аўтарства Зьмітра Абразцова каля мэблевай фабрыкі.

Летась у Вялейцы адбылася краязнаўчая канфэрэнцыя, прысьвечаная камяням краю. У панядзелак адбылася прэзэнтацыя кнігі, падрыхтаванай па матэрыялах тае імпрэзы. Яна стала нагодай для абмеркаваньня сытуацыі з валуном Пілсудзкага з удзелам прадстаўнікоў раённай улады, што прынялі рашэньне аб перадачы памяткі польскай амбасадзе. У выніку абмеркаваньня быў прыняты зварот, у якім выказваецца заклапочанасьць вывазам помнікаў за межы раёну і зьмяшчаецца патрабаваньне пакінуць камень Пілсудзкага на гістарычным месцы. Краязнаўцы просяць таксама вярнуць каменны крыж, які стаяў ля дарогі паміж вёскамі Даўгінава і Жары. На думку навукоўцаў, гэта т.зв. паганская «каменная баба». З-пад Вялейкі яго вывезьлі ў Менск, дзе ён туліцца ў вэстыбюлі Інстытуту геалёгіі Акадэміі Навук.

Старшыня райсавету сп. Ігнатовіч адпачатку падтрымаў ініцыятывы мясцічаў, астатнія прадстаўнікі вэртыкалі занялі пазыцыю чаканьня.

**Усевалад Сьцебурака, Вялейка**



«РЭГІЯНАЛЬНАЯ ГАЗЕТА»

# Зеляўкоўская ў чорным сьпісе



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Нацыянальная кіназорка Сьвятлана Зелянкоўская трапіла ў чорны сьпіс асобаў, якіх не рэкамэндавана прапускаць у дзяржаўныя СМІ, паведамляе «Салідарнасьць». Акторка «не ўпісалася» ў дзяржаўную культурную палітыку, бо не баіцца выказваць уласную пазыцыю і падкрэсьлівае сваю любоў да беларускае мовы. Яна выступіла ў абарону зачыненага тэатру «Госьціца» і зьнялася ў незалежным кіно Андрэя Кудзіненкі «Акупацыя», якое пасьля было забаронена. «Дык ты нацыяналістка?» — спытаўся А.Лукашэнка ў С.Зелянкоўскай, якая падчас сустрэчы размаўляла зь ім па-беларуску. Яна адказала: «Лічыце як хочаце. Я нармальны чалавек».**

# Маладое кіно паміж былым і мінулым

Андрэй Расінскі

У лістападзе адбылася неабыякая падзея для беларускай культуры. Студэнты рэжысэрскага курсу Міхаіла Пташука прэзэнтавалі гледачам свае дыплёмныя працы. Пасьля трагічнай сьмерці мастака студэнтаў, што называлі свайго майстра «дзядзькам Мішам», узяў пад сваю апеку Вячаслаў Нікіфараў. Гэта толькі трэці выпуск кінарэжысэраў за ўсю гісторыю сувэрэннай Беларусі — раней кадры рыхтавала Масква. Зь незалежнасьцю Акадэмія мастацтваў запачаткавала свае курсы кінатворцаў — у свой час іх скончылі Віктар Асьлюк і Андрэй Кудзіненка.

Сёньняшнія выпускнікі Акадэміі дэманструюць роўны й прафэсійны ўзровень, што дазваляе спадзявацца на выдатную будучыню. Але тэмы й формы дыплёмных прац выклікаюць занепакоенасьць: маладыя творцы застаюцца паміж былым і мінулым і асьцярожна ўзнаўляюць ужо бачанае ў беларускім кіно.

Працяг на старонцы 14.

Д З Е   В А Р Т А   Б Ы Ц Ь

## Што вартага на «Лістападзе»?

**З 20 па 26 лістапада** ў Менску — чарговы фэстываль «Лістапад». Фаварыт фэсту — карціна «Свае» Дзьмітрыя Месхіева. Новы твор «Мой зводны брат Франкенштэйн» пра сямейныя наступствы чачэнскай вайны прадстаўляе Валер Тадароўскі.

Кіназубр Ежы Гофман прадстаўляе на «Лістападзе» «Старажытную легенду», а францускі клясык Ален Рэнэ засьвеціць лёгкай карцінаю «Толькі ня ў губы».

Аматары цукерачнага кіно могуць адвесьці душу на «Дунечцы», але галоўны далікатэс для панкаў — прэм'ера фільму «Вам заданьне» паводле сцэнару сэнатара і асабістага сябра АЛ Мікалая Чаргінца.

**Андрэй Расінскі**

## Польская музыка ў Кансэрваторыі

**24 лістапада а 19-й** у канцэртнай залі Акадэміі музыкі (пл.Свабоды) адбудзецца ўнікальны канцэрт «Музыка польскіх кампазытараў ХХ ст.». У праграме: К.Шыманоўскі, Г.Бацэвіч, А.Мікульскі ды інш.

Іншыя анонсы імпрэзаў наступнага тыдня — **старонка 13**.

## Як за Сталіна

12 лістапада апісалі маёмасьць у 75-гадовай **Леакадзіі Налецкай**, бабулі «маладафронтаўца» Аляксея Шэіна, — за штрафы ўнука апісалі рэчаў на 1 млн 125 тыс. рублёў. Цікава, што жанчына ўжо апынулася ў такой сытуацыі, калі была немаўлём. У 1933 г. яе бацькоў арыштавалі па абвінавачваньні ў «антысавецкай агітацыі», дабро сканфіскавалі, а ўсю сям'ю дэпартавалі ў Сібір. «Гэта ж трэ было дажыць да сівых валасоў, каб ізноў такое перажыць», — гаруе спн.Налецкая.

## Учынак журналіста

21-гадовы журналіст Сеньненскага раённага радыё **Алесь Пазьняк** 30 кастрычніка выйшаў у этэр зь перадачай, дзе расказаў пра Касьцюшку, Каліноўскага, слуцкіх паўстанцаў. Замест «рэпартажу з палёў» А.Пазьняк заклікаў узьняцца на барацьбу за свабоду Беларусі. Загад пра яго звальненьне з працы начальства датавала 29 кастрычніка.

## Крымінальная справа на рэдактара

На рэдактара недзяржаўнай газэты «Борисовские новости» **Анатоля Букаса** 15 лістапада пракуратура завяла крымінальную справу за паклёп: рэдактарка гарвыканкамаўскай газэты «Адзінства» Вера Пратасевіч неаднойчы ў публікацыях называла яго студэнтам-недавукам, але артыкул Букаса «Джвугнуты гарэза ўсюды пралезе, альбо Маўчаньне ягнят» палічыла абразай і паклёпам на сябе.

**АШ**

Іншыя паведамленьні з хронікі супраціву — **старонка 11**.

## Эмігранты, з прафэсійным сьвятам!

19 лістапада — сусьветны дзень эмігранта. У Беларусі на 1 лістапада гэтага году статус уцекача дадзены 735 іншаземцам. Як паведаміў намесьнік начальніка дэпартамэнту па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных справаў палкоўнік Сяргей Матус, сярод тых, хто мае статус бежанца, — 531 выхадзец з Аўганістану, 105 — з Грузіі, 28 — з Таджыкістану, 27 — з Азэрбайджану, 23 — з Эфіёпіі. З пачатку году ўцекачамі прызнаны 17 аўганцаў.

# Пэн застаецца ў краіне

## «Партрэт невядомага мужчыны» набыў за 22 000 даляраў калекцыянэр зь Беларусі

Алесь Кудрыцкі

Гэта быў адзін з тых выпадкаў, калі глядзець на залю цікавей, чым на сцэну. Тэлеапэратары натапырылі відэакамэры ў бакавых праходах, журналісты атабарыліся на галёрцы. У цэнтры залі, на ладнай адлегласьці адзін ад аднаго, пасела чалавек трыццаць аўкцыянэраў — тых, хто прыйшоў набываць, за выняткам хіба Элеаноры Язерскай, якая яшчэ ў фае адкрыта прызналася, што набываць нічога ня будзе, бо ў яе дома ўсе сьцены і так ужо завешаны.

Аўкцыённы дом «Paragis» «не пасьпеў падрыхтаваць» уласнага аўкцыяніста, таму давялося запрашаць Арсенія Лабанава з Масквы. Гэты пульхны чалавечак, у пінжаку, зашпіленым на верхні гузік, уладкаваўся на высокім зэдліку за катэдрай, агледзеў свае рабочыя прылады — драўляны малаточак, каталёг, асадку, — начапіў навушнікі зь мікрафонам ды пляснуў у шклянку крыху мінэралкі. «Фатаграфаваць? Калі дамовіцеся з арганізатарамі, тады можна. Але — без успыш-шкі!» — раскацістым барытончыкам паведаміў ён, масажуючы пальцамі крыху апухлыя павекі.

Прачытаўшы простыя правілы (падымаць таблічкі з нумарамі ды гукаць «Ап!», калі таблічку не заўважылі), аўкцыяніст пстрыкнуў пальцамі ды аб'явіў нулявы лот — майку «Дынама-Менск» з аўтографамі гульцоў. «Дынама» — ня толькі таму, што каманда-чэмпіён, але й з тае прычыны, што спонсар каманды «Siemens» дапамог грашыма і аўкцыёну. А вось дзяржпрадпрыемствы ад прапановы фундаваць аўкцыён адхрышчваюцца як чорт ад срэбнай кулі. Патрохі пачаў цікавіцца Белдзяржстрах, бо наведнікі такіх імпрэзаў — яго патэнцыйная кліентура.



**Лот 25, Падвеска. Золата, 11 брыльянтаў, 4 сапфіры, 2 гранаты. 1998 г., Расея. Пачатковая цана $ 850 000. Не прададзена.**

Аўкцыяніст пачынае з цаны ў адзін даляр і праз хвіліну збывае майку за паўсотні чалавеку ў акулярах, які сваім пінжаком паверх барвовага швэдра ды набітым скураным партфэлем дужа нагадвае шараговага чыноўніка. Ён, Яўген Ксяневіч, насамрэч бізнэсовец, які гойсае па Беларусі ды ладзіць мастацкія выставы, спрабуючы, як ён кажа, «выгадаваць кліента». Ён ужо быў на першым аўкцыёне «Paragis» ды ведае, што той, хто мае сьмеласьць перамагчы ў змаганьні за нулявы лот, атрымлівае яго бясплатна, — у падарунак.

На жаль, расьпісаная майка была адзіным лотам, які вынесьлі, каб паказаць аўдыторыі. Астатнія прэзэнтавалі ў выглядзе фота, праектаваных на экран.

### Хлапчукі ў гарнітурах

Першы сапраўдны лот. Чырвонафігурная ваза, Міжземнамор'е, 320—330 г. да н.э., пачатковая цана 4950 даляраў. Заля маўчыць. Лот зьняты. Другі лот — керамічны аскепак за 400 даляраў. Таксама зьняты. Трэці — пацеркі — зьняты. Таблічкі ўздымаюцца толькі на чацьвёртым лоце — два аматары малаазійскіх наканечнікаў для стрэлаў уступаюць у двубой, нібы хлапчукі, якія б'юцца за адшуканы скарб. Перамагае мужчына з «рымскім» носам, з даўгаватымі валасамі, якія крыху ўкрываюць вушы, у чорным гарнітуры з блакітным гальштукам. Ён вонкава стрыманы, аднак сківіцы, якія нэрвова жуюць гумку, здрадліва выдаюць запал. Наканечнікі «накруцілі» цэлую сотню ды дасталіся яму за 180 даляраў.

Манэтамі ніхто не цікавіцца — нумізматаў у залі няма. «Божа мой, які ажыятаж!» — кпіць аўкцыяніст. Але сталовае срэбра разыходзіцца добра — яшчэ адзін доўгавалосы брунэт гадоў трыццаці выйграе дзьве вазы па 300 даляраў ды нэпальскі гарбатнік за 950. Гэты лот стаўся няўдачай «Paragis» — дом аўкцыёнаў намерваўся атрымаць за срэбную пасудзіну вагой дзьве кілі найменш 3000 даляраў.

### Аматары брыльянтаў

«Наступны лот нумар 25, пачатковая цана — 850 тысяч даляраў», — нязмушана прамаўляе спадар Лабанаў ды паглядае спадылба на залю. «Дзе гэты лес узьнятых рук? Усяго 850 тысяч!» — «Беларускіх рублёў», — напаўгаласу дадае нехта ў залі. Лот зьняты. Выканаўчы дырэктар «Paragis» Людміла Конанава расчаравана ўсьміхаецца. Ролю нажыўкі-затраўкі падвеска не выканала — няма ў залі рыбіны, якая б яе праглынула. Ці водзяцца ў нашай краіне такія багатыры?

«Сяргей, дай сьпіс на хвілінку», — просіць дама зь пярсьцёнкам на правай руцэ, які пырскае праменьчыкамі ў сьвятле пражэктараў. Яна нэрвова адбівае рытм па каленцы ўказальным пальцам, які зь лёгкімі дрыжыкамі замірае ў паветры на словах «…тры, прададзена!». Сяргей набывае камплект з падвескі, завушніц ды пярсьцёнка (агулам 64 брыльянты) за 1700 даляраў, мужчынскі пярсьцёнак з сапфірам за 750 даляраў, а ягоная спадарожніца падымае таблічку са сваім нумарам на яшчэ адным брыльянтавым пярсьцёнку за 2500 даляраў. Канкурэнтаў няма.

Зь бібліяфіламі аўкцыяністу не пашанцавала — на рарытэтныя томікі ніхто не пакваліўся. Але выдатна пайшлі гадзіньнікі. Знаёмец аматаркі брыльянтавых завушніц набыў камінны (1600 даляраў) ды настольны (300 даляраў).

### Рэкорд Пэна

«Лот 49!» — гукае аўкцыяніст ды каўтае мінэралку са шклянкі. Пачатковая цана карціны Юдэля Пэна «Партрэт мужчыны» — 6 тысяч даляраў. Разам уздымаюцца чатыры карткі з нумарамі. Праз паўхвіліны спаборнічаюць толькі двое. Адзін — даўнавата няголены малады чалавек крыху нехлямяжага выгляду, у клятчастай кашулі навыпуск. Ягоны супернік — сярэдніх гадоў спадар з парадзелымі валасамі, у шэрым касьцюме на брунатнай вадалазцы, поруч зь ім — спадарожніца ў белай блузцы, якая выгодна агаляе рукі зь нехарактэрным для лістапада загарам. Нарэшце, хлопец у кашулі панікае галавой. «Дваццаць дзьве тысячы — тры… Прададзена!»

Аўкцыяніст старанна выцірае насовачкай лоб, скроні ды шчокі.

Пакупнік, пасьміхаючыся ў тонкія вусікі, выходзіць з залі, каб зарэгістраваць продаж. Крыху пазьней сыходзіць і малады чалавек у кашулі — астатнія лоты яго не цікавяць. Тэлеапэратары згортваюць абсталяваньне. На выніковай прэсканфэрэнцыі кіраўніцтва аўкцыёну пацьвердзіць — карціна Пэна застаецца ў Беларусі, праўда, не ў Нацыянальным мастацкім музэі (былі такія чуткі), а ў прыватнай калекцыі.



**Максім Багдановіч пэндзля Г.Ціхановіча пакупніка не знайшоў.**

### Прадалі Акудовіча

У гэты вечар рэкорд Пэна пабіты ня быў. Сучаснае разыходзіцца пераважна па стартавай цане — 200—250 даляраў. Вельмі, вельмі нядорага — падобныя работы ў менскіх галерэях прадаюцца па 300—400 даляраў. Гэтак, адна звычайная сямейная пара, завітаўшы надоечы на спэктакль у Тэатар беларускай драматургіі, прыгледзела ў антракце на перадаўкцыённай выставе ў фае карціну і выгадна прыдбала яе падчас таргоў.



**Бронзавага смаўжа працы Віктара Копача за 450 даляраў набыў мужчына ў замшавым пінжаку, які скупіў таксама калекцыю сучаснага фота.**

Карціну Стальмашонка-старэйшага «Маякоўскі ў Беларусі» (1956 г.) набываюць за 200 даляраў. Максім Багдановіч пэндзля Г.Ціхановіча кліента не знаходзіць. А вось партрэт Валянціна Акудовіча працы Юрася Барысевіча (агромністы адбітак пальца, дзе малюнак утвараецца словамі «Мяне няма» на розных мовах) жвавенька ідзе з малатка за 300 даляраў.

Голены налыса мужчына ў скураным замшавым пінжаку з ланцужком на шыі (на выгляд — стандартны «новы беларус») праяўляе нядрэнны густ. Акрамя амаль тузіна палотнаў, ён практычна цалкам скупляе сэкцыю сучаснага фота — чатыры фотаэкспэрымэнты Андрэя Шчукіна па 150 даляраў кожны, а на дэсэрт — бронзавага смаўжа працы Віктара Копача (450 даляраў). Зь ім час ад часу спаборнічае маладзён мэтры пад два ростам з валасамі, сабранымі ў хвосьцік ды мэліраванымі ў белы колер. Кожны зь іх набраў работ сучасных мастакоў тысячы на паўтары-дзьве. Спадар з блакітным гальштукам (паляўнічы на наканечнікі) таксама набывае некалькі карцін ды сэрыю паштовых марак з сэкцыі філятэліі, агулам даляраў на 600. Потым, у кулюарах, ён будзе з прыхільнасьцю («досыць падобна да сапраўднасьці») выказвацца наконт дакумэнтальнага фільму пра падпольных калекцыянэраў, які паказалі па НТВ. «А што да прагі да карцін, дык гэта цалкам асабістае ўспрыманьне. Неяк я ўбачыў у гатэлі прыгожую работу, дастаў наяўныя з кішэні ды набыў яе», — кажа ён, папраўляючы гальштук тонкімі пальцамі з залатым пярсьцёнкам-пячаткай.

### Аўкцыён «Paragis» у лічбах

Білет на аўкцыён каштуе 25 тыс. рублёў.

Каб атрымаць картку з нумарам, трэба здаць у заклад 40 тыс. рублёў (пасьля аўкцыёну грошы вяртаюць).

Каталёг работ — 22 тысячы рублёў.

Аўкцыён доўжыўся 1 гадзіну 40 хвілін. Прадалі 62 лоты з 280, ці 22% — нармальны паказчык для аўкцыёну.

Уладальнік лоту атрымлівае 80% ад ацэначнага кошту і 60% ад сумы, якая яе перавышае. Калі лот здымаецца — анічога.

Стандартны час на таргі па адным лоце — ад 40 сэкундаў да хвіліны.

Аўкцыяніст атрымлівае 10% ад розьніцы паміж ацэначнай цаной ды цаной продажу.

На пакупкі, даражэйшыя за 5 тыс. даляраў, трэба прад'яўляць дэкларацыю аб прыбытках. Выйсьце — хадзіць на аўкцыён сем'ямі.



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

### Не пытаючыся ў Лукашэнкі

Эўракамісія будзе ажыцьцяўляць супрацу зь недзяржаўнымі арганізацыямі Беларусі ў рамках Эўрапейскай ініцыятывы за правы чалавека й дэмакратыі без узгадненьня зь менскім урадам. Раней дапамога Беларусі выдзялялася толькі праз праграму TACIC, статут якой вымагаў узгадненьня зь беларускімі ўладамі. Новае рашэньне стварае юрыдычную базу для падтрымкі дэмакратычнага руху ў Беларусі. У ЭЗ падкрэсьліваюць, што яно прынятае ў адказ на антыэўрапейскую рыторыку й парушэньні правоў чалавека ў Беларусі.

### Зьнішчаны наклад газэты

Наклад ваўкавыскай «Местной газеты» (3,5 тыс. асобнікаў), якая мусіла аднавіць выхад 17 лістапада, без тлумачэньняў зьнішчаны ў друкарні «Плутас-Маркет». У нумары была хроніка 20-дзённай галадоўкі рэдактара газэты Андрэя Шантаровіча.

### 370 тысяч на пахаваньне

Столькі атрымаюць сем'і гастарбайтараў зь Петрыкаўшчыны, што згарэлі пры пажары ў Падмаскоўі. Самаму маладому зь іх было 22 гады.

### Прэмія Робэртсану

Былы кіраўнік NATO Джордж Робэртсан уганараваны чэскай Прэміяй імя Ганны Эленбоген. Летась гэтую прэмію атрымаў экс-прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Гавал і перадаў яе «Нашай Ніве».

### Гадавыя візы ў Польшчу

Польшча ўвяла шматразовую гадавую візу коштам $30 для грамадзянаў Беларусі й Расеі. Яе змогуць атрымаць тыя, хто рэгулярна езьдзіць у Польшчу ў справах эканомікі, культуры, спорту, тыя, хто мае права на нерухомасьць у Польшчы ці на атрыманьне спадчыны, а таксама тыя, хто хоча наведваць мясьціны свайго нараджэньня ці пахаваньня сваякоў.

### Клічкі за Юшчанку

Кандыдатуру Віктара Юшчанкі ва Ўкраіне падтрымалі пераможца «Эўрабачаньня» сьпявачка Руслана, чэмпіён сьвету па шахматах Руслан Панамароў, браты-баксэры Віталь і Ўладзімер Клічкі. У звароце Клічкоў гаворыцца, што 21 лістапада ня проста дзень выбараў прэзыдэнта: «Гэта Дзень, да якога наш народ ішоў тысячу гадоў».

### Дакумэнты славацкага ГБ

Славацкі Інстытут нацыянальнай памяці зьмясьціў на сваёй інтэрнэтстаронцы дакумэнты з архіву камуністычнай Службы бясьпекі (СБ) — больш за 20 тыс. старонак з пратаколамі допытаў, даносамі, сьпісамі ахвяраў і функцыянэраў СБ.

### Кантрацэптывы для кенгуру

Сыднэйскі ўнівэрсытэт атрымаў грант $1,1 млн, каб дасьледаваць уплыў кантрацэптываў на кенгуру й каалаў. У Аўстраліі сёньня 57 млн кенгуру, якія даводзяць папасы да стану пустэльні, і блізу 100 тыс. каалаў, якія выядаюць лясы. Супраць іх адстрэлу выступаюць абаронцы жывёлаў, таму ўрад шукае іншыя шляхі.

**АШ; БелаПАН, svaboda.org**

Папярэдне анансаванае на 13 лістапада адкрыцьцё помніка на магіле Вацлава Іваноўскага перанесенае на 20 лістапада. Пачатак — а 13-й.

# Павал Севярынец: «Адрадзіць Адраджэньне»

## Стваральнікі Хрысьціянска-дэмакратычнай партыі не зьбіраюцца прыстасоўвацца да грамадзтва, яны хочуць яго абуджаць

**«НН»: Вы плянуеце яднаць людзей на грунце хрысьціянскай ідэі. Ці не нясе яна адначасова зернейка разьяднаньня паводле веравызнаньня, канфэсіі ці ўвогуле прынцыпу «веру — ня веру»?**

**Павал Севярынец:** Хрысьціянская ідэя, ідэя веры — гэта ідэя яднаньня, супольная для ўсіх канфэсій. Мы ствараем неканфэсійную палітычную партыю, мэта якой — аб'яднаць хрысьціянаў на грунце беларускасьці. Паводле статыстыкі, крыху больш за 50% беларусаў — вернікі, дый тое многія зь іх верачь толькі ў гараскопы. Але мы лічым, што адраджэньне нацыянальнай ідэі мусіць адбывацца ў гэтым напрамку. Гэта ідэя не для 100 адсоткаў грамадзтва, гэта — ідэя абуджэньня.

**«НН»: У якой частцы палітычнага спэктру разьмесьціцца ХДП?**

**ПС:** Мы — правацэнтрысцкая партыя. То бок калі параўноўваць з КХП-БНФ, дык мы значна бліжэйшыя да цэнтру. Для нас больш важны сацыяльны балянс, а не традыцыя, што розьніць нас ад кансэрватыўных партый. Наша дактрына — раўнавага паміж традыцыяй ды патрэбамі сучаснасьці. У якасьці аналягу можна ўзяць Рэспубліканскую партыю ў ЗША ці ХДС у Нямеччыне. Я лічу, што да стварэньня ў Беларусі палітычнай сыстэмы амэрыканскага ці нямецкага кшталту варта імкнуцца. Раздробленасьць партый перашкаджае весьці краіну наперад.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

> Моладзь мае нашмат больш каштоўнасны, а не прагматычны сьветапогляд, у адрозьненьне ад пакаленьня, якое цяпер кіруе апазыцыйнымі партыямі.

**«НН»: Ці Вы яшчэ верыце ў магчымасьць палітычнага змаганьня праз выбары?**

**ПС:** Партыя, хутчэй, ствараецца для таго, каб зьмяніць грамадзтва. Выбары могуць быць выкарыстаныя намі толькі як нагода, мы будзем стварацць умовы для таго, каб выбары некалі зрабіліся такімі, каб у іх варта было ўдзельнічаць. ХДП — гэта масавая партыя. Яе стварэньне — ня спроба заняць нішу, наша галоўная ідэя — адрадзіць масавы рух Адраджэньня (прабачце за таўталёгію), які існаваў у Беларусі пры канцы 80-х і быў грунтам для стварэньня БНФ.

**«НН»: Якімі будуць наступныя крокі?**

**ПС:** Будзе шэраг паездак па рэгіёнах, будуць сур'ёзныя праекты — не хачу забягаць наперад, пра іх мы паведамім у сярэдзіне сьнежня. Пачнём разгортваньне масавай працы. Найперш — сярод людзей, якія вераць у Бога, потым — сярод нявеpуючых. Людзі ня бачаць сілы, якая б магла іх гуртаваць, таму наша мэта — новыя сябры, а не перараЗьмеркаваньне партыйных рэсурсаў, што ўжо існуюць. Мы будзем зьвяртацца да новых пластоў — хрысьціянаў, моладзі, прадпрымальнікаў, да ўсіх актыўных людзей.

**«НН»: За Вамі замацаваўся імідж моладзевага палітыка. Ці ня будзе ён Вам перашкаджаць?**

**ПС:** Пакуль што моладзевасьць лічылася перавагай. Беларусі патрэбна новая палітыка і новыя палітыкі. Большасьць людзей, якія працуюць над стварэньнем ХДП, — маладыя. Гэта ня значыць, што «Малады фронт» плаўна перацячэ ў новую партыю, ён будзе існаваць і надалей. Дый сама партыя ня будзе выключна партыяй маладых. Аднак моладзь мае нашмат больш каштоўнасны, а не прагматычны сьветапогляд, у адрозьненьне ад пакаленьня, якое цяпер кіруе апазыцыйнымі партыямі. ХДП — гэта натуральны праект для маладога пакаленьня.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

КАМЭНТАР

### Партыя ці рух?

Самым складаным момантам многім здаецца рэгістрацыя ХДП. Не пагаджуся. Народнага Фронту доўгі час не рэгістравалі, і тая пара была зорнаю для арганізацыі. Галоўнае пытаньне не ў рэгістрацыі, а ў стварэньні сапраўды масавае партыі. Другая пастка на шляху стварэньня ХДП — шырыня яе базы. Няма сумневу, што ў партыю лёгка прыцягнуць пратэстантаў, уніятаў ці вернікаў Аўтакефальнае праваслаўнае царквы. Аднак хрысьціянска-дэмакратычны рух можа быць шырокім толькі пры ўдзеле праваслаўных БПЦ і каталікоў. І тут загваздка: што гэта мусіць быць за рух, каб яны далучыліся, і ці ўвогуле такі рух магчымы? Пакінуўшы засьцярогі што да станоўчага адказу на другое пытаньне, вылучу адну вэрсію: у сёньняшніх умовах гэта мусіць быць непалітычны рух, які б ставіў перадусім маральныя і культурныя — прытым выразныя і бескампрамісныя — мэты. Але партыя ня можа быць непалітычнаю. Вяртаючыся да Народнага Фронту — ён быў найбольш масавым і ўплывовым у час, калі ня быў партыяй. Тады, праўда, у грамадзкім паветры лёталі зусім іншыя флюіды. Справе, задуманай Паўлам Севярынцам і Аляксеем Шэіным, не гарантаваны посьпех. Іхная дэмакратычная партыя можа аказацца масаваю роўна нагэтулькі, як нацыянальна-кансэрватыўная КХП-БНФ.

**Барыс Тумар**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# «Дом Паўлава» беларускіх крышнаітаў

Менская суполка Міжнароднага таварыства сьвядомасьці Крышны не прайшла перарэгістрацыі. Фармальнай прычынай адмовы стала адсутнасьць дакумэнтаў, якія тычацца юрыдычнага адрасу. Аднак самі крышнаіты лічаць, што сталіся ахвярамі рэлігійнае дыскрымінацыі.

Менская суполка крышнаітаў ужо 12 год месьціцца ў будынку па вуліцы Паўлава, 11, які належыць прыватным асобам. Там жа ўвесь гэты час знаходзіўся юрыдычны адрас рэлігійнай арганізацыі. Аднак, калі згодна з новым законам «Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях» менскія крышнаіты распачалі працэдуру перарэгістрацыі, адміністрацыя Цэнтральнага раёну і Менскі гарвыканкам не дазволілі зарэгістраваць юрыдычны адрас па ранейшым месцы. У выніку рэлігійнай арганізацыі не перарэгістравалі. Адмову за подпісам мэра Міхаіла Паўлава крышнаіты атрымалі ў мінулую пятніцу.

Сябар менскай суполкі Міжнароднага таварыства сьвядомасьці Крышны Ш'ямарупа дас, а ў сьвеце Сяргей Малахоўскі, які адказвае ў арганізацыі за сувязь з грамадзкасьцю, лічыць, што ўлады любымі шляхамі хочуць ліквідаваць адзіны ў Беларусі храм Крышны. «У Беларусі пануе праваслаўе, і гэта нават у заканадаўстве прапісана, — гаворыць Ш'ямарупа дас. — А з усімі нетрадыцыйнымі рэлігіямі вядзецца барацьба. Пра нас пішуць хлусьню ў падручніках, зрываюць нам правядзеньне сьвятаў і рэлігійных абрадаў».

Менская суполка Міжнароднага таварыства сьвядомасьці Крышны налічвае каля тысячы прыхільнікаў. Штодзень служба ў храме зьбірае ад 50 да 200 вернікаў (**на фота**), сярод якіх прадстаўнікі дыпмісій краін, дзе спавядаюць індуізм.

**Юлія Дарашкевіч**

# Ды-джэі зьмянілі тактыку

**Вячаслава Бандарэнку з «Альфа-радыё» змусілі прынесьці прабачэньні за патрабаваньне, каб удзельнікі «Штурму» гаварылі па-расейску.**

Моладзевая ініцыятыва «Вока» падвяла першыя прамежкавыя вынікі двухтыднёвага штурму радыёстанцый «Альфа» ды «Пілёт-FM». За два тыдні ўдзельнікі штурму літаральна абарвалі тэлефоны гэтых радыёстанцый, аднак вынікі аказаліся больш чым сьціплыя. На «Пілёт-FM» за пяць дзён паставілі толькі тры (!) беларускія песьні: два разы «Абсэнт» з «Крамбамбулі» ды песьню «Сьпявай са мной» беларускага канкурсанта на дзіцячым Эўрабачаньні-2004 Ягора Ваўчка. Галоўны вынік штурму «Альфа-радыё» — прабачэньне, якое ды-джэй гэтай радыёстанцыі **Вячаслаў Бандарэнка (на здымку)** папрасіў ва ўдзельнікаў штурму за свае нядобрыя словы, якія ён сказаў па-за этэрам 1—3 лістапада. Трэба адзначыць, што ён асабіста зьвяўся 11 лістапада ў сядзібу ТБМ, дзе адбывалася пасяджэньне фан-клюбу беларускай музыкі. На жаль, выпадак Бандарэнкі — прыемнае выключэньне. Навучаныя чужым вопытам, ды-джэі іншых станцый зьмянілі тактыку паводзін у эфіры з удзельнікамі акцыі. Цяпер яны вельмі ветліва адказваюць на званкі, просяць пачакаць, але ў выніку проста разрываецца сувязь. Паводле слоў каардынатара моладзевай ініцыятывы «Вока» Віталя Дабранача, дзясяткі людзей па некалькі разоў спрабавалі замовіць беларускамоўную песьню на «Пілёт-FM», ды ўсё безвынікова. Сродак супраць ды-джэй-апартэіду пакуль ня знойдзены, але штурм працягваецца. З 15 лістапада ўдзельнікі акцыі штурмуюць радыё «Рокс». Апроч таго, працягваецца таксама штурм «Новага радыё», асноўная мэта якога — вяртаньне беларускага фармату гэтай станцыі.

**Алесь Трафіменка**

Актуальную інфармацыю пра ход і вынікі штурму знойдзеш на сайце «Вока»: www.voka.tk



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Заява ды-джэя «Альфы»

«Шаноўнае спадарства!

Я, Вячаслаў Бандарэнка, ды-джэй «Альфа-радыё», музыка і пісьменьнік, жадаю публічна папрасіць перад Вамі прабачэньне за сваю рэакцыю на Вашы тэлефанаваньні ў праграму па заяўках 1—3 лістапада 2004 г. Калі можаце, прабачце мне за мае недастойныя паводзіны і выказваньні, якія я дапусьціў у Ваш адрас.

Можна было б спасылацца на мноства прычынаў, якія змусілі мяне зрабіць акурат так, але ж нешта не жадаецца. Магу толькі сказаць, што з 1 лістапада я адчуваю сябе вельмі блага і фізічна, і духоўна. Свае паводзіны я знаходжу недаравальнымі, і гэта асабліва сумна, калі ўлічыць тое, што я паважаю і падзяляю Вашыя погляды на сучасны стан беларускай музыкі і беларускай мовы. Я не беларус, але практычна ўсе мае сябры — беларусы. Тым горш я сябе адчуваю. Бо, выказваючыся супраць таго, каб беларуская мова гучала ў эфіры «Альфа-радые», я нанёс зьнявагу ўсім беларусам.

Яшчэ раз прашу, знаёмыя і незнаёмыя, усе, хто тэлефанаваў мне і ўсе, хто не тэлефанаваў — ПРАБАЧЦЕ МНЕ і, калі можна, не выкрэсьлівайце мяне з свайго жыцьця.

**Вячаслаў Бандарэнка,**
7 лістапада 2004 г., 16.24, Менск»

# Другая душа Эўропы

Алесь Трафіменка

**Эўропа пасьпяхова адмаўляецца ад сваіх рэлігійных каранёў, але наіўна было б чакаць гэтага ад шматмільённай мусульманскай супольнасьці, якая за апошнія дзесяцігодзьдзі паўстала ў Заходняй Эўропе. Забойства рэжысэра Тэа ван Гога прымусіла эўрапейцаў зьвярнуць увагу на праблему, якая доўга ігнаравалася.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Гісторыя беларускіх татараў магла б быць прыкладам пасьпяховай інтэграцыі мусульман у пераважна хрысьціянскае грамадзтва.**

Сьмерць рэжысэра Тэа ван Гога, забітага 2 лістапада ў Амстэрдаме мусульманскім экстрэмістам, ускалыхнула ўсю краіну. На наступны дзень паліцыя затрымала Мухамада Б., забойцу рэжысэра, а ў мэдыях зьявіліся зьвесткі пра яго прыналежнасьць да радыкальных ісламскіх груповак. Чарговым крокам паліцыі было затрыманьне васьмі зьвязаных зь ім імігрантаў, падазраваных у тэрарызьме. Па ўсёй краіне пракацілася хваля нападаў на мусульманскія школы і мячэты. У адказ запалалі некалькі цэркваў. У гэтай сувязі загаварылі пра рэлігійную вайну ў Галяндыі, а самі галяндцы сталі перад дылемай: з аднаго боку — страх перад тэрарызмам, з другога — даўнія традыцыі талерантнасьці і асабістых свабод у іх краіне.

Прычынай забойства ван Гога стаў яго фільм «Submission» («Падпарадкаваньне») пра дыскрымінацыю жанчын у мусульманскім грамадзтве. Улетку паказ фільму па галяндзкім тэлебачаньні сустрэўся з моцнай крытыкай мусульманскай супольнасьці ў Галяндыі. Напружаньня дадаў яшчэ той факт, што фільм паўстаў пры супрацоўніцтве з Аджаан Гірсі Алі, якую ў мусульманскіх асяродках лічаць здрадніцай. Гэтая жанчына дзяўчынкай уцякла з Самалі перад шлюбам, які арганізавала ёй сям'я. Цяпер у галяндзкім парлямэнце яна змагаецца, сярод іншага, з такімі звычаямі, як абразаньне дзяўчынак, што пануе ў некаторых мусульманскіх краінах. Яна публічна адраклася ад сваёй ранейшай веры і пастаянна крытыкуе імігрантаў за тое, што яны вельмі павольна асымілююцца. Але прыклад Аджаан — хутчэй, выключэньне з правілаў. У 16-мільённай Галяндыі жыве амаль мільён мусульман, якія захоўваюць свае традыцыі і раўніва сьцерагуць сваю веру.

У Нарвэгіі з насельніцтвам у 4,4 млн мусульман 70 тыс. Калі адна з нарвэскіх міністарак выказалася пра патрэбу «мадэрнізацыі» ісламу, гэта выклікала моцнае абурэньне сярод тамтэйшых мусульман, якіх, дарэчы, падтрымаў таксама лютэранскі біскуп Осла. Міністарка востра выступіла супраць шлюбаў пад прымусам, якія арганізоўваюць сем'і дзяўчынак, заявіла таксама, што трэба спрасьціць працэдуры разводу для мусульманскіх жанчын. Вінаватымі ў палітыцы ізаляцыі мусульман у Нарвэгіі яна назвала імамаў, якія зьяўляюцца ахоўнікамі кансэрватызму. Паводле слоў міністра, ня могуць яны прызвычаіцца, што жывуць у краіне, дзе іх рэлігія ніколі ня будзе дамінаваць. Гэтае сьцверджаньне, аднак, ужо не зусім адпавядае агульнаэўрапейскай сытуацыі.

У Парыжы можна пачуць такі жарт: «Як называецца адзіная арабская краіна, дзе няма нафты?» — «Францыя». Ужо сёньня ў Францыі жывуць 6 млн мусульман, а на поўдні краіны ў некаторых месцах выхадцы з арабскіх краін колькасна пераважаюць над карэннымі жыхарамі. У адным з найбольшых гарадоў Нямеччыны — Гамбургу — колькасьць мусульман ужо перавысіла колькасьць карэнных немцаў. Пасьля 40 гадоў іміграцыі замежнікаў, якія жывуць у краіне (некаторыя ўжо ў трэцім пакаленьні), стала некалькі мільёнаў. Прычым колькасьць іх пастаянна расьце. Калі сярод нямецкага насельніцтва канстатуецца моцны дэмаграфічны крызіс, 5—8 дзяцей у турэцкай сям'і — гэта нармальная зьява. Амаль у кожным нямецкім горадзе ёсьць свая «маленькая Анкара», дзе ўсё турэцкае: тэлебачаньне, прэса і маральны кодэкс. Можна пражыць жыцьцё ў такім гета і ня вывучыць нямецкай мовы. Амаль 40% турэцкіх дзяцей, якія ідуць у першую клясу, ня ведаюць нямецкай мовы, а кожнае трэцяе ня ў стане скончыць пачатковую школу. Адпаведныя і вынікі. Калі ў 1973 г. працавалі 91% імігрантаў, дык цяпер — толькі 29%. Сацыяльныя праблемы спрычыняюцца да таго, што сярод мусульманскага насельніцтва адбываецца радыкалізацыя поглядаў. 57% апытаных нямецкіх туркаў да 21 году лічаць, што

> За 10 месяцаў гэтага году ў Маскве 20 тыс. чалавек прынялі іслам. Прычым 60% нованавернутых — расейцы па нацыянальнасьці.

«турэцкасьць — гэта наша цела, наша душа — гэта іслам. Цела без душы — гэта труп», а 41% гатовы ўжыць сілу супраць «няверных». У сфэры каштоўнасьцяў эўрапейскія туркі таксама знаходзяць апору ў сваёй рэлігіі. Эўрапейскія каштоўнасьці часта застаюцца для іх незразумелымі і чужымі.

Эўропа пасьпяхова адмаўляецца ад сваіх рэлігійных каранёў, але наіўна было б чакаць гэтага ад шматмільённай мусульманскай супольнасьці, якая за апошнія дзесяцігодзьдзі паўстала ў Заходняй Эўропе. Што б ні гаварылі сучасныя лібэральныя палітыкі, карані эўрапейскай цывілізацыі, і ў першую чаргу яе маральных каштоўнасьцяў, знаходзяцца ў хрысьціянстве. Можна паздымаць крыжы і ня згадваць Бога ў Канстытуцыі, але для выхадцаў з мусульманскіх краін Эўропа ўсё роўна застаецца хрысьціянскай. Ня можа мусульманін прыняць эўрапейскія каштоўнасьці, бо гэта часта супярэчыць ягонай рэлігіі, тым больш тыя сучасныя дасягненьні ў галіне талерантнасьці і грамадзкіх свабод, якія супярэчаць нават хрысьціянству. Іслам зьяўляецца для мусульман ня толькі рэлігіяй. Уся іх культура, сыстэма каштоўнасьцяў і тоеснасьць грунтуюцца на ім, таму ўсё, што супярэчыць іх веры, лічыцца небясьпечным для самога існаваньня народу і ўсёй ісламскай цывілізацыі. Гэтае сутыкненьне паміж ісламам і эўрапейскасьцю лягічна прыводзіць да вынікаў, калі мусульманская супольнасьць усё больш ізалюецца і радыкалізуецца, а сярод эўрапейцаў расьце нэгатыўнае стаўленьне да імігрантаў. Так, напрыклад, ажно 71% немцаў лічаць, што трэба абмежаваць правы чужынцаў, якія жывуць у іх краіне, а ў Галяндыі пасьля забойства ван Гога 40% апытаных ня хочуць, каб мусульмане адчувалі сябе ў іх краіне як дома. Гэты Гордзіеў вузел ня вырашыць і наданьне імігрантам грамадзянства, бо гэта зусім не азначае аўтаматычнай інтэграцыі ў грамадзтва. Забойца ван Гога, дарэчы, меў падвойнае грамадзянства — мараканскае і галяндзкае.

Паралельна з сэкулярызацыяй эўрапейскага грамадзтва адчувальнымі робяцца працэсы ісламізацыі Эўропы. У той час калі хрысьціянскія цэрквы пустуюць ці перарабляюцца ў жылыя дамы ды бары, у мэдрэсэ кіпіць жыцьцё. Сёньня толькі ў Нямеччыне жыве 3,25 млн прыхільнікаў ісламу, улічваючы 20 тыс. навернутых немцаў, ужо дзейнічае 70 мячэтаў, да таго яшчэ 2 тыс. малітоўных дамоў. На працягу апошніх чатырох гадоў зьявілася 40 новых мячэтаў, у плянах было яшчэ 32, але пасьля 11 верасьня іх будаўніцтва было спынена.

Іслам уваходзіць таксама ў школы. У Нямеччыне прыватны спонсар даў 3,4 млн. эўра на адкрыцьцё першай у гэтай краіне Ісламскай акадэміі. У Гішпаніі ўрад разглядае магчымасьць уводу ў школах урокаў пра Кур'ан, каб наблізіць вучняў да мусульманскай культуры. На тэрыторыі Эўрапейскага Зьвязу ўжо жывуць 15 млн. мусульман. Выглядае, што ў сучаснай Эўропе мусульмане складаюць ці не адзіную рэлігійную супольнасьць з рэальнай унутранай сілай.

Эўрапейская сэкулярызацыя знайшла прыдатную глебу таксама на посткамуністычнай прасторы. Прыняцьце эўрапейскіх каштоўнасьцяў у краінах былога сацыялістычнага лягеру адбываецца вельмі павольна, затое хутка праявіліся рысы спажывецкага грамадзтва. Сучаснае хрысьціянства не змагло дый па розных прычынах ня можа супрацьстаяць гэтым тэндэнцыям сэкулярызацыі. Падобна як у Эўропе, у Расеі іслам таксама мае больш унутранай сілы, таму можна гаварыць пра тое, што адбываецца сапраўдная ісламізацыя расейскага грамадзтва.

Паводле паведамленьня Рады муфціяў Расеі, са студзеня да кастрычніка гэтага году толькі ў Маскве каля 20 тыс. чалавек прынялі іслам. За аналягічны пэрыяд мінулага году іслам прынялі 15300 масквічоў, а ў 2002 г. — 12450. Прычым 60% нованавернутых — гэта расейцы па нацыянальнасьці, якія раней не вызнавалі ніякай рэлігіі. 75% зь іх — гэта маладыя дзяўчаты ва ўзросьце ад 17 да 21 году. У ісламе іх прываблівае альтэрнатыва таму п'янству і распусьце, якую яны назіраюць між сваіх суайчыньнікаў. У Расеі жывуць 23 млн мусульман, што складае 15% насельніцтва краіны. У Маскве іх жыве каля 2 мільёнаў чалавек.

На фоне бурнага разьвіцьця мусульманскіх супольнасьцяў у Заходняй Эўропе і Расеі жыцьцё беларускіх мусульман амаль не заўважнае. Тым ня менш, агульнаэўрапейскія працэсы не абмінаюць і Беларусь. На сёньня ў нашай краіне зарэгістравана 20 мусульманскіх суполак. Апроч традыцыйна прысутных на беларускіх землях татараў зьявіліся таксама выхадцы з Цэнтральнай Азіі ды Каўказу. Гісторыя беларускіх татараў магла б быць прыкладам пасьпяховай інтэграцыі мусульман у пераважна хрысьціянскае грамадзтва. Мусульмане на Беларусі асяліліся ў XV ст. за часамі Вітаўта Вялікага. У часы ВКЛ яны атрымлівалі шляхецкія годнасьці, бралі сабе беларускія прозьвішчы, беларуская мова зрабілася для іх роднай. Іх нашчадкі дагэтуль захавалі веру продкаў і адметную культуру. Аднак мусульмане ў Беларусі заўсёды пачуваліся меншасьцю, якая лічыць за абавязак і гонар шанаваць традыцыі большасьці. У сучаснай Эўропе мусульмане — ужо калі і ня большасьць, дык вельмі моцная і зьнітаваная ісламам супольнасьць, якая пачынае прэтэндаваць на адмысловую ролю ў грамадзтве.

> Амаль у кожным нямецкім горадзе ёсьць свая «маленькая Анкара». Можна пражыць жыцьцё ў такім гета і ня вывучыць нямецкай мовы.

Эўропе з пункту гледжаньня пэрспэктыў сусьветнага ісламу заўсёды адводзілася асаблівае месца. Гістарычна менавіта на Эўропу быў накіраваны асноўны вэктар экспансіі мусульманскай цывілізацыі. Тое, што не ўдалося зрабіць арміям Амэядаў у VII ст., Тамэрлану ў XIV ст., а асманам у XVII ст., эўрапейцы зрабілі самі ў XX ст. Новае стагодзьдзе пакажа, ці ня будзе змушана хрысьціянская меншасьць інтэгравацца ў мусульманскае грамадзтва. Тады прыклады інтэграцыі прыйдзецца шукаць ужо не ў Беларусі, а ў краінах Блізкага Ўсходу, дзе хрысьціяне стагодзьдзямі былі ў меншасьці.

# Кроў, шакаляд, самалёты

Працяг са старонкі 1.

Міністэрства абароны Кот-д'Івуару пераконвае, што налёт зьдзейсьнілі івуарыйскія пілёты, а беларусы-мэханікі толькі абслугоўвалі самалёты. А МЗС Беларусі паведамляе, што грамадзян краіны па дзяржаўнай лініі ў Кот-д'Івуары ўвогуле няма.

«Як жа няма, калі ёсьць у мяне дакумэнты — у мяне ў партфэлі ляжаць: міжурадавае пагадненьне паміж Рэспублікай Беларусяй і Кот-д'Івуарам аб вайсковай узаемадапамозе ў пляне абслугоўваньня тэхнікі…» — абурыўся ў эфіры радыё «Свабода» камандзір брыгады з 15 авіятараў (сярод іх чатыры беларусы), седзячы ў аэрапорце сталіцы краіны Абіджане пад прыцэламі расейскамоўных жаўнераў францускага Замежнага легіёну (ці не было й сярод іх нашых суайчыньнікаў?). Праз тыдзень авіятараў вызваляюць, пра што паведамляе нават МЗС Расеі, пакуль наша МЗС працягвае «правяраць зьвесткі».

Калі ня толькі ЗША, але й краіны Эўразьвязу адна за другой шчыльней займаліся «беларускім пытаньнем», Францыя трымалася крыху ўбаку. Цяпер і ёй Беларусь наступіла на мазоль. Ублытанасьць беларускіх вайскоўцаў у канфлікт у Кот-д'Івуары пагоршыць адносіны з Францыяй.

Толькі ў аўторак МЗС Беларусі прызнала, што сярод пятнаццаці авіятараў, затрыманых Замежным легіёнам, чацьвёра сапраўды маюць беларускае грамадзянства. Між тым, клішэ «беларускія найміты» ўжо замацавалася ў францускай прэсе.

**Алесь Кудрыцкі**




АРЦЕМ ЛЯВА

Эканоміка адной з самых багатых (у мінулым) краінаў Заходняй Афрыкі — Кот-д'Івуару ўжо шмат гадоў моцна залежыць ад сусьветных цэн на какаву ды каву. Гэтая афрыканская краіна зьяўляецца галоўным вытворцам какавы на плянэце (41% сусьветнай вытворчасьці) і ўваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых вытворцаў кавы. Унікальны клімат дазваляе зьбіраць два ўраджаі какавы на год. У 15-мільённым Кот-д'Івуары 800 тысяч чалавек задзейнічаны ў «какававай» галіне. Праўда, многія з работнікаў плянтацый ня маюць івуарыйскага грамадзянства, а міжнародныя СМІ сьцьвярджаюць, што 90% какавы вырабляецца з выкарыстаньнем працы дзяцей-нявольнікаў.

Мігранты, якія дзесяцігодзьдзямі працавалі на плянтацыях, запатрабавалі сабе права голасу ў палітычным жыцьці краіны. Праблемы пачаліся пры канцы 90-х, калі ўзьнік канфлікт паміж багатымі жыхарамі поўдня краіны, пераважна хрысьціянамі, і беднымі сэзоннымі работнікамі — мусульманамі з народу малінке, якія паходзяць з поўначы Кот-Д'Івуару і суседніх Буркіна-Фасо й Малі. У сьнежні 1999 г. адбыўся першы ў гісторыі гэтай краіны ўзброены пераварот, а ў верасьні 2002 г. выбухнула грамадзянская вайна.

Кот-д'Івуар выпрабляе 500—1000 тыс. т какавы штогод. Аднак цэны на бабы какавы ды вырабленыя зь іх прадукты несувымерныя. 10 кг бабоў какавы каштуюць 75 цэнтаў, у той час як, напрыклад, стограмовая плітка шакаляду вытворчасьці менскай фабрыкі «Камунарка» каштуе каля 50 цэнтаў (1200 руб.). Вайна, што з новай сілай выбухнула ў Кот-д'Івуары, можа спрычыніцца да павышэньня сусьветных цэн на какаву. Калі вайна разгарыцца, калядныя наборы цукерак могуць значна падаражэць.

**Алесь Трафіменка**




# Можа, Польшчы не існуе?

Сярод абавязкаў прэзыдэнта — віншаваць кіраўнікоў розных дзяржаў з нацыянальнымі сьвятамі. Так, цягам апошніх месяцаў кіраўніком беларускае дзяржавы былі павіншаваныя лідэры Туркмэністану і Францыі, Арменіі і Мальты ды інш. А вось 11 лістапада нацыянальнае сьвята Польшчы — Дзень незалежнасьці — было, як і летась, абмінута. Як і нацыянальнае сьвята Чэхіі 28 кастрычніка — Дзень утварэньня Чэхаславаччыны.

Эўрапейскія краіны, якія найбольш актыўна пратэстуюць супраць парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, ігнаруюцца.

Не атрымаў 15 лістапада Аляксандар Квасьнеўскі і віншаваньня з 50-годзьдзем. Хоць на мінулым тыдні віншаваньні з днямі нараджэньня атрымалі: з 60-годзьдзем — прэзыдэнт Кыргыстану Аскар Акаеў ды з 85-годзьдзем — канструктар аўтаматаў Міхаіл Калашнікаў. А яшчэ раней віншаваліся прадстаўнікі расейскага мастацтва — Аляксандра Пахмутава, Мікалай Карачанцаў, Аляксандар Міхайлаў — ды шэраг другарадных расейскіх палітыкаў: Селязьнёў, Тулееў і г.д.

**Алег Раявец**

## Зьнік сьведка Жураўковай

Працэс над экс-кіраўніцай справаў А.Лукашэнкі Галінай Жураўковай і яе хаўрусьнікамі замарудзіўся праз праблемы з допытам апошняга сьведкі, якога ня могуць знайсьці. Гэта брат былога намесьніка дырэктара фірмы «Белая Русь» сп.Мурашкі. Паводле сьледзтва, ён прывозіў з-за мяжы грошы, атрыманыя ў якасьці «адкату» пры апэрацыях з нафтапрадуктамі, цукрам і цыгарэтамі, 50% якіх пасьля ішло Г.Жураўковай, а астатняе — яе падначаленым, у якасьці прэміяў.

**Паводле радыё «Свабода»**

## Пераходы для жабаў

Тры адмысловыя пераходы для жабаў і іншых земнаводных — шырынёю ў адзін мэтар і вышынёю ў 45 сантымэтраў — будуюцца пад шашой №8 з Сувалкаў да КПП у Будзіску. Усё будзе гатова да канца лістапада.

Прычыны пабудовы такіх пераходаў дзьве — экалёгія ды бясьпека на дарозе. Раздушаныя земнаводныя робяцца пагрозай для машын, сказаў інжынэр Ежы Драпа з Генэральнае ўправы агульнапольскіх дарог і аўтастрад у Беластоку.Праект фінансуецца польскім бокам і на 30% дацкім урадам. Агулам ён каштуе 120 тыс. эўра.

**Паводле радыё «Паленія»**

ПАЛІТЫЧНАЯ ТАПАГРАФІЯ

## Акрэсьціна

У прыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна адбываюць тэрміны адміністрацыйных асуджаных, у тым ліку ўдзельнікі сталічных вулічных акцыяў. Але хто такі Акрэсьцін? Камандзір лётнай эскадрыльлі лейтэнант Барыс Акрэсьцін загінуў у 1944 г. пад Менскам, накіраваўшы свой падбіты самалёт у фашысцкую калёну. Па вайне сталічная школа №65 насіла ягонае імя і стварыла музэй лётчыка.

# Кірыліца замест Яналіфу

**У аўторак 16 лістапада Канстытуцыйны суд Расеі пастанавіў, што суб'екты фэдэрацыі ня могуць самастойна вырашаць, якую графічную сыстэму ім выкарыстоўваць для свайго пісьменства. Улады Татарстану адрэагавалі імгненна: ужо на наступны дзень прэзыдэнт Шаймііеў зладзіў прэс-канфэрэнцыю ў Казані, на якой паведаміў, што будзе дамагацца прыняцьця закону, які дазволіць татарам самім вырашаць лёс уласнага альфабэту.**

Пра існаваньне рунічнага татарскага пісьменства вядома ад V ст. н.э. У XI ст. яго зьмяніў арабскі альфабэт. У 1927 г. пасьля працяглага абмеркаваньня зь лінгвістамі Савет народных камісараў ТАССР адобрыў пераход на лацінку, па-татарску — Яналіф («новы альфабэт»). У 1939 г., ужо без аніякіх навуковых нарад, лацінку замянілі на кірыліцу. У 1999 г. Дзяржаўная рада Татарстану прыняла закон «Пра ўзнаўленьне татарскага альфабэту, заснаванага на лацінскай графіцы». Расейская Дума адчула небясьпеку культурніцкага сэпаратызму ды прыняла ў 2002 г. папраўку ў закон аб мовах народаў РФ, паводле якой усе рэспублікі павінны браць кірыліцу за графічную аснову свайго пісьменства. Апошняе рашэньне Канстытуцыйнага Суду РФ — новая спроба захаваць фэдэральны лад, зацiскаючы разьвіцьцё нацыянальных культур. Татарстан з гэтым ня згодны і працягвае трымацца вэктару на заходнюю цывілізацыю.

**Алесь Кудрыцкі**

НАВІНЫ СПОРТУ

## Гурэнка — чэмпіён Расеі

Капітан нацыянальнай футбольнай зборнай Сяргей Гурэнка заваяваў у складзе маскоўскага «Лякаматыву» залатыя мэдалі расейскага чэмпіянату, а ягоны калега па зборнай Дзяніс Коўба разам з самарскімі «Крыламі Саветаў» — бронзу расейскага першынства. А вось яшчэ аднаму «зборніку» Зьмітру Раўнейку не пашэнціла. Разам з «Ротарам» (Валгаград) ён пакідае расейскую прэм'ер-лігу.

## Кадравыя перастаноўкі ў хакеі

Чарговая зьмена трэнэраў у хакейным клюбе «Дынама» (Менск). Выкаваўцу абавязкаў галоўнага трэнэра, у мінулым славутага галкіпэра Аляксандра Шумідуба адправілі ў адстаўку. Новым трэнэрам сталічнага клюбу прызначаны расеец Леанід Кісьлёў.

Паўтара году таму кіраўніцтва фэдэрацыі хакею пастанавіла зрабіць з «Дынама» супэрклюб, каб адрадзіць колішнія слаўныя традыцыі. На радыё «Рокс» нават гульню адмысловую гэтай восеньню прыдумалі — «Плэйоф. Хварэем за «Дынама». Пакуль нічога не выходзіць. У адкрытым чэмпіянаце Беларусі клюб займае 11-е месца з 12-ці.

Адправілі ў адстаўку і трэнэра «Гомеля» Ўладзімера Сініцына. Ягонае месца заняў вядомы беларускі спэцыяліст Анатоль Варывончык. «Гомель», чэмпіён 2003 году, ідзе ў першынстве сёмым.

## Пунтус перабраўся ў Менск

Знакаміты футбольны трэнэр Юры Пунтус, які два тыдні таму заявіў пра сыход з БАТЭ, узначаліў менскі МТЗ-РІПА. Клюб «трактарыстаў» разам з «Каўнасам» і шатляндзкім «Хартсам» уваходзіць у холдынг, які ўзначальвае літоўскі бізнэсовец Уладзімер Раманаў. Мэта Раманава ў Беларусі — стварыць з МТЗ-РІПА супэрклюб.

## Бубен дыскваліфікаваны пажыцьцёва

Беларускі паралімпіец-паўэрліфтэр Уладзімер Бубен атрымаў пажыцьцёвую дыскваліфікацыю. Допінг-тэст, узяты на Паралімпіядзе ў Атэнах, даў станоўчы вынік — у арганізме знойдзены анабалічны стэроід мэтандыенон. Такія жорсткія захады ў дачыненьні да 49-гадовага спартоўца ўжыты таму, што ён ужо адбываў двухгадовую дыскваліфікацыю. На Паралімпіядзе ў Грэцыі мэдалёў Бубен не заваяваў.

## Вуліца Сяргея Жаўтка

У сталіцы Латвіі зьявіцца вуліца імя хакеіста Сяргея Жаўтка, які памёр 3 лістапада ў Менску пасьля матчу паміж камандамі «Дынама» і «Рыга-2000». З такой прапановай выступіла фірма, якая будуе да чэмпіянату сьвету 2006 году хакейны палац у Рызе.

## Лёс футбалістаў вырашыцца ў пятніцу

19 лістапада пройдзе лёсаваньне чвэрцьфіналу Кубку Беларусі па футболе. Стадыю 1/8 фіналу пераадолелі шэсьць клюбаў вышэйшай лігі — гарадзенскі «Нёман», БАТЭ (Барысаў), МТЗ-РІПА (Менск), «Дняпро-Трансмаш» (Магілёў), «Гомель», «Дарыда» (Ждановічы), а таксама «Баранавічы» з бабруйскай «Белшынай», што налета будуць гуляць у першай лізе. Уладальнік Кубку-2004 салігорскі «Шахцёр» склаў свае паўнамоцтвы, саступіўшы ў 1/8 фіналу гарадзенцам.

**АР**

**Часопіс «ARCHE» шукае**

дырэктара-адміністратара на палову стаўкі. Патрабаваньні: мужчына (прыйдзецца насіць пакункі з часопісам), мянчук, здольны да арганізатарскае працы. Праца штодзённая ці амаль штодзённая. Зьвесткі пра сябе накіроўваць на э-адрас arche@arche.org.by.

**Самы танны «ARCHE»**

**Часопіс «ARCHE» абвесьціў падпіску на 2005 год па надзвычай нізкай цане — 2360 рублёў за нумар. Такім чынам рэдакцыя хоча кампэнсаваць нэгатыўны ўплыў на продажы з прычыны забароны прадаваць выданьне ў кнігарнях «Белкнігі». Часопіс выходзіць з пэрыядычнасьцю раз на два месяцы. Падпісны індэкс 00345. Падпіску можна аформіць на ўсіх аддзяленьнях пошты.**

**Кошты на платныя прыватныя абвесткі:**

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб.
Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 см². — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Даведкі праз т. (017) 284-73-29, 707-73-29, 613-32-32.

# Любімы гурт прэзыдэнта

**З гэтага тыдня айчынным музыкам будзе ісьці капейка ад выкарыстаньня іхняй музыкі ў эфіры. Раней усе дзяржтэле- і радыёканалы карысталіся фанаграмамі беларускіх выканаўцаў абсалютна бясплатна.**

Днямі будзе падпісаная дамова паміж Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам інтэлектуальнай уласнасьці (РУПІУ) і Дзяржтэлерадыёкампаніяй. «Гэта плён нашага шматгадовага змаганьня», — не бяз радасьці кажа вядучы спэцыяліст РУПІУ Вольга Жажкова.

Больш за ўсіх Дзяржтэлерадыёкампанія ўпадабала музыку гурту «Стары Ольса», кожная кампазыцыя якога, дарэчы, зарэгістраваная ў РУПІУ. Як сьведчыць лідэр гурту Зьміцер Сасноўскі, выпадкаў «дзяржаўнага пірацтва» ў адносінах да твораў ягонага калектыву ён можа пералічыць шмат. Уся тэлерэкляма «Настасьсі Слуцкай» суправаджалася песьняй «Старога Ольсы» «Руевіт» з альбому «Вір», кавалак гэтага ж твору восем месяцаў гучаў у рэклямнай застаўцы першага каналу Беларускага радыё, музыкай зь песьні «Рэчанька» ў выкананьні «Ольсы» суправаджаўся анонс конкурсу «Міс Беларусь-2004», стваральнікі дакумэнтальных фільмаў пра гісторыю Беларусі на СТВ («Мой горад — Мядзел» і «Адлюстраваньні») таксама карысталіся творчымі здабыткамі Сасноўскага і К°: «Мы за папулярызацыю беларускай музыкі ды культуры і абсалютна не шкадуем сваіх твораў, аднак хацелася б ветлівасьці з боку дзяржструктур, каб яны хаця б паведамлялі пра тое, што зьбіраюцца выкарыстаць нашы творы». За пяць гадоў у музыкаў толькі аднойчы папрасілі дазволу выкарыстаць музыку — у праграме БТ «Падарожжа дылетанта».

Цікава, што той жа «Руевіт» гучаў у прапагандысцкім відэакліпе на афіцыйным сайце Аляксандра Лукашэнкі. Кіраўнік дзяржавы ляціць у самалёце, гуляе ў хакей, саджае дрэвы і нават прымае прысягу пад музыку «Старога Ольсы». Пасьля звароту З.Сасноўскага праз РУПІУ у прэс-службу прэзыдэнта відэаролік быў зьняты з сайту…

«Спадзяюся, цяпер у нас усталююцца больш цывілізаваныя адносіны зь Дзяржтэлерадыёкампаніяй», — зазначае З.Сасноўскі.

**Сяргей Будкін**

# Руся без забабонаў

**На вакалістку рок-гурту «Індыга» Русю музычныя крытыкі глядзяць як на надзею беларускага року. Вакал ёй падрадзіўся ставіць кіраўнік «Уніі» Кірыла Насаеў, а з тэкстамі працуе Андрэй Хадановіч. Сама Руся нядаўна пераехала на новую кватэру — на «песьняроўскай» вуліцы Бяды. Тутака жыў Мулявін, непадалёк і офіс «Песьняроў», у якім Руся рэдагуе сайт. Муж Русі Зьміцер (гітарыст «Індыга») у пакоі працуе на кампутары над новымі песьнямі, а мы сядзім на кухні і п’ем каву.**

**«НН»: Як сталася, што дэбютны дыск зьявіўся толькі праз год пасьля вашай перамогі на «Басовішчы»?**

**Руся:** Праца ішла марудна. Бракавала часу — хто вучыўся, хто працаваў. Частку альбому запісалі ў Польшчы, калі грошы скончыліся — дапісвалі ў Менску. Таксама доўга працавалі над гукам, шукалі гукарэжысэра, які б адпавядаў нашым патрабаваньням.

## Для ўкраінцаў — толькі па-беларуску

**«НН»: Агульнае гучаньне альбому — 28 хвілін. Малавата.**

**Р.:** У нас новых песень набралася на «вялікі» дыск. Рыхтуем калядную праграму разам з «Consul Band» і супольную праграму з Хадановічам на лірыку Коэна. Ён пераклаў лірыку і задумаў запісаць дыск. Нас запрасіў падыграць ды падпець.

**«НН»: «Індыга» часам вінавацяць у каньюнктурнасьці: маўляў, каб паехаць на «Басовішча», пераклалі з расейскай свае тэксты…**

**Р.:** Нешта пераламалася раней. Мае амэрыканскія знаёмыя не зразумелі мяне, калі даведаліся, што я сьпяваю па-расейску. Па «Басовішчы» мая пазыцыя замацавалася канчаткова: сьпяваць толькі па-беларуску. Арганізатары канцэртаў ва Ўкраіне таксама паставілі ўмову — сьпяваць на сваёй мове.

**«НН»: Калісьці вы прарываліся ў Расею, цяпер — ва Ўкраіну. Зьмянілі скіраванасьць?**

**Р.:** Расею не закінулі, вырашылі прарывацца туды зь беларускай мовай. А з украінскім турам выйшла цікава. Дзіма знайшоў па абвестках у адной з кіеўскіх крам тое, пра што ўвесь час марыў, — гітару «Гібсан» — і паехаў па яе. Гандляр між іншым пацікавіўся, што за музыку ён грае, і Дзіма падараваў яму наш дыск. Пасьля гэтага нас запрасілі даць некалькі клюбных канцэртаў. З 2 па 4 сьнежня міні-тур: Кіеў, Харкаў і Днепрапятроўск, таксама запрасілі на кіеўскае тэлебачаньне.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## 75% не для нас

**«НН»: З увядзеньнем квоты на 75% беларускай музыкі на радыё, падаюцца два імаверныя варыянты для «Індыга»: прыпапсець і трапіць у жорсткую ратацыю ці прынцыпова зьбіцца на вострасацыяльнасьць і граць на Бангалоры.**

**Р.:** Хочацца проста займацца творчасьцю. Тужыліся зрабіць нешта радыёфарматнае, але, калі ёсьць зададзенасьць, няма натхненьня. Дый сэнсу мала ў гэтай пастанове — яшчэ болей будзе песень Маісеева і «Ночных снайпероў». Мы папсець ня будзем. Цяпер нас хіліць у бок джаз-року.

**«НН»: …Цябе ўжо пачалі прымяраць пад сэкс-сымбаль беларускага року. Тут яшчэ і твая нядаўняя заява, што «Індыга» падтрымліваюць сэкс-меншасьці…**

**Р.:** Я — вольная ад забабонаў. Думаю, што прыхільнікаў, якія маюць традыцыйную арыентацыю, мы гэтым не распужаем. А вось саманазвацца «сэкс-сымбалем» з маім ростам сумленьня не хапае.

**Гутарыў Сяргей Будкін**

12 сьнежня ў Малой залі Палацу Рэспублікі — вялікі канцэрт, прысьвечаны дню нараджэньня інтэрнэт-парталу «Тузін гітоў». Руся і «Індыга» выступяць разам з «Нэйра Дзюбэлем», «Крамай» і «IQ-48». Канцэрт будуць весьці Ганна й Лявон Вольскія.

## Паэтычная дзясятка

Пры канцы лістапада пяцігодзьдзе адзначыць сайт «Lyrikline» (www.lyrikline.org). З гэтай нагоды на ім зьявяцца вершы дзесяці беларускіх аўтараў (сьпярша ў арыгінале й па-нямецку, пазьней маркуюцца пераклады й на іншыя мовы) — Ігара Бабкова, Вальжыны Морт, Веры Бурлак, Віктара Жыбуля, Андрэя Хадановіча, Міхася Скоблы, Ніны Мацяш, Вольгі Іпатавай, Леаніда Дранька-Майсюка, Алеся Разанава. Вершы на сайце можна будзе ня толькі прачытаць, але й паслухаць у аўтарскім выкананьні. Беларускі разьдзел на партале пачне працаваць не пазьней за 1 сьнежня.

На ўрачыстасьцях з нагоды юбілею сайту, што адбудуцца ў Бэрлінскай ратушы, Беларусь будзе прэзэнтаваць Вальжына Морт. Апрача беларускай літаратуры, на сайце маюць узьнікнуць таксама «літпрадстаўніцтвы» іншых краін — Літвы, Сэрбіі, Славеніі, Партугаліі, Вугоршчыны, Бэльгіі, Турцыі, Ірану.

## Фэстываль габрэйскай кнігі

У Менскім габрэйскім грамадзкім доме (вул.Харужай, 28) праходзіць VIII фэстываль габрэйскае кнігі. Прэзэнтавана 30 новых выданьняў, адбылася прэм’ера дакумэнтальнага фільму Натальлі Язоўскіх «Той, хто выжыў у пекле» — пра габрэйскі супраціў у Наваградзкім гета. 21 лістапада адбудуцца таксама дзіцячае (а 14-й) і моладзевае (а 19-й) сьвяты.

## Нашыя ў Жэнэве

Выстава «Беларускае сучаснае мастацтва», на якой дэманструюцца 58 твораў мастакоў розных пакаленьняў, адкрылася ў Палацы нацый у Жэнэве (Швайцарыя). У экспазыцыю ўключаны карціны, створаныя за апошнія 15 гадоў.

## Фіеста жахалак

У Варшаве прайшоў Незалежны кінафэстываль хорару «Horror Fiesta», на якім былі паказаны 50 фільмаў з 11 краін. Фэстываль выявіў, што найбольш страшная тэма ў кіно — штодзённае жыцьцё, а не якія прывіды. Найлепшым фільмам прызналі стужку брытанца Робэрта Пратэна «Лёндански вуду». Фільм пра сямейную пару, якая прыехала ў Лёндан. Галоўная гераіня апантаная культам вуду.

**АВ, СБ; МБ**

## Збор подпісаў за 75% на FM

Канцэрт «Уліс»у» і «Троіцы» ў суботу аб’яднаў дзьве зусім розныя групы. Таму пасьля першага аддзяленьня, у якім этна-трыё прэзэнтавала сваю праграму «Сем», на «Ўлісе» засталася меншая палова залі. Але лідэр «Уліс»у» гэтым не засмуціўся. Рознастылёвасьць выступоўцаў, на думку Кораня, ідзе на карысьць імпрэзе: «Гэта нармальная практыка, пашыраная ў Эўропе. Нехта прыходзіць на адных і п’е піва ў буфэце падчас выступу другіх.

«Уліс» даў першы сольны канцэрт у Менску за паўтара году. «Троіца» ня грала ў сталіцы год. Пад Каляды «Ўліс» дасьць канцэрты ў Варшаве і Беластоку.

Перад канцэртам актывісты БМА зьбіралі подпісы ў падтрымку 75%-е квоты на беларускую музыку на FM. Народ выяўляў энтузіязм.

**СБ**

# Імпэрыі трэба нішчыць

Героі антычнай гісторыі ў беларускай гуманістыцы — госьці рэдкія. Нячаста іх сустрэнеш нават у мастацкіх ці папулярызатарскіх творах: за апошнія гады можна згадаць хіба што дзіцячую кнігу Ўладзімера Бутрамеева «Вялікія й славутыя старажытнага сьвету» ды аповесьць Алеся Астраўцова «Сула».

З навуковай літаратурай яшчэ цяжэй: па-беларуску кнігі пра антычнасьць наагул не выходзілі. У гэтым сэнсе манаграфія А.Зельскага робіць істотны прарыў. Нездарма ж у сьпісе выкарыстанай літаратуры аўтар згадвае зь менскіх толькі расейскамоўныя выданьні — кнігу К.Рэвякі «Пунічныя войны» (1988) і непрафэсійную зборку «Сусьветная гісторыя. У 24 тамах» (т.4, 1998). А калі казаць пра тэму дасьледаваньня, дык апошнім зь беларусаў працу пра войны рымлян і пантыйцаў надрукаваў у Пецярбургу ў 1824 г. Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч.

Зрэшты, кніга пісалася без увагі на гэтыя акалічнасьці. Чытаць яе людзям, ня схільным да корпаньня ў мностве малазнаёмых імёнаў, не рэкамендуецца, гэтаксама як і настроеным на лёгкае забаўляльна-адукацыйнае чытва з сэрыі «Жыцьцё знакамітых людзей». Аніякіх фантазій на тэму, хто каму чаго казаў, хто што падумаў і г.д., — толькі сухія факты. Што праўда, нават гэты сухі



Артур Зельскі. Першая Пантыйская (Мітрыдатава) вайна. — Менск: БДУ, 2004.

выклад падзей часта чытаецца ня горш за батальныя сцэны ў раманах: асада рымлянамі Пірэю сама просіцца на шырокі экран у фармаце галівудзкага блякбастэру. Найболей жа цікавы сюжэтны паварот у кнізе — пра тое, як змаганьне супраць імпэрыі (пантыйскага цара Мітрыдата супраць рымлян) перарастае ў заснаваньне ўласнае імпэрыі.

Уласнае стаўленьне аўтара да апісаваных падзеяў засталося вынесеным у прадмову: "Усе прыёмы вядзеньня вайны, ад самых звычайных да самых жахлівых, людзі пачалі выкарыстоўваць здаўна. Пазьнейшыя стагодзьдзі і сучаснасьць не дадаюць амаль нічога новага, хіба што мяняюцца сродкі вынішчэньня людзей, а спосабы тыя самыя: тут і дэпартацыя народаў, і «зачысткі» гарадоў і цэлых абласьцей ад «небясьпечнага» насельніцтва, што з аднолькавым посьпехам прымянялі і пантыйцы, і рымляне як на тэатры ваенных дзеяньняў, так і ў тыле».

**Адам Воршыч**

## Кузьня беларускіх піратэхнікаў

17 лістапада філялягічны факультэт БДУ адзначае 65-годзьдзе. Быць філёлягам у Беларусі — амаль тое самае, што піратэхнікам у Чачэніі. Сапраўдны філёляг прыцягвае ўвагу з усіх бакоў.

У выбуховай атмасфэры беларускае гуманістыкі, з дапамогай эўрапейскай мэтадалёгіі, філялягічныя факультэты маглі б штогод гартаваць для краіны сотні спэцыялістаў высокае пробы, якія б прафэсійна працавалі над стварэньнем прывабнага вобразу сучаснае Беларушчыны. Так, нават без найноўшых мэтодык навучаньня, у выніку лёгкага аслабленьня ідэалягічных абцугоў у 60-я зьявілася «філялягічнае пакаленьне» літаратараў. Яго дэмакратычны запал перадвызначыў кірунак далейшага разьвіцьця прыгожага пісьменства, а пазьней дапамог краіне ўтрымаць незалежнасьць. А глытка свабоды, дадзенага ў 90-я, было дастаткова, каб філфак БДУ дагэтуль заставаўся агмянём беларускае культуры і гадавальнікам паэтаў і палітыкаў.

Якой мы пабачым Беларусь праз дзесяць гадоў? Якія кніжкі будзем чытаць? Гэта залежыць і ад таго, што сёньня адбываецца ў сьценах філфаку БДУ — галоўнае кузьні «піратэхнікаў». Тэма нумару — Беларускі Філфак.

# Ад бабфаку да бабфаку

## зь перапынкам на гады нацыянальнага адраджэньня. Жаночае царства філфаку БДУ застаецца агмянём беларускае культуры і гадавальнікам паэтаў і палітыкаў

Аркадзь Шанскі

**Трывала замацаванае ўяўленьне, што філялягічны — «жаночы» факультэт (гэтаксама як бібліятэчны ва Ўнівэрсытэце культуры называюць «бабфак», замяняючы першы галосны), з усімі адпаведнымі наступствамі — гістэрычным кіданьнем у авантуры, адсутнасьцю прадуманай стратэгічнай праграмы разьвіцьця й г.д. Ён і цяпер застаецца пераважна дзявочым: у сярэднім хлопцаў у 10 разоў менш, чым дзяўчат. Крайне рэдкія адхіленьні ў бок павелічэньня колькасьці хлопцаў (1:8) ці іх зьмяншэньня (1:12). Аднак і на курсах хлопцы разьмеркаваныя нераўнамерна: бываюць групы, дзе адзін хлопец прыпадае на 23 дзяўчыны (!).**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Дэкан Іван Роўда (у цэнтры) аднаўляе сьветлыя фрагмэнты, але савецкай мінуўшчыны.**

Яшчэ ў 80-х філфак карыстаўся ўстойлівай рэпутацыяй «балота». Якая пэрспэктыва ў выпускніцы філфаку? Паехаць у вёску, каб выкладаць дзецям мову й літаратуру… Хіба такой уяўляе кар'еру выпускніца сталічнай ВНУ?

Расейскае аддзяленьне выглядала ў параўнаньні зь беларускім больш «прасунутым»: толькі там студэнты маглі абараняцца па замежнай літаратуры, дый набор на расейскае быў большы. Колішняя выпускніца расейскага аддзяленьня Натальля Кучмель адзначыла з гэтай нагоды: «Цяпер, дзякуй богу, пераламілася сытуацыя з дамінаваньнем расейшчыны».

> У «перабудову» на беларускае аддзяленьне быў нечуваны наплыў абітурыентаў: адных мэдалістаў было блізу сотні на 125 месцаў.

Пералом адбыўся ў 1989 г. У «перабудову» на беларускае аддзяленьне быў нечуваны датуль наплыў абітурыентаў: адных толькі мэдалістаў было блізу сотні на 125 месцаў. Адначасова рэзка вырасла доля хлопцаў — яны ішлі сюды, бо хацелі змагацца за беларушчыну. На беларускае аддзяленьне сталі глядзець з павагай. Тым, хто паступіў на філфак у 1991 г., ужо дазволілі зь беларускага аддзяленьня спэцыялізавацца на вывучэньні замежнае літаратуры.

### На мяжы эпох

Да 1989 г. уласна беларускага аддзяленьня на філфаку БДУ не існавала: былі расейскае і расейска-беларускае. Тлумачылася гэта зноўтакі пераважнай бальшынёй дзяўчат на факультэце. Маўляў, выйдуць дзяўчаты замуж, паедуць куды-небудзь далёка па эсэсэсэры і ня змогуць працаваць па спэцыяльнасьці: каму на Далёкім Усходзе спатрэбіцца беларуская мова?

Зьяўленьнем чыста беларускага аддзяленьня структурныя зьмены на факультэце не абмежаваліся. У 90-х тут з хуткасьцю эпідэміі пачалі памнажацца разнастайныя аддзяленьні: зьявіўся зьніклы гібрыд – беларуска-расейскае аддзяленьне. Раптам зьявіўся гэты рэлікт савецкай эпохі, але хутка й зьнік, праіснаваўшы ўсяго 3 гады — з 93-га па 95-ы.

Потым узьнікла аддзяленьне клясычнай філялёгіі (лаціны і грэцкай мовы), арганізаваць набор на якое філфак падужаў толькі 2 гады — у 94-м і 95-м. Выкладчыца факультэту лаціністка Галіна Шаўчэнка, ініцыятарка стварэньня аддзяленьня, спадзявалася, што «клясыкі» будуць арганізаваныя на аснове беларускіх навучэнцаў. На яе думку, гэта было неабходна для перакладу таго масіву беларускай спадчыны, які пакуль яшчэ існуе толькі на лаціне, — як прыўкраснага пісьменства, так і гістарычных дакумэнтаў. Як ні дзіўна, найбольш ідэі заснаваньня клясычнага аддзяленьня на базе беларускага супрацьстаялі дэкан Алег Лойка ды ягоны намесьнік, выкладчык старабеларускай літаратуры Ўладзімер Кароткі. Іхная аргумэнтацыя зводзілася да звыкла-савецкага пастуляту: няхай беларусы вывучаюць сваё.

> На філфаку зноў, як у савецкі час, прасьцей зрабіць кар'еру, займаючыся грамадзкай дзейнасьцю, а не навуковай ці навучальнай.

У 95-м філфак пачаў ствараць канкурэнцыю Лінгвістычнаму ўнівэрсытэту: зьявіліся ангельскае, францускае, нямецкае й славянскае аддзяленьні. У 97-м да іх дадалося італьянскае. «Залаты век» гэтых аддзяленьняў прыпаў на час іхнай беларускасьці: выпускнікі першых двух набораў атрымлівалі дыплём на дзьве мовы — замежную й беларускую. Потым іх перавялі толькі на замежную й бальшыню прадметаў сталі чытаць па-расейску.

### Трафэі

У 91-м пасьля путчу ляснуў камунізм, і філфак атрымаў шыкоўны падарунак — будынак былой Вышэйшай партыйнай школы з усімі «трафэямі», якія засталіся пасьля камуністаў. Першымі днямі выкладчыкі й студэнты проста шалелі ад шчасьця: хадзілі па мяккіх дыванных дарожках, на перапынках адпачывалі на пастаўленых у калідорах канапах і ў фатэлях. Вокны былі прыкрытыя шыкоўнымі парцьерамі, аўдыторыі — абсталяваныя мікрафонамі… Трафэйная прыгажосьць пратрымалася нядоўга. Хтосьці прыгадаў лацінскі выраз «Vae victis!» («Гора пераможаным!») і пачаў дзейнічаць. Цягам нейкіх двух-трох месяцаў пазьнікалі і канапы з фатэлямі, і дывановыя дарожкі, і парцьеры. Нешта бралі студэнты, штосьці «канфіскавала» адміністрацыя будынку. Паводле чутак, не пагрэбаваў і сёй-той з выкладчыкаў…

> Прафэсару Лойку не ўдалося зьмяніць пануючага становішча расейскага аддзяленьня.

### Ад гісторыі КПСС да паэзіі

Дэкан Аляксей Воўк быў сам па сабе ўнікальнай зьявай: філялягічным факультэтам доўгія гады кіраваў не філёляг — гісторык. Воўк выкладаў гісторыю КПСС і абавязкова паведамляў кожнаму курсу, што прачытаў увесь збор твораў Леніна (на той час 55 тамоў!).

Працяг на старонцы 10.

### Плян набору на філфак БДУ

| Год | Аддзяленьне | Беларускае | Расейскае | Славянскае | Ангельскае | Францускае | Італьянскае | Нямецкае |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1993 | | 125 | 50 | 25 | | | | |
| 1994 | | 140 | 50 | 10 | | | | |
| 1995 | | 120 | 50 | 10 | 10 | 10 | | 10 |
| 1997 | | 90 | 50 | 30 | няма зьвестак | няма зьвестак | няма зьвестак | няма зьвестак |
| 1998 | | 90 | 50 | 20 | 25 | 15 | 15 | 15 |
| 2001 | | 80 | 60 | 20 | 35 | 20 | 20 | 20 |
| 2002 | | 83 | 63 | 30 | 42 | 25 | 25 | 25 |
| 2003 | | 83 | 63 | 40 | 45 | 20 | 20 | 20 |
| 2004 | | 80 | 60 | 30 | 45 | 25 | 25 | 25 |

У 1993—1995 г. на філфаку існавала беларуска-расейскае аддзяленьне. Набор туды складаў 75 (1993), 60 (1994), 50 чалавек (1995).

Аддзяленьне клясычных моў існавала ў 1994—1995 г. Набор быў, адпаведна, у 20 і 10 чалавек. У 2004 г. набор на клясычнае аддзяленьне аднавіўся — 15 чалавек.

Конкурс у 1994 г. на беларуска-расейскае аддзяленьне складаў 1,6, на клясычнае — 1,95 чалавека на месца. У 1995 г. — 2,32 і 2,3 адпаведна.

# Вядомыя выпускнікі філфаку

**Уладзімер Граўцоў, уласьнік выдавецкага холдынгу**

Уладзімер Граўцоў трапіў на філфак, бо ня здаў іспытаў на журфак. Скончыў яго ў 1985 г. і вельмі хацеў застацца на літаратурнай працы ў часопісах, але ня здолеў і паехаў працаваць у Асіповіцкі раён загадчыкам інтэрнату пры школе, настаўнікам этыкі і псыхалёгіі, пазьней дырэктарам школы. Адтуль ён дасылаў артыкулы і п'есы ў «Вожык», «Крыніцу». Яговыя п'есы пачалі ставіць лялечныя тэатры. Нарэшце праз некаторы час Уладзімера запрасілі працаваць у ТЮГ. Амаль год ён кожныя выходныя езьдзіў да сям'і ў вёску, везучы торбы з прадуктамі.

Пасьля пачатку перабудовы літаратурная праца ўжо не магла харчаваць сям'ю. Сябры запрасілі Ўладзімера працаваць у банк, але аказалася, што ён нічога ня ўмее. Аднак Уладзімер папрасіў даць яму шанец і вырашыў даказаць, што ён можа, і «адпомсьціць за прафсаюз творчых людзей». Ён даў сабе 10 гадоў на тое, каб займець машыну і кватэру. Цяпер ён прыгадвае, што было вельмі цяжка. Уладзімер ламаў сябе, абавязваючы думаць па-іншаму. Сьціснуўшы зубы, прымушаў сябе не хадзіць у тэатар. Чытаў «Коммерсантъ», нічога не разумеў, адкладаў газэту, ішоў паліць і перачытваў артыкулы па пяць разоў, каб пачаць думаць гэтымі катэгорыямі.

> Сьціснуўшы зубы, Уладзімер Граўцоў прымушаў сябе не хадзіць у тэатар. Чытаў «Коммерсантъ», каб пачаць думаць бізнэс-катэгорыямі.

Сёньня ягоны бізнэс — гэта холдынг, які складаецца з інфармацыйнага агенцтва, выдавецкага дому і інфармацыйна-пошукавай сыстэмы па дакумэнтах. Вядомасьць холдынгу прынесьлі курсы валют. Посьпех «Главного бухгалтера» Ўладзімер тлумачыць тым, што яго не шкада рэзаць: «У мяне б ня выйшаў добры літаратурны часопіс, гэтак жа як хірург ня можа апэраваць сваякоў».

П'есы Граўцова ставяцца яшчэ і цяпер. Нядаўна, калі адзін з самадзейных тэатраў запрасіў яго на прэм'еру ягонай п'есы, ён ішоў туды з такім хваляваньнем, якога ня меў нават на пачатку кар'еры сцэнарыста.

Уладзімер кажа, што для яго вучоба пасьля сканчэньня філфаку толькі пачалася. Ён надае адукацыі вялікае значэньне і нават мае дыплём за ўклад у адукаваньне бізнэс-эліты. Ягонае прадпрыемства лічыцца найлепшым па магчымасьцях атрыманьня адукацыі. А сам Уладзімер усе свае грошы траціць на тое, што езьдзіць па сьвеце і глядзіць на сусьветныя мэдыя-канцэрны.

**Генадзь Бураўкін, паэт і дыплямат**

Генадзь Бураўкін скончыў аддзяленьне журналістыкі на філфаку ў 1959 г. Унівэрсытэт, паводле яго прызнаньня, даў яму дружбу, чалавечую загартоўку і вызначыў сямейнае жыцьцё. Гады навучаньня паэт прыгадвае як бедныя, але шчасьлівыя. Філфак адкрыў сьвет для студэнтаў, даў жаданае далучэньне да сусьветнай культуры. Час навучаньня прыпаў на ХХ зьезд партыі і адлігу, тым больш зьмястоўным і насычаным быў працэс адукацыі. На курсе сабраліся спрэс будучыя знакамітасьці: Міхась Стральцоў, Рыгор Барадулін, а курсам раней ці пазьней — Барыс Сачанка, Янка Сіпакоў, Іван Чыгрынаў, Іван Пташнікаў, Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч. Сваё пакаленьне Генадзь з гонарам называе філфакаўскім. Другім вялікім шчасьцем было пражываньне ў інтэрнаце. Яно давала бясцэнны вопыт жыцьця зь іншымі людзьмі і іх разуменьня. У інтэрнаце Генадзь жыў разам з Рыгорам Барадуліным і Міхасём Стральцовым. З Барадуліным, дарэчы, пазьней жылі ў адным пад'езьдзе, дый цяпер пад'езд Генадзя Мікалаевіча «філялягічны»: паверхам вышэй ад яго жыве Юрась Бушлякоў.

Пасьля сканчэньня ўнівэрсытэту Генадзь Бураўкін працаваў у розных сродках масавай агітацыі і прапаганды, у тым ліку ў газэце «Правда», і ганарыцца гэтым: туды адбіралі найлепшых журналістаў. Пасьля працы ў газэце «ЛіМ» і часопісе «Нёман» 12 гадоў правёў на чале Белтэлерадыёкампаніі. Пакуль ніхто рэкорду не пабіў. У 1990 г. ягонае кіраваньне тэлевізіяй і радыё стала непажаданым: ён неадназова даваў у эфір сюжэты пра Курапаты з удзелам Пазьняка. Зволіньць не было за што, таму яго накіравалі паслом Беларусі ў ААН. На той момант пасада была ў значнай ступені фармальная, таму што пасьлы БССР і ЎССР заўсёды галасавалі так, як прадстаўнік СССР. Але ж пасьля абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі пасада набыла рэальны зьмест. Калі даведаліся пра зьмену нацыянальнай сымболікі, жонкі ўночы шылі сьцяг, каб зьмяніць наранку стары сьцяг перад будынкам ААН. Дыпляматычная група ААН аказалася адзіным дыпляматычным прадстаўніцтвам новай незалежнай краіны ў сьвеце. Дыпляматычнай школы не існавала, таму прыйшлося вучыцца ўсяму: ангельскай мове, гісторыі дыпляматыі. Гэта Генадзь Бураўкін уважае за падарунак лёсу — закладаць асновы беларускай дыпляматыі. Ён быў першым, хто ўручаў беларускамоўныя даверчыя граматы.

Цяпер галоўная справа Генадзя Бураўкіна — разбор архіву Васіля Быкава, чаму ён прысьвячае адзін дзень на тыдзень.




АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Пасьля шэрагу тэлесюжэтаў пра Курапаты з удзелам Пазьняка Генадзя Бураўкіна накіравалі паслом Беларусі ў ААН.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Алесь Пашкевіч мяркуе, што на філфак варта было ісьці хаця б дзеля таго, каб знайсьці там жонку.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У школе Вінцук Вячорка пачаў весьці дзёньнік па-беларуску, за што атрымаў заўвагу: «Заполняй дневник нормально!»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Рэкамэндацыю ў міліцыю выпускніку філфаку Іосіфу Кучынскаму падпісаў Анатоль Тозік.

**Вінцук Вячорка, палітык**

Час навучаньня ва ўнівэрсытэце Вінцука Вячоркі прыпаў на пярэдадзень нацыянальнага адраджэньня. Вінцук паступаў на філфак ужо нацыянальна сьвядомым, сам сабой яшчэ ў школе пачаў размаўляць і весьці дзёньнік па-беларуску, за што ў дзёньніку была заўвага: «Заполняй дневник нормально!» На філфаку першым часам яго зьдзівіла тое, што мала хто размаўляе па-беларуску. Аднак потым сабралася добрая каманда з будучага барда Сокалава-Воюша, Алены Анісім, якія стварылі нефармальнае аб'яднаньне моладзі «Майстроўня». Ладзілі культурніцкія вечарыны, на якія зьбіраліся поўныя залі. З таго часу вядомы Вячоркавы арганізатарскія схільнасьці што да грамадзкай дзейнасьці.

Пасьля сканчэньня ўнівэрсытэту працаваў выкладчыкам, у тым ліку з 1990 г. — у Гуманітарным ліцэі, дзе цяпер вучыцца ягоны сын Франак. Вінцук рупіцца аб незалежнай адукацыі: гэта адзін з самых галоўных кірункаў дзейнасьці ягонага цэнтру «Супольнасьць». Таксама працаваў у часопісе «Спадчына», чым займаецца і цяпер. Прыватным чынам яшчэ з трыма мовазнаўцамі працуе над удасканаленьнем беларускага клясычнага правапісу.

Пасьля падзелу БНФ у 1999 г. узначаліў партыю і рух. Для яго ўсе тры кірункі дзейнасьці зьяўляюцца аднолькава важнымі.

**Алесь Пашкевіч, старшыня Саюзу пісьменьнікаў**

Старшыня Саюзу пісьменьнікаў Беларусі Алесь Пашкевіч мяркуе, што на філфак варта было ісьці хаця б дзеля таго, каб знайсьці там жонку, — яна вучылася з Алесем у адной групе.

Алесь яшчэ ў школе «шкрэбаў» вершы — паступаць ён ехаў з пафагульным сшыткам «нібыта-вершаў». Ужо на другім курсе стаў намесьнікам рэдактара часопісу «Першацвет», пасьля сканчэньня філфаку застаўся ў асьпірантуры, абараніў дысэртацыю і выкладае на філфаку. У 2002 г. выбраны старшынём СП. Алесь пасьпяхова спалучае грамадзка-бюракратычную дзейнасьць у СП з творчасьцю. Толькі зьявіўся ягоны біяграфічны раман, прысьвечаны Ўладзімеру Дубоўку. Матэрыялы для раману пачаў зьбіраць яшчэ ў студэнцкія гады, тады і доступ да архіваў быў прасьцейшы.

Алесь узгадвае, што за пяць гадоў вучобы зьмянілася цэлая эпоха. У 1989-м, на першым курсе, свой першы іспыт здаваў па гісторыі КПСС. Першую ўводную лекцыю чытаў дэкан Воўк у будынку на Чырвонаармейскай, хваліўся, што прачытаў усе 53 тамы Леніна. А ўжо ў наступным годзе філфак з новым дэканам Алегам Лойкам займаў новыя апартамэнты былой ВПШ. Лойка на ўводнай лекцыі хваліўся, што мае прачытаным ужо ня Леніна, а ўсе беларускія летапісы.

Алесь шкадуе, што ня можа зноў паступіць на філфак, і зайздросьціць цяперашнім студэнтам. Яны ў параўнаньні са студэнтамі тагачаснымі больш падрыхтаваныя ў замежных літаратурах, больш разьняволеныя. Цяпер студэнтам філфаку ганарова сябе ўсьведамляць, таму што герб і сьцяг БДУ маюць цалкам філялягічную сымболіку — Купальскую кветку-папараць.

**Іосіф Кучынскі, палкоўнік міліцыі**

Іосіф Кучынскі — начальнік упраўленьня ідэалягічнай работы ў цэнтральным апараце МВД. Яшчэ падчас навучаньня яго вабілі пагоны, аднак на філфаку існавала вайсковая катэдра, і набору ў войска пасьля заканчэньня не было. Але рэкамэндацыю, падпісаную тады старшынём камсамолу БДУ, а сёньня кіраўніком дзяржкантролю Тозікам, Кучынскі атрымаў у міліцыю. Адпрацаваў 20 гадоў у міліцыі на транспарце, у міліцэйскай акадэміі.

Філфак даў яму грамату. Сярод сваіх калег лічыўся самым умелым прамоўцам. Акрамя гэтага, захапленьне спортам. На курсе было 30 хлопцаў. Два гады запар іх «жаночы» факультэт перамагаў ва ўнівэрсытэцкіх спаборніцтвах па барацьбе. Сам Іосіф быў чэмпіёнам унівэрсытэту. Гэтае захапленьне спортам працягнулася праз усё жыцьцё: ужо ў міліцыі ён гуляў у футбол, апошнія два гады — у хакей (да гэтага прывучыў міліцыянтаў міністар унутраных спраў Уладзімер Навумаў). «Хакей — гэта файна, адразу здымае ўвесь стрэс, прыходзіш дадому як нанова народжаны». Розныя спартовыя спаборніцтвы між сілавымі міністэрствамі ладзяцца рэгулярна. Толькі нядаўна каманда МУС выйграла ў каманды КДБ у валейбол.

Сёньня ў сыстэме ўнутраных спраў працуе досыць многа выпускнікоў філфаку, перш за ўсё ў інспэкцыях па справах непаўналетніх. Бо для такой працы неабходная пэдагагічная і псыхалягічная падрыхтоўка.

Іосіф Тафілевіч з задавальненьнем рэгулярна сустракаецца са сваімі былымі аднакурсьнікамі, філфак прыгадвае з удзячнасьцю.

**Вераніка Дзядок**

# Ад бабфаку да бабфаку

Працяг са старонкі 8.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Студэнты па-за беларускім аддзяленьнем цяпер вывучаюць на выбар расейскую альбо беларускую літаратуру. Такога не было нават у савецкія часы.

«Эпоха Ваўка» скончылася толькі ягонай сьмерцю пры канцы 1990-га. Як адзначаюць тагачасныя студэнты факультэту, Воўк паводзіў сябе нібы ангельская каралева: цараваў, але не кіраваў. «Шэрым кардыналам» пры ім быў намесьнік Уладзімер Піпчанка, адказны за расейскае аддзяленьне.

Прыход наступнага дэкана — прафэсара Алега Лойкі — меўся азначаць перамогу «беларускіх нацыяналістаў». Але перамога атрымалася бадай што намінальнай: пазыцыі расейскага аддзяленьня заставаліся па-ранейшаму трывалымі. Менавіта пры Лойкавым дэканстве загадчыца катэдры рыторыкі й мэтодыкі выкладаньня расейскай мовы Ларыса Мурына зьбірала форум выкладчыкаў расейскай мовы й літаратуры, каб лямантаваць пра ўціск расейскай мовы ў Беларусі.

### «Жалезная лэдзі філфаку»

Магчыма, гэта (ды яшчэ палымяная абарона будучага рэктара Аляксандра Казуліна, якога ў прэсе абвінавачвалі ў несамастойным напісаньні дысэртацыі) адыграла сваю ролю, і ў 1996 г. Мурына стала першай жанчынай — дэканам філфаку. Чарговая русіфікацыя філфаку супала з адпаведнай зьвявай у дзяржаўным маштабе. Сама «спадарыня дэкан» беларускай мовай не карысталася. На выкладчыкаў катэдры гісторыі замежнай літаратуры, якія вялі заняткі па-беларуску, пачало ціснуць факультэцкае начальства, да якога далучыліся «прывілеяваныя дзеці» накшталт дачкі Казуліна: вядзіце заняткі па-расейску. Да гонару выкладчыкаў, яны й дагэтуль вядуць свае заняткі па-беларуску.

На дэканскай пасадзе Мурына выявілася «жалезнай лэдзі», якая моцна трымала факультэт у сваёй уладнай руцэ. Супрацоўнікі факультэту кажуць, што карала і ўзнагароджвала яна зыходзячы з уласных сымпатый і антыпатый. «Не сакрэт, што лябаранткі Мурынай атрымлівалі больш за сяго-таго з выкладчыкаў. Але калі да яе прыйсьці ды паплакацца-паскардзіцца на лёс, яна магла й дапамагчы», — згадвае адна з выкладчыц.

Іншы выкладчык, характарызуючы «эпоху Мурынай», зазначыў, што пры ёй факультэт «стаў ператварацца зь відавочнай правінцыі ў незаўважную» за кошт разьвіцьця замежных аддзяленьняў. «Праўда, адчынялі іх, не зважаючы на адсутнасьць кадраў, якія маглі б выкладаць на гэтых аддзяленьнях. Маладыя асьпіранты сталелі «на барыкадах», авалодваючы новымі ведамі практычна ўвадначас з студэнтамі. У пэўнай ступені гэта пайшло на карысьць усім», — кажа ён.

Яшчэ адна характарыстыка «эпохі Мурынай»: на факультэце самыя галоўныя людзі — лябаранткі, сакратаркі, мэтадысты, толькі не студэнты й выкладчыкі. Гэтая рыса была ўласьцівая факультэту й раней, але пры гэтай кіраўніцы надзвычай узмацнілася.

### Vita nova?

Зь мінулага году факультэт узначаліў Іван Роўда, загадчык катэды расейскае мовы. У адрозьненьне ад сваёй папярэдніцы ён беларускай мовай валодае і да беларускамоўных «насельнікаў» філфаку зьвяртаецца па-беларуску. Аднак расейшчына ўсё яшчэ не здае сваіх бастыёнаў. Супрацоўнікі факультэту мяркуюць, нібы дзеецца гэта з тае прычыны, што Мурына застаецца «шэрым кардыналам» пры новым дэкану.

Студэнты па-за беларускім аддзяленьнем цяпер вывучаюць на выбар альбо расейскую, альбо беларускую літаратуру. Выкладчык філфаку, зь якім давялося паразмаўляць аўтару гэтых радкоў, прызнаўся, што гэта нагадвае яму савецкія часы: «Розьніца толькі ў тым, што тады давалі магчымасьць школьнікам адмовіцца ад вывучэньня беларускай мовы, а тут — студэнтам ад літаратуры. Але як можна студэнтаў-філёлягаў вызваляць ад вывучэньня літаратуры тытульнай нацыі?»

Сёньняшні філфак актыўна рэанімуе атавізмы савецкага часу. Дэкан шмат увагі надае пазанавучальнай дзейнасьці — арганізацыі вечарын, конкурсаў, сьвяткаваньняў. Адзін з супрацоўнікаў філфаку зазначыў з гэтай нагоды, што Роўда аднаўляе «сьветлыя фрагмэнты, але савецкай мінуўшчыны»: пры ім прасьцей зрабіць кар’еру, займаючыся той самай грамадзкай дзейнасьцю, а не навуковай ці навучальнай.

Гэткім самым атавізмам выглядае навучальная праграма студэнтаў замежнага аддзяленьня: няпрофільныя прадметы (накшталт мэтодыкі выкладаньня, расейскай літаратуры, мэдычнай падрыхтоўкі) у іх паводле праграмы займаюць больш часу, чым уласна спэцыяльнасьць — замежная мова й літаратура.

Філфак зьмяняецца разам з часам і служыць адбіткам кожнае эпохі. Ці здолее ён перадужаць сябе і пачаць працу з апярэджаньнем часу? Унутраныя магчымасьці для гэтага ёсьць.

### Конкурс пры паступленьні

| Год | Аддзяленьне | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Беларускае | Расейскае | Славянскае | Ангельскае | Француское | Італьянскае | Нямецкае |
| 1994 | 1,75 | 1,94 | 2,0 | | | | |
| 1995 | 1,88 | 2,48 | 1,7 | 3,2 | 2,0 | | 1,4 |
| 1996 | 2,14 | 2,64 | 2,3 | няма зьвестак | няма зьвестак | няма зьвестак | няма зьвестак |
| 1997 | 2,69 | 3,28 | 1,97 | 3,33 | 1,53 | 2,87 | 1,4 |
| 1998 | 3,11 | 3,1 | 2,48 | 6,28 | 2,8 | 4,07 | 3,67 |
| 1999 | 2,74 | 3,48 | 3,13 | 4,56 | 1,6 | 3,2 | 2,73 |
| 2000 | 2,69 | 2,4 | 5,1 | 5,2 | 2,5 | 4,9 | 3,5 |
| 2001 | 3,39 | 2,7 | 4,0 | 10,08 | 4,67 | 5,93 | 5,67 |
| 2002 | 3,51 | 3,34 | 4,95 | 7,8 | 3,33 | 7,67 | 5,67 |
| 2003 | 2,4 | 3,6 | няма зьвестак | 10,2 | 3,6 | 7,2 | 6,7 |

# Халодны агмень філёлупаў

Лічыцца, што на філфаку вучыцца проста. Асабліва хлопцам. Ня буду аспрэчваць гэтыя тэзы, бо мушу адказваць толькі за сябе. Вучыцца сапраўды, пры прыкладаньні мінімальных намаганьняў, было няцяжка. На пачатковых курсах дзеля перапаўзаньня да далейшага «ўзроўню ведаў» дастаткова было проста своечасова зьяўляцца на іспыты. Калі большасьць дзяўчат гібела па чытальных залях над летапісамі й хронікамі XII ст., я чытаў Сартра і Разанава (за летапісы засеў значна пазьней). Ня буду прысабечваць статус галоўнага абібока й разьдзяўбая патоку — былі й горшыя, — але па вывешваньні сярэдняга атэстацыйнага балу маё прозьвішча аказалася ніжэй за сярэдзіну сьпісу.

Варта сказаць, што «адкос» ад войска ня быў самамэтай майго паступленьня на «факультэт нявест». З аповедаў тых, хто вучыўся на пачатку — у сярэдзіне 90-х, філфак уяўляўся асяродкам усяго беларускага й незаангажаванага. Зь яго выйшла пакаленьне адукаванай, нацыянальна заражанай моладзі. Хтосьці зь іх выкладае там і цяпер. «Але лёс склаўся так…»

Прыгадваецца эпізод зь першых дзён навучаньня, калі лектарка, завяршаючы ўступную прамову, патасна абвясьціла: «Дарагія калегі, філёлягі, калі ласка, *пытайцеся* размаўляць паміж сабой па-беларуску».

Пры сапраўды грунтоўнай навуковай базе, якая зь першых курсаў удзёўбвалася ў нашы галовы, вывучэньню лексычнага складу мовы, стварэньню ўласных тэкстаў (эсэ, рэцэнзій), перакладніцкай дзейнасьці надзялялася мінімум увагі. Са ста дзесяці чалавек беларускага аддзяленьня (цяпер набор паменшаны да 75) не было й дзесяці, якія «пыталіся» б размаўляць між сабой па-беларуску. Цяжка сказаць, зь якімі пачуцьцямі члены ДЭК на чале з А.Падлужным слухалі выступленьні абаронцаў дыплёмаў, калі тыя адрываліся (адхіляліся) ад падрыхтаваных рэфэратаў для падзякі й адказу на пытаньні. Ня ведаю, як завецца тая мова, але пэўна, што не беларуская.

Асьмелюся заўважыць, што сёньняшняя «сыстэма адукацыі» не далёка адышла ад сваёй саўковай папярэдніцы. На іспытах па замежнай літаратуры мне трапіўся білет, адно з пытаньняў якога патрабавала азначэньня «фантастычнага ў творах Маркеса, Борхеса і Вежынава». На якой падставе даўмеліся злучыць разам двух культавых пісьменьнікаў з баўгарскім сацрэалістам? Больш недарэчнае даводзілася чытаць у білеце хіба пры паступленьні ў аспірантуру Інстытуту літаратуры НАН РБ: «Клясавасьць і народнасьць як галоўныя рысы ў творчасьці перадавых мастакоў». No comments.

Частая тэма інтэрнэт-форумаў — элітарнасьць беларускае літаратуры. Людзі, спрычыненыя да літаратурнай творчасьці на філфаку, таксама складалі гэткую «элітарную» (г.зн. амаль нікому не вядомую) суполку. Прэзэнтацыі чарговага нумару літаратурнага альманаху, што намаганьнямі выкладнікаў-энтузіястаў з


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Чатыры зь дзесяці хлопцаў з майго беларускага аддзяленьня расчаравана пакінулі яго. Але цяпер, калі з праграмы выкідаюцца творы «нячэсных» аўтараў, а катэдра беларускай літаратуры далучаная да катэдры міталёгіі, тыя часы здаюцца залатымі.

расфармаванай катэдры беларускае літаратуры XX ст. выходзіць раз на год сьмешным накладам, адбываліся ў цесным коле выбраных.

Філфак расчароўваў перадусім халоднай абыякавасьцю да жывога й маладога. Чатыры хлопцы беларускага аддзяленьня (зь дзесяці) пакінулі яго на пачатковых курсах: адзін адслужыў у войску й выкладае гісторыю ў вясковай школцы, другі — выпускнік Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю — стаў прыватным прадпрымальнікам, трэці вярнуўся дапамагаць маці па гаспадарцы, чацьвёрты паступіў у іншую. Усе яны пісалі вершы ці прозу.

Цяпер, калі адбываецца «зацісканьне балтоў» у розных сфэрах гуманітарнае навукі, калі з праграмы выкідаюцца творы «неўпадабаных» аўтараў і засякаюцца дысэртацыі, калі катэдра беларускай літаратуры далучаецца да катэдры міталёгіі, мае закіды могуць падацца сьмешнымі студэнту-філёлупу. Застаецца адно цешыцца, што засьпеў яшчэ той час, калі беларускую літаратуру XX ст. вывучалі не як міты й легенды, а прозьвішчы пісьменьнікаў-эмігрантаў можна было вымаўляць уголас.

**Анатоль Івашчанка,**
сакратар Саюзу пісьменьнікаў

# Ці пачуюць коні мяса

Леанід Гаравы

**Нарада дэмакратычных кандыдатаў у дэпутаты 28 лістапада мусіць вызначыць новыя формы змаганьня за свабоду, лічаць дэмакратычныя актывісты на месцах. Далейшая імітацыя эўрапейскіх узораў палітычнай барацьбы ва ўмовах адсутнасьці дэмакратыі вядзе да правалу ў 2006 г. І пара забыцца пра падзел на левых і правых, як у свой час па-прароцку заклікаў Васіль Быкаў.**

Прайшоў месяц пасьля 17 кастрычніка. Палітолягі напісалі артыкулы, палітыкі правялі міжнародную канфэрэнцыю, партыйныя кіраўнікі пачалі агучваць пляны на будучыню з прыцэлам на 2006 г., але паранейшаму няўтульна пачуваюцца шараговыя сябры дэмакратычнага руху. Упершыню актывісты апазыцыі ўбачылі, што значыць поўнае выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу на ўсіх этапах выбарчай кампаніі, што значыць масавая фальсыфікацыя, чаго варта назіраньне ва ўмовах прававога бязьмежжа і поўнай падпарадкаванасьці выбарчых камісій выканаўчай уладзе.

Агучаная С.Шушкевічам думка, што выбары ў Беларусі нічога не вырашаюць, — адзінае, што нагадала ў гэтай кампаніі пра кіраўніка БСДГ. У асобе сп.Шушкевіча адлюстраваны ўсе недахопы, супярэчнасьці, праблемы сёньняшняга дэмакратычнага руху на Беларусі. Адарванасьць партыйнага кіраўніцтва ад нізавых арганізацый, няздольнасьць весьці партыйнай жыцьцё згодна з дэмакратычнымі прынцыпамі, ігнараваньне думкі партыйнай меншасьці, звышупэўненасьць лідэраў партый у сваёй беспамылковасьці сталі хранічнымі хваробамі сярод кіраўнікоў розных кааліцый і рухаў.

Ведама, што коней на пераправе не мяняюць, але на большасьці такіх партыйных конікаў пераправу і не адолець, а магчымасьць стаць тапельцамі найвялікшая. І таму, перш чым будаваць пляны на будучыню, нам трэба рэалістычна ацэньваць сытуацыю ў дэмакратычным асяродку. Я прачытаў дзясяткі камэнтароў партыйных лідэраў пасьля рэфэрэндуму і не адчуў іхнага клопату пра шараговых сяброў дэмакратычнага руху, якія сталі гарматным мясам у кампаніі 2004 г., у сытуацыі, калі ў краіне ўведзеная кантрактная сыстэма і ігнаруюцца нормы канстытуцыйнага, выбарчага права. Сярод маіх аднадумцаў самай моцнай рэакцыяй на масавыя фальсыфікацыі стала думка аб немэтазгоднасьці ўдзелу ў барацьбе бяз правілаў, аб неабходнасьці пошуку новых формаў супраціву.

Імкненьне дзейнічаць па ўзорах эўрапейскай дэмакратыі вядзе дэмакратычныя сілы да правалу ў 2006 г. Моц адміністрацыйнага рэсурсу ўладаў тлумачыцца тым, што яны закансэрвавалі ў дзіцячым узросьце палітычную сьвядомасьць нацыі. Калі нашы суседзі — расейцы, украінцы — за дзесяцігодзьдзе правялі 6—8 паўнавартасных выбарчых кампаній па больш-менш дэмакратычных стандартах, разьвіўшы шматпартыйнасьць, захаваўшы адносны плюралізм СМІ, то палітычная культура беларускага электарату нізкая.

Паразы будуць працягвацца, пакуль большасьць нас ня скажа кіраўнікам сваіх партый: «Хопіць езьдзіць за мяжу. Едзьце лепей у Лоеў, Лельчыцы, Лёзна. Сустрэньцеся не з актывістамі, а з шараговымі выбаршчыкамі. А з актывістамі праявіце сапраўдную салідарнасьць. Мы тыя, каго прыручыла дэмакратыя, а ўвагу адчуваем, калі патрэбна гарматнае мяса».

Шмат чаго трэба мяняць у дэмакратычным асяродку. 28 лістапада можа стаць пачаткам зьменаў. Але да гэтага трэба ісьці праз дэмакратычную дыскусію на Беларусі і ні ў якім разе не за яе межамі. І яе трэба весьці без усялякага падзелу на левых і правых, пра што ў свой час па-прароцку нагадваў Васіль Быкаў, які сэрцам адчуваў хібы дэмакратычнага руху ў Беларусі.

Пачаткам нашых кансалідаваных дзеяньняў можа стаць Пакт салідарнасьці, які заключыць кожны экс-кандыдат са сваёй камандай з мэтай узаемападтрымкі пры далейшых рэпрэсіўных дзеяньнях уладаў. Шараговыя актывісты дэмакратыі павінны ведаць і адчуваць, што дэмакратычныя правадыры не пакінуць іх сам-насам з усімі праблемамі пры супрацьстаяньні бюракратычнай сыстэме. Толькі пры гэтай умове ў 2006 г. выйдзе штосьці вартае.

**Леанід Гаравы — дэпутат Гарадоцкага райсавету**

## Паўстаньне беларусаў у Тэміртаў

**45 гадоў назад у далёкім Казахстане адбыліся падзеі, якія паламалі жыцьцё не адной сотні нашых землякоў. Гаворка ідзе пра паўстаньне моладзі ў Тэміртаў. Пра той выпадак мала хто ведаў тады, мала хто ведае і сёньня, а між тым, падзея заслугоўвае ўвагі. Адгукніцеся, удзельнікі паўстаньня!**

Тэміртаў — казахскі горад недалёка ад Караганды, у палатачным лягеры каля якога пражывалі некалькі тысяч чалавек, што працавалі на будоўлі Карагандзінскага мэталюргічнага камбінату. Большасьць насельніцтва лягеру складала моладзь зь Беларусі і Украіны. Акрамя таго, тут працавалі выхадцы з Баўгарыі, Румыніі, Польшчы. У параўнаньні з апошнімі, нашы землякі адчувалі сябе грамадзянамі другога гатунку, бо атрымлівалі меншы заробак. Да таго ж моладзь была нездаволена кепскімі жыльлёвымі ўмовамі і нястачай харчоў. Агульная сталоўка ў суботу вечарам і ў нядзелю не працавала. Нездаволенасьць урэшце вылілася ў стыхійны бунт.

Увечары ў суботу 3 кастрычніка 1959 г. каля 50-ці галодных юнакоў сабраліся ля дзьвярэй зачыненай сталоўкі і ў знак пратэсту падпалілі яе. Затым натоўп накіраваўся на рынак. Прадукты адбіралі ў гандляроў і тут жа дзялілі паміж сабой. Спроба міліцыі спыніць беспарадкі посьпеху ня мела. Хлопцы пачалі будаваць барыкады і закідаць міліцыю каменьнем. На наступны дзень хваляваньні працягваліся. Мясцовыя ўлады выклікалі з Караганды войскі для заспакаеньня моладзі, але тыя трапілі ў засаду. Тры грузавікі з жаўнерамі былі захопленыя, а ў паўстанцаў зьявілася зброя.

Падзеі вельмі хутка выйшлі за рамкі «галоднага бунту». Захоп і разьмеркаваньне зброі сьведчыць пра тое, што ў паўстанцаў існавалі кіраўнічыя органы. Усю ноч з 4 на 5 кастрычніка з Алма-Аты, Акмолінскy і Балхашу да Тэміртаў падцягваліся войскі. На месца падзей вылецеў першы сакратар ЦК кампартыі Казахстану Бяляеў, які загадаў не шкадаваць патронаў. Раніцай у панядзелак у горадзе пачаўся сапраўдны бой. З трох тысяч чалавек, якія прынялі ўдзел у хваляваньнях, каля сотні былі забіты і блізу тысячы параненыя.

Пры канцы месяца за зачыненымі дзьвярыма адбыўся судовы працэс над кіраўнікамі паўстаньня. Двум зь іх быў вынесены сьмяротны прысуд, двое атрымалі дзесяць гадоў зьняволеньня, трое — пяць гадоў. Але і заробкі ў Тэміртаў павялічыліся, а давоз прадуктаў палепшыўся. Бяляеў неўзабаве быў зьняты з пасады.

Падзеі ў Тэміртаў так і застаюцца таямніцай. Хто кіраваў выступленьнем? Як склаўся далейшы лёс яго ўдзельнікаў? На гэтыя пытаньні няма адказу. Яшчэ, пэўна, жывуць у Беларусі і Казахстане сьведкі тых падзей. Можа, хто зь іх адгукнецца і праале сьвятло на гэтую невядомую старонку нашай гісторыі.

Аўтар будзе ўдзячны за любую інфармацыю. Адрас захоўваецца ў Рэдакцыі.

**Дзяніс Каліна, Клецак**

## Два беларускія словы

На нядаўна прэзэнтаваным сайце Віцебскага гарвыканкаму (gorod.vitebsk.by) толькі два беларускія словы — «Віцебск» у шапцы і назва беларускага тэатру «Лялька» ў пераліку культурных установаў гораду. Улады і аўтары сайту з дызайн-студыі «Прамэтэй» не заўважылі супярэчнасьці з прыведзенай на адной са старонак статыстыкай: 77% віцебскага насельніцтва складаюць беларусы. Удвая болей беларускіх слоў на сайце Віцебскага аблвыканкаму: тут па-беларуску напісана яшчэ назва абласной адміністрацыі.

**Міхал Чарвінскі, Віцебск**

# ВОДГУКІ

## Аб прэміі Юхнаўца

Прэмія Янкі Юхнаўца — гэта спроба зьвярнуць увагу чытача на здольнага літаратара. Гэта і падтрымка гэтага літаратара духоўна, калі ён пачынае разумець, што ягонsocialі творы цікавяць некага іншага. Таму зьяўленьне гэтай прэміі было струменем жыватворнага кісларода для пішучых і для чытачоўх. Што ж у выніку мы атрымалі? Скорагаворкай прамоўленыя словы, што нехта Макс Шчур з Прагі за свой раман «Там, дзе нас няма» атрымаў гэную прэмію. І што другую прэмію заслужыў 12-гадовы паэт за верш «Крэда». І што адзін сябар конкурсу быў за іншага аўтара.

Мне гэтай інфармацыі мала. Я хачу ведаць, хто такі Макс Шчур? Малады юнак? Сталы чалавек? Адкуль ён родам? Пра што ягоны раман?

А паэт са сваім вершам «Крэда» — хто ён? А ці можна прачытаць ягоны верш на старонках Інтэрнэту ці «Нашай Нівы»? За каго быў той адзіны член журы, які быў за нейкага іншага аўтара? Хто гэты аўтар? Чым ён уразіў гэнага пятага члена журы? Хто яшчэ спадабаўся сябрам журы з прысланых аўтараў?

Прэмія — гэта спроба хоць нейкім чынам запоўніць той вакуўм, які стварылі нашы крытыкі і аналітыкі вакол нашых сучасных аўтараў, што працуюць у літаратуры. У выніку шырокая публіка ня ведае ні саміх крытыкаў, ні новых аўтараў. Жыцьцё бяжыць само па сабе, а літаратары жывуць самі па сабе.

У наш дзівосны, незвычайны, ні да чога ў папярэдняй гісторыі не падобны час дзесьці побач з намі жыве, ходзіць, дыхае новы Міцкевіч, ці Багдановіч, ці Купала. Яму (ім) трэба дапамагчы, стварыць грунт, падрыхтаваць глебу, працягнуць руку, зычлівa, шчыра, ласкава і ўзьнёсла падтрымаць першыя парасткі таленту. Дзеля гэтага і патрэбны прэміі.

Ці ня так, шаноўныя спадарове?!

**Кастусь Травень, Ворша**

## Пра гутарку з Вугляніцам

Гутарка мяне, мякка кажучы, абразіла. Абразіла таму, што мяне, 35-гадовага мужыка, абазвалі падлеткам. А гэтыя «падлеткі», рызыкуючы жыцьцём, баранілі і бароняць Бацькаўшчыну (у тым ліку вашага «пісьменьніка»). Гэтыя падлеткі ахвяравалі здароўем. Гэтыя «падлеткі» зрабілі ўсё, каб Беларусь была вольнаю, і ня іх віна, што, наклаўшы ў порткі, у вырашальны час палітыкі разьбегліся па сваіх катэджах ды віленскіх кватэрах.

Прыйдзе час, калі кожны адкажа за свае словы, свае ўчынкі, за тое, што зрабіў і чаго не зрабіў, а мог бы зрабіць.

**Воюш, Берасьце**

## Прыкрая памылка

Дарагія сябры!

У №11 паважанага мной часопісу «Дзеяслоў» надрукаваны пераклад часткі маіх успамінаў, узятых з кнігі «Негаснущие зарева», — «Што было, тое — было». Прачытаўшы яго, я знайшоў сур'ёзную нагоду для суму.

Хутчэй за ўсё, гэта неахайнасьць перакладчыка. У мяне ў кнізе на с.271 надрукавана: Адамовіч «искренне полагал, что Эйдельман некоторым образом «спровоцировал» его (Астафьева) на резкие и не всегда продуманные ответы. Запомнилось: «Инерция русского крестьянского мышления… атавизм… Нет, не злобное убеждение, как у оголтелого Белова. Другое…».

У публікацыі ж на с.170 чытаю: «Запомнілася: «Інэрцыя расейскага сялянскага мысьленьня… атавізм… Не, ня злоснае перакананьне, як у апантанага Бярозкіна. Іншае…».

Бог мой, адкуль гэта? Прыкрая памылка, якая ператварае Рыгора Саламонавіча ў… антысэміта, якая прыпісвае Алесю Адамовічу ацэнкі, неймаверныя ў яго вуснах, якая выстаўляе мяне, што нібыта прыгадвае іх! Уважлівыя чытачы, несумненна, заўважаць гэта і будуць нямала зьдзіўленыя. Тым больш што ўсе іншыя мае ўспаміны пра Р. Бярозкіна, надрукаваныя ніжэй, носяць зусім іншы — сяброўскі і паважлівы — характар.

Спадзяюся, што гэты ліст ня толькі выправіць недаравальную памылку, але і паставіць усё на свае месцы.

**Аляксандар Дракахруст**

# ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Мінінфармацыі 8 лістапада вынесла папярэджаньне ТДА **«Прэс-сэрвіс»** — заснавальніку газэты «Курьер из Борисова» за парушэньне Закону аб друку. У Слуцку 10 лістапада звольнілі з працы старшыню філіі БСДП (НГ) **Анатоля Балакіра**, які балятаваўся ў палату прадстаўнікоў. Гэта адбылося... на наступны дзень пасьля таго, як ён уладкаваўся на працу. **Валер Шчукін** 11 лістапада атрымаў папярэджаньне ад адміністрацыйнай камісіі Першамайскага раёну Віцебску за распаўсюд улётак. 11 лістапада звольнены з працы навуковы супрацоўнік Барысаўскага краязнаўчага музэю **Валер Раховіч**, які надрукаваў у газэце «Гоман Барысаўшчыны» сэрыю артыкулаў пра мясцовае падпольле ў час фашысцкай акупацыі. 12 лістапада Вышэйшы гаспадарчы суд адмяніў загад Мінінфармацыі пра прыпыненьне на 3 месяцы выхаду газэты **«Время»**. Кіраўніка грамадзкага аб'яднаньня прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» **Анатоля Шумчанку** 11 лістапада выклікалі ў Менскі гараддзел міліцыі для тлумачэньняў, навошта ён набываў шматтысячны наклад кнігі «Выпадковы прэзыдэнт». 11 лістапада касацыйная калегія Менскага гарсуду адмовіла ў задавальненьні пазову **Міхаілу Землякову**: ён патрабаваў, каб КДБ вярнула канфіскаваныя ў ягонага сына ў 2001 г. рэчы. Адміністрацыйная камісія Маскоўскага раёну Менску 11 лістапада аштрафавала на 5 базавых велічынь **Гары Паганяйлу** за распаўсюджваньне дакладу Х.Пургурыдэса аб зьніклых палітыках Беларусі і магчымай датычнасьці шэрагу высокіх дзяржаўных асобаў Беларусі да цяжкіх злачынстваў. У Баранавічах судовыя выканаўцы 11 лістапада апісалі відэамагнітафон і тэлевізар у бацькоў актывісткі «Зубра» **Марыі Гамбецкай**, аштрафаванай на 30 б.в., 15-га яна выплаціла штраф. Гаспадарчы суд Берасьцейскай вобласьці 11 лістапада задаволіў пазоў «Палесьсеэлектрамашу» да газэты **«Брестский курьер»**: кіраўніцтва прадпрыемства палічыла непраўдзівым артыкул і, не задаволіўшыся надрукаванымі пярэчаньнямі дырэктара, падало пазоў пра абарону дзелавой рэпутацыі. Вярхоўны суд 12 лістапада прызнаў абгрунтаваным рашэньне Мінюсту аб нерэгістрацыі **Партыі свабоды й прагрэсу**. 12 лістапада зь **Міхаіла Марыніча** паводле амністыі зьнялі абвінавачаньне па ч.1 і ч.2 арт.377 КК (выкраданьне ці пашкоджаньне дакумэнтаў, штампаў, пячатак). У Жлобіне 12 лістапада штрафам 5 б.в. суд пакараў актывіста АГП **Пятра Мірашнічэнку** за набраны на кампутары артыкул. Уначы з 13 на 14 лістапада невядомыя спрабавалі ўварвацца ў кватэру **Алеся Абрамовіча**, праваабаронцы з Барысава. У Ваўкавыску галадоўніца **Валянціна Салдатава**, хворая на цукровы дыябэт, 15 лістапада была шпіталізаваная. На трое сутак арышту асуджаны 15 лістапада ў Горках актывіст БСДГ **Дзям'ян Франкоўскі** за распаўсюджваньне ўлётак.

**АШ**

# НОВЫЯ КНІГІ

**Маракоў Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794—1991**: Энцыкляпэдычны даведнік: Т 3. Кн 1. Абакановіч — Кучынская. — Менск: Athenaeum, 2004. — 532 с. 50 ас.

3-і том зьмяшчае бібліяграфіі рэпрэсаваных беларускіх дзеячоў, зьвесткі і факты пра якіх на час выхаду першых двух тамоў не былі ўдакладнены і сістэматызаваны або былі адшуканы ў апошні момант, а таксама папраўкі і ўдакладненьні да пэрсаналій 1-га і 2-га тамоў.

**Надсан А. Магдалена Радзівіл і грэка-каталіцкая царква ў Беларусі.** Выданьне другое, дапрацаванае і дапоўненае. — Лёндан: «Божым шляхам», 2004. — 71 с.

Аўтар аналізуе ўнёсак Магдалены Радзівіл (1861—1945) у нацыянальна-рэлігійнае адраджэньне Беларусі і пралівае сьвятло на гісторыю нязьдзейсьненага праекту — заснаваць грэка-каталіцкую калегію (сэмінарыю) для беларусаў у Рыме.

**Чорны К. Трэцяе пакаленьне:** Раман. — Менск: Сталія, 2004. — 288 с. 1000 ас.

**Сяргей Лескець**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.



# Сьвята Язафата

Адзначэньне ўгодкаў пакутніцкае сьмерці полацкага арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча сёлета на Віцебшчыне мела камэрны характар. Спачатку, 12 лістапада, у катэдры Сьв.Барбары ў Віцебску рыма-каталікі адслужылі ўрачыстую імшу: сьвяты Язафат — таксама патрон Віцебскае каталіцкае дыяцэзіі. А ўжо на наступны дзень угодкі сьмерці адзначалі грэка-каталікі.

Пасьля сьвяточнай літургіі ў катэдры, на беразе Дзьвіны на Ўсьпенскай горцы, дзе прыняў сьмерць сьв.Язафат, ля крыжа сьв.Эўфрасіньні Полацкай адбыўся малебен.

Грэка-каталікі да гэтага часу ня маюць свайго храму ў абласным цэнтры. З рэгістрацыяй на пачатку 90-х уніяцкае парафіі Ўваскрасеньня Хрыстовага ўскладаліся марныя спадзевы на тое, што ім перададуць адбудаваную Ўваскрасенскую царкву, яна калісь належала ўніятам. Аднак яе аддалі праваслаўным. Грэка-каталіцкія шэрагі ў Віцебску, як зрэшты і ў Беларусі, нешматлікія.

У Полацку справы лепшыя. Тут ёсьць грэка-каталіцкі манастыр Сьв.Барыса і Глеба зь невялічкай царквой Сьв.Параскевы Полацкай. Там і былі працягнутыя ўрачыстасьці. Напачатку, увечары 13 лістапада была адслужана сьвяточная вячэрня, потым адбылося начное малітоўнае чуваньне, якое правёў ігумен манастыра ераманах Лявонці Тумоўскі.

На наступны дзень у царкве Сьв. Параскевы прайшло галоўнае сьвята. Да полацкіх грэка-каталікоў прыехалі госьці зь Віцебску і Менску, былі таксама прадстаўнікі грэка-каталіцкага духавенства з Украіны і Расеі, а таксама армянскі каталіцкі дыякан.

Для беларускай гісторыі Язафат Кунцэвіч — супярэчлівая асоба. Для каталікоў усходняга абраду ён — сьведка адзінства ўсходніх хрысьціян з Апостальскай Сталіцай. А вось для праваслаўных няма больш непрымальнай асобы ў гісторыі хрысьціянства на нашых землях. Усё сваё жыцьцё Язафат Кунцэвіч аддаў справе аднаўленьня адзінства хрысьціянства. Тым ня менш, як і за ягоным часам, хрысьціяне ў Беларусі застаюцца падзеленыя, і падзел гэты нават большы, чым у 1623 г., калі Кунцэвіч быў забіты.

**Алесь Трафіменка.**
**Фота аўтара.**

# Пакараньне пасьля выбараў

Мінулі выбары, і ў Баранавічах за адным сьвістам пачаліся непрыемнасьці ў кандыдатаў у дэпутаты ад дэмакратычных партый.

Аляксандра Долмата, кандыдата ў дэпутаты ад Народнай грамады, намесьніка дырэктара швейнай фабрыкі, адразу пасьля выбараў, 18 кастрычніка, прымусілі напісаць заяву на звальненьне.

Кандыдата ад ПКБ Аляксандра Галькевіча аштрафавалі на 190 тысяч рублёў за парушэньне падатковага заканадаўства. Доктар і пісьменьнік Галькевіч, як выявілася, не даплаціў у бюджэт 18830 рублёў. З 1999 г. баранавіцкая мэдвучэльня набыла ў яго 13 ягоных кніжак за 58 тысяч. Перад выбарамі гэтую дадатковую крыніцу прыбытку органы выявілі, за што кандыдата і ўкаралі.

Як пісала ўжо «НН», яшчэ раней непрыемнасьці былі ў прэтэндэнта ў кандыдаты ад БНФ «Адраджэньне», прадпрымальніка Віктара Мязяка, якога за хібы з падаткамі пакаралі на значную суму дый не зарэгістравалі.

Ціск на людзей працягваецца. На гэтым тыдні ў мясцовы офіс партыі БНФ прыйшла адна зь сяброваК КХП і сьлёзна прасіла даць ёй даведку, што яна не зьяўляецца чальцом БНФ «Адраджэньне», — на працы прымусілі, бо не разьбіраецца начальства ў палітычных акалічнасьцях…

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Ворша-2020

Пачалася распрацоўка новага генэральнага пляну разьвіцьця Воршы да 2020 г. У старым (1980 г.) упор рабіўся на жыльлёвае будаўніцтва ў мікрараёнах. У новым — на рэканструкцыю інфраструктуры. Вакол Воршы плянуецца стварыць зялёнае кольца. На абслугоўваньне цяплом з Аршанскай ЦЭЦ будуць пераведзены ўсе раёны гораду, плянуецца пабудаваць і станцыі абезжалезваньня вады. На плян выдаткавана зь бюджэту краіны 200 млн рублёў.

## Лыжкі замест ложкаў

У Аршанскім ізалятары часовага ўтрыманьня на тым тыдні ад чэрапна-мазгавой траўмы памёр чалавек. Небясьпечныя здарэньні тут ня рэдкасьць. Ізалятар ня мае элемэнтарных умоў для ўтрыманьня людзей. У памяшканьнях на 40 чалавек — удвая болей. Дарослыя сядзяць зь непаўналетнімі, што забаронена. Няма дворыку для шпацыру, прыбіральні, не хапае мыек і д.т.п. Колькі ні пісалі ў высокія інстанцыі — зрухаў няма. Адно затрыманым дазволілі есьці нармальнымі лыжкамі. Раней яны карысталіся лыжкамі бяз тронкаў.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Разьліўная «Верасок»

12 гандлёвых пунктаў, якія прадаюць моцныя сьпіртныя напоі (два зь іх працуюць уначы) разьмешчаны на 500-мэтровым участку галоўнай вуліцы Круглага — Савецкай. Тут жа знаходзіцца піўныя кіёскі. Нават у дзіцячай кавярні «Верасок» можна набыць моцныя напоі на разьліў, хоць разважное марозіва бывае не заўсёды. Продажам марозіва мясцовага бюджэту не папоўніш, а пітушчыя людзі прыносяць адчувальны прыбытак.

**Зінаіда Мілешчанка, Круглае**

## Райвыканкам пазалаціў купалы

Сабор Сьвятой Тройцы стаў пераможцам конкурсу Хоцімскага райвыканкаму на выкананьне раённай праграмы добраўпарадкаваньня і навядзеньня парадку на зямлі за 2004 г. Царква і яе настаяцель айцец Кірыл атрымалі прэмію ў памеры 20 базавых велічынь, якую вырашана накіраваць на пазалоту купалоў. Тэрыторыя сабору ўжо шмат гадоў самая яркая і квітнеючая мясціна ў райцэнтры. Айцец Кірыл вырошчвае ў цяпліцы кветкавую расаду, якой хапае і на гарадзкія клюмбы.

**Паводле матэрыялаў «Region.mogilev.by»**

## Юбілей Куніцкага

11 лістапада ў бібліятэцы полацкага мікрараёну Марыненка адбылася прэзэнтацыя зборніка паэзіі Зьмітрака Куніцкага «Ў цянётах часу». Гэта трэцяя кніга аднаго з найстарэйшых сяброў літаб'яднаньня «Наддзьвіньне». Вечарына была прымеркаваная да 75-годзьдзя паэта. Работнікі культуры арганізавалі фотавыставу «Ў гасьцях у юбіляра», выдалі буклет. На вечарыне гучалі й песьні. Музыку на вершы З.Куніцкага пісаў у свой час кампазытар Мікола Пятрэнка, аўтар неўміручых «Ручнікоў».

**Васіль Кроква, Полацак**

## Танку сяброўка

Напярэдадні 60-годзьдзя перамогі над нацыстамі да клясычнага мілітарнага гомельскага помніка танку «Т-34» далучыцца самаходная ўстаноўка «ІСУ-152». Работы на плошчы Перамогі даюць падставу меркаваць, што стане «ІСУ» сьпінай да абласной бібліятэкі і перадам да выканкаму Чыгуначнага раёну. Сёлета ў Гомелі запрацаваў ужо музэй баявой тэхнікі.

## Чорная памежная паласа

Нядаўна лютую сьмерць дастаў малады кантрактнік: два зь лішкам дзясяткі разоў яго пырнуў нажом выпадковы запляшнік. Трохі раней (улетку) ад высьпятку тынінай па галаве памёр іншы памежнік, які быў замяшаўся ў сварку-гамарню мужыка й жонкі.

## Зьмянілі Карла на Фёдара

Добрускія ўлады пераназвалі вуліцу Карла Маркса ў вуліцу Фёдара Паскевіча. Улетку ў Добрушы зьявіўся помнік апошняму. Гомельшчына пазбаўляецца камуністычнай тапаніміі, але напаўняецца імпэрска-расейскай.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## Міліцыя правакуе на хабарніцтва

Колькасьць выпадкаў хабарніцтва на Віцебшчыне выбухова расьце. Усяго іх выкрыта сёлета 190. Сярод аплачваных такім чынам паслуг — выдача бальнічных лісткоў, забесьпячэньне месца ў інтэрнаце, прыём на бясплатнае навучаньне, перамога ў тэндэры, магчымасьць прадаць дзяржаве тавар. Сярэдняя сума хабару складае 100—150 даляраў. Дзеля выяўленьня «хворых на хабарніцтва» віцебская міліцыя ўсё часьцей карыстаецца правакацыяй, якая афіцыйна завецца «апэратыўным экспэрымэнтам» і забароненая паўсюль у сьвеце за выняткам Беларусі.

## Магчымы Кувэйт

На адлегласьці 50 км ад Віцебску закладзена сьвідравіна, якая мусіць пацьвердзіць ці абвергнуць меркаваньне геолягаў пра наяўнасьць у тутэйшых нетрах на глыбіні 2 км нафты і газу. Сьвідраваньне праводзіцца адмысловай брыгадай упраўленьня «Белгеалёгія», кошт яго складзе каля 1,5 млрд рублёў.

**Міхал Чарвінскі, Віцебск**

НА ПРАВАХ РЭКЛЯМЫ

## Адукацыя Польшчы пасьля Эўразьвязу

Эўразьвяз ня ўмешваецца ў палітыку паасобных краінаў у галіне адукацыйных сыстэмаў і навучальных праграмаў. Супольная палітыка ЭЗ у галіне адукацыі зводзіцца да падтрымкі разьвіцьця навучаньня, распаўсюджваньня моваў ЭЗ, абмену студэнтамі і досьведам.

У ліпені Эўракамісія прыняла шэраг новых праграм падтрымкі моладзі, адукацыі, культуры і СМІ ў 2007—2013 г.

У Польшчы пачала працу эўразьвязаўская праграма для ВНУ «Erasmus Mundus». Галоўная мэта праграмы — разьвіцьцё міжнароднага супрацоўніцтва паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, прыцягненьне студэнтаў з усяго сьвету на вучобу ў Эўропу. Сёлета толькі 19 адукацыйных праектаў атрымалі знак якасьці «Erasmus Mundus», а да 2008 г. павінна быць створана каля 100 адукацыйных праектаў.

У рамках праграмы «Erasmus Mundus» дыплём магістра могуць атрымаць асобы, якія маюць ужо дыплём інжынэра альбо бакаляўра. Навучаньне доўжыцца 1—2 гады. Пасьля заканчэньня студэнт павінен атрымаць сама меней двайны дыплём, і гэта дазваляе яму выйсьці на рынак працы як мінімум дзьвюх краінаў.

Летась аніводны польскай навучальнай установе не ўдалося атрымаць знаку «Erasmus Mundus». Праграма прызначана для моладзі з трэціх краін, студэнты з Эўропы змогуць атрымаць грант толькі на вучобу ў краіне, якая не зьяўляецца чальцом Эўразьвязу.

Адным з наступстваў далучэньня Польшчы да Эўразьвязу зьяўляецца свабода перамяшчэньня асобаў на яго тэрыторыі. Заходнія ВНУ прыцягваюць да сябе маладых здольных палякаў. Паводле слоў прафэсара Ежы Дамбчыньскага, рэктара Політэхнічнай акадэміі з Познані, у Эўропе не хапае інжынэраў і абітурыентаў на політэхнічныя факультэты. З гэтым у Польшчы пакуль няма праблемы.

Зьвязу эміграцыі будучых польскіх навукоўцаў спыніць пашыраная стыпэндыйная сыстэма. З кастрычніка гэты від дапамогі могуць атрымаць студэнты ня толькі стацыянарнай формы навучаньня, але і вячэрняй, завочнай ды экстэрнату, а таксама асобы, якія вучацца ў прыватных школах. На стыпэндыі могуць разьлічваць юнакі і дзяўчаты зь сем'яў, у якіх даход на чалавека не перавышае 569 злотых (168 даляраў).

Студэнты па-рознаму ацэньваюць новую стыпэндыйную сыстэму. Адны мяркуюць, што калі нехта выбірае недзяржаўную ВНУ, значыць, ён можа сабе дазволіць такую форму вучобы і не павінен мець права на сацыяльную дапамогу. Паводле меркаваньня другіх, кожны павінен мець шанец на стыпэндыю.

У рамках сваёй сыстэмы палякі таксама могуць карыстацца сродкамі з эўразьвязаўскіх фондаў. 123 тысячы вучняў сярэдніх школ і каля 15 тысяч студэнтаў, якія паходзяць зь вясковых мясцовасьцяў або невялікіх гарадоў, атрымаюць стыпэндыі, фінансаваныя зь бюджэту ЭЗ. У 2004—2006 г. Эўрапейскі сацыяльны фонд ды дзяржаўны бюджэт выдзеляць на гэтую мэту каля 176 млн эўра. Грошы паспрыяюць зраўнаньню шанцаў вясковай моладзі на атрыманьне адукацыі.

Максымальная сума дапамогі на вучня складае 250 злотых у месяц ($74) і каля 350 злотых для студэнтаў. Стыпэндыі могуць выдаткоўвацца на пражываньне, харчаваньне, праезд, закупку падручнікаў, а таксама на аплату вучобы ў ВНУ й сярэдніх школах.

У 2005 г. упершыню польская моладзь будзе здаваць экзамэн на атэстат сталасьці паводле новых прынцыпаў. На заканчэньне сярэдняй школы вучні будуць трымаць тры абавязковых экзамэны: па польскай мове (вусна й пісьмова), па замежнай мове (вусна й пісьмова), а таксама ў вуснай форме па адным з прадметаў на выбар. Выпускнікі сярэдніх школ з мовай навучаньня нацыянальнай меншасьці павінны здаваць экзамэн па сваёй мове ў вуснай і пісьмовай форме. Апрача таго, выпускнік можа здаваць экзамэн па дадатковых прадметах — замежнай мове (вусна й пісьмова), мове нацыянальнай меншасьці (пісьмова, вусна ці ў абедзьвюх формах) або пісьмова па прадметах з групы абавязковых, якіх ён ня выбраў на абавязковай частцы экзамэнаў.

Нягледзячы на тое, што няма адзінай эўразьвязаўскай палітыкі ў галіне адукацыі, большая мабільнасьць грамадзтва, у тым ліку моладзі і студэнтаў, раней ці пазьней спрыяніцца да максымальнага пашырэньня супрацоўніцтва паміж сыстэмамі навучаньня паасобных краінаў.

**Паводле радыё «Палёнія»**
http://www.radio.com.pl/polonia

# Вольскага не пусьцілі ў ЗША

Першым неўязным у ЗША пасьля прыняцьця «Акту аб дэмакратыі ў Беларусі» стаў легендарны рок-музыка: візавы аддзел пасольства ЗША адмовіў Лявону Вольскаму ў візе.

Рок-музыка хацеў трапіць у ЗША, каб 7 сьнежня ў гарадку Рэгабот-Біч, штат Дэлавэр, даць дабрачынны канцэрт для амэрыканцаў беларускага паходжаньня.

Прычын адмовы ў візе музыку не сказалі: такая сусьветная практыка. Не ўдалося даведацца пра прычыны й карэспандэнту «НН»: супрацоўніца візавага аддзелу пасольства патлумачыла, што ня мае права даваць камэнтары. Сам Лявон тлумачыць магчымыя прычыны адмовы моўнымі праблемамі: «Я ня дужа добра ведаю ангельскую. Супрацоўніца консульскай службы кепска валодала наагул славянскімі мовамі. Яна, відаць, падумала, што я еду даваць камэрцыйны канцэрт».

**Адам Воршыч**

# Няшэранькі Ваўчок

**20 лістапада ў Лілехамэры (Нарвэгія) адбудзецца дзіцячы конкурс песьні «Эўрабачаньне-2004». Беларусь на ім прадстаўляе семіклясьнік мазырскай СШ №21 Ягор Ваўчок зь песьняй «Сьпявайце са мною» (аўтарка словаў васьмікласьніца мазырскай СШ №4 Улада Сусьленка). 15 лістапада разам зь Ягорам у Нарвэгію выправілася маці — Надзея Мікалаеўна, а таксама група балерын зь Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжу, што ўдзельнічае ў конкурсным нумары. Ягор вучыцца граць на клярнэце, але на канцэрце ён граць ня будзе — толькі сьпяваць. Па Першым нацыянальным тэлеканале канцэрт у жывой трансьляцыі пакажуць у 21.15. На фота: Ягор з настаўнікам, Васілём Раінчыкам.**



АЛЯКСАНДАР АКНАТОП

## Слуцкі збройны чын

**27 лістапада** а 14-й ад сядзібы Партыі БНФ ад'едзе аўтобус з наведнікамі месцаў баёў. Чакаецца, што ў адным з такіх месцаў будзе ўсКладзены вянок ад Партыі БНФ. А вось пляняваныя мітынг і канцэрт у Слуцку не адбудуцца — улады забаранілі.

## Турнір па сквошы

2-гі клюбны рэйтынгавы турнір па сквошы адбудзецца **20—21 лістапада** (субота і нядзеля) у «Orange Club» (зав.Калініна, 16). Галоўны судзьдзя — Дзьмітры Судзілоўскі. Прафэсійныя гульцы ня ўдзельнічаюць. Рэгістрацыйны ўнёсак 40 тыс. рублёў. Апошні тэрмін падачы заяўкі: 18 лістапада (да 15.00). Т.: 285-66-65, 674-66-65, 762-66-65, 405-66-65

## Турыстычны зьлёт

**З 19 да 21 лістапада** на турбазе трактарнага заводу (Раўбічы) пройдзе турыстычны зьлёт вэтэранаў турызму. Т.: 281-27-83, 251-87-54.

## Віктар Шалкевіч

**27 лістапада** ў Палацы культуры вэтэранаў (Я.Купалы, 21) адбудзецца вялікі сольны канцэрт барда і актора Віктара Шалкевіча. Кошт квіткоў ад 5 да 8 тыс. Пачатак — 19.00.

**«Агата Кристи»**
**19** (пт), 19.00 — канцэрт «Агаты Кристи» ў к/з «Менск».

## Тэатры

**Опэра**
**18** (чц) — «Пікавая дама» .
**20** (сб) — «Вясельле Фігара».
**23** (аўт) — «Травіята».
**25** (чц) — «Іялянта».
**27** (сб) — «Трубадур».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**19** (пт), **20** (сб) — «Валянціна».
**21** (ндз), **27** (сб) — «Адэль».
**23** (аўт) — «Містэр Розыгрыш».
**24** (ср) — «Чорны квадрат».
**25** (чц) — «Песьні ваўка».
**26** (пт) — «Адвечная песьня».
**28** (ндз) — «Понцій Пілят».

**Купалаўскі тэатар**
**18** (чц) — «Тутэйшыя».
**19** (пт) — «Ромул Вялікі».
**20** (сб), **21** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**22** (пн) — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**Ранішія спэктаклі**
**21** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».
**28** (ндз) — «Паўлінка».
**Малая сцэна**
**19** (пт), **28** (ндз) — «Баляда пра каханьне».
**20** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**22** (пн) — «Налу».

**На сцэне Купалаўскага тэатру**
**Гастролі драматычнага тэатру імя Івана Франка**
**24** (ср) — «За двума зайцамі».
**25** (чц), **28** (ндз) — «Тэўе-Тэвэль».
**26** (пт) — «Рэвізор».
**27** (сб) — «Швэйк».
**Малая сцэна**
**26** (пт) — «Зачараваная Дзясна».
**27** (сб) — «Увэрцюра да спатканьня».

## Выставы

**«Гандальэкспа-2004»**
**Да 19 лістапада** на Я.Купалы, 27 працуе 10-я Юбілейная міжнародная спэцыялізаваная гуртовая выстава-кірмаш «Гандальэкспа-2004».

**«Турбізнэс-2004»**
**З 24 да 27 лістапада** на Я.Купалы, 27 адбудзецца 11-я міжнародная спэцыялізаваная выстава «Турбізнэс-2004».

**«З клясыкі беларускага мастацтва»**
Мастацкая галерэя «Ля-Сандр-Арт» (вул.Раманаўская Слабада, 24) запрашае на выставу «З клясыкі беларускага мастацтва». Творы Віталя Цьвіркі, Івана Ахрэмчыка, Мая Данцыга, Барыса Няпомнящага ды іншых. Выстава працуе **да 11 сьнежня**.

**З прыватнай калекцыі Ксяневіча**
**Да 1 сьнежня** ў гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава твораў з прыватнай калекцыі Яўгена Ксяневіча. Уваход вольны.

**Калекцыі Радзівілаў у Мастацкім музэі**
**Да 5 студзеня** Нацыянальны мастацкі музэй запрашае на выставу «Нясьвіскія калекцыі Радзівілаў». Квіткі — 2000.

**Палескія краявіды**
У Музэі гісторыі беларускай літаратуры **да 30 лістапада** працуе выстава «Палескія краявіды», на якой можна будзе ўбачыць работы мастака Аляксандра Харашуна.

**Фотамантажы**
**Да 20 лістапада** ў Доме фота (вул.Мясьнікова, 78) працуе выстава работ Уладзімера Качана. Экспазыцыя цалкам складаецца зь лічбавых фотамантажоў, экспэрымэнтаў з выяўленчымі магчымасьцямі мікшаваньня відарысаў. Уваход вольны.

**«Зямля і людзі»**
У Нацыянальным мастацкім музэі **да 20 лістапада** працуе выстава жывапісу Марціроса Сар'яна «Зямля і людзі».

**«Дыялёг» Марачкіных**
У гарадзкой выставачнай залі Воршы **да 14 сьнежня** працуе выстава бацькі і сына, мастакоў Марачкіных «Дыялёг». Сярод твораў — «Беларуская Джаконда», «Бычкі. На радзіме Васіля Быкава».

**Патрыярх і вучні ў Полацку**
**12 лістапада** выстава «Майстар і майстры (Г.Вашчанка і вучні)» адкрылася ў полацкай мастацкай галерэі. Пасьля паказу ў Менску мастацкі праект убачылі землякі Вашчанкі — гамельчукі. На адкрыцьцё полацкай вэрсіі прыехаў сам Гаўрыла Харытонавіч і два вучні — Сяргей Цімохаў і Алесь Ксяндзоў.

## Клюбнае жыцьцё

**Белая Вежа** (284–69–22, 239–16–00)
**18** (чц), 24.00 — «Хлапечнік-Party»: dj Grizzly, dj Tim КустOFF (Масква).
**19** (пт), 22.00 — dj Міхель.
**20** (сб), 22.00 — dj Міхель.
**21** (ндз), 22.009 — dj Alex.

**Графіці** (280–01–54)
**18** (чц), 20.00 — канцэрт Алега Разанава (г.Менск).
**19** (пт), 20.00 — гурт «Zombie zoo».
**24** (ср), 20.00 — канцэрт джаз-гурту «Apple Tea».
**25** (чц), 20.00 — канцэрт Віктара Крывашчокіна.

**Madison Club** (219–00–10)
**19** (пт), 19.00 — канцэрт «Машины времени».

**Гудвін** (226–13–06)
**18** (чц), 20.00 — жывая музыка: «N.C.»; «City Groove».
**19** (пт), 21.00 — канцэрт групы «Біплян».
**20** (сб), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джазквартэт.
**21** (ндз), 21.00 — жывая музыка.
**22** (пн), 21.00 — жывая музыка.

**Рэактар** (649–08–88, 766–24–25, 400–67–74)
**19** (пт), 18.00 — прэзэнтацыя альбому «Hard Life — Heavy Music-3» з удзелам гуртоў «Znich», «Partyzone» ды інш. Квіткі — 9000.

**Бліндаж** (219–00–10, 671–58–65)
**18** (чц), 23.00 — dj Egor.
**19** (пт), 23.00 — «Blind Rave»: dj Kubikov (Moscow), dj Noche: 8000/10000.
**21** (ндз), 23.00 — resident dj Egor.

**X-Ray** (223–93–55)
**19** (пт), 22.00 — dj Bergamo.

**Bronx** (288–60–61)
**19** (пт), 22.00 — «A Cup of Acid Jazz»: dj Genys.
**20** (сб), 22.00 — dj Bergamo.
**20** (сб), 23.00 — dj-bar.

## У менскіх кінатэатрах з 19 да 21 лістапада

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Два нулі» (прэм'ера): **19** (пт) 17.00, 19.00, 20.50; **20, 21** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 20.50.
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **20, 21** (сб, ндз) 14.00.
«Кава і цыгарэты»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (пт) 15.40, 18.50, 21.00.
«Два жыцьці Эванса Грэя»*** (4х4): **20** (сб) 16.40, 18.50, 21.00.
«Кухонныя байкі»*** (4х4): **21** (ндз) 16.40, 18.50, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні»: **19** (пт) 16.30 (іл, пд), 18.50 (іл, пд), 21.00 (пд); **20, 21** (сб, ндз) 14.00, 16.30, 18.50, 21.00 (пд).

**«Дружба»** (240-90-13)
«Нябесны капітан і сьвет будучыні»: **19** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **20** (сб) 18.00, 20.00; **21** (ндз) 20.00 (іл).
«Усё наперадзе» (МКФ «Лістапад»): **21** (ндз) 17.00 (творчая сустрэча з У.Гасьцюхіным, А.Ліванавым, М.Бурляевым).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Два нулі» (прэм'ера): **20** (сб) 15.30 (іл), 17.20, 19.10, 21.00 (пд).
«Вазьмі мяне, павязі прэч» (МКФ «Лістапад»): **21** (ндз) 15.00.
«Мой зводны брат Франкенштэйн» (МКФ «Лістапад»): **21** (ндз) 17.00.
«Дунечка» (МКФ «Лістапад»): **21** (ндз) 19.00.
«Кіроўца для Веры» (МКФ «Лістапад»): **21** (ндз) 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Два нулі» (прэм'ера): **19** (пт) 17.00 (пд), 19.00 (пд), 21.00 (пд); **20** (сб) 15.00 (іл), 17.00 (пд), 19.00 (пд), 21.00 (пд); **21** (ндз) 15.00 (пд), 17.00.
«Чумавая пятніца»: **20, 21** (сб, ндз) 13.00.
«Страсьці Хрыстовы»**** (МКФ «Лістапад»): **21** (ндз) 20.00 (сустрэча з народным артыстам Расеі М.Бурляевым).

**«Мір»** (284-37-71)
«Белыя цыпачкі»: **19** (пт) 17.00, 19.10, 21.20; **20** (сб) 15.00, 17.00, 19.10, 21.20; **21** (ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.10, 21.20.
«Кухонныя байкі»*** (4х4): **19** (пт) 16.30, 18.30, 20.30.
«Мэркана-марсіянін»*** (4х4): **20** (сб) 16.30, 18.30, 20.30.
«Кава і цыгарэты»*** (4х4): **21** (ндз) 16.30, 18.30 (фэстывальны саміт «Лістападу»), 20.30.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Белыя цыпачкі»: **19** (пт) 14.00.
«Два жыцьці Эванса Грэя»*** (4х4): **19** (пт) 16.20, 18.40, 21.00.
«Кава і цыгарэты»*** (4х4): **20** (сб) 14.30, 16.20 (іл), 18.40, 21.00.
«Мэркана-марсіянін»*** (4х4): **21** (ндз) 15.30, 17.00 (іл), 18.40, 21.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Паляўнічыя на розум»***: **19** (пт) 17.00, 21.00; **20, 21** (сб, ндз) 19.00, 21.00.
«Маладажоны»: **19** (пт) 15.00, 19.00; **20, 21** (сб, ндз) 17.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні»: **19** (пт) 11.00, 13.00, 15.00; **20** (сб) 11.00 (іл), 13.00, 15.00; **21** (ндз) 11.00 (іл), 13.10.
«Мэркана-марсіянін»*** (4х4): **19** (пт) 17.00, 19.00, 21.00.
«Кухонныя байкі»*** (4х4): **20** (сб) 17.00, 19.00, 21.00.
«Два жыцьці Эванса Грэя»*** (4х4): **21** (ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Для дзяцей

**Тэатар юнага гледача**
**19** (пт), 16.00 — «Якая стварыла цуд».
**19** (пт), 20.00 — «Апошняя дуэль».
**20** (сб), 11.00, 14.00 — «Рыцар Ордэна Сонца».
**20** (сб), 19.00 — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сыньярыты Ластаўкі».
**21** (ндз), 11.00, 14.00 — «Папялушка».
**23** (аўт), 18.00 — «Палачанка».
**27** (сб), 11.00, 14.00 — «Сястра мая Русалачка».
**28** (ндз), 11.00 — «Залатое сэрцайка».
**28** (ндз), 16.00 — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**21** (ндз), **27** (сб) — «Хрустальныя туфлік».
**21** (ндз) — «Пітэр Пэн».
**28** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».

**Опэра**
**28** (ндз) — «Горад майстроў».

**Юнаму гледачу:**
**«Аўрора»**
«Прадвесьнікі буры»: **19** (пт) 14.30; **20, 21** (сб, ндз) 12.30.
**«Берасьце»**
«Карпарацыя монстраў»: **20, 21** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Як стаць прынцэсай»: **19** (пт) 12.00; **21** (ндз) 11.00.
«Чароўны востраў»: **19** (пт) 14.00; **20** (сб) 11.00; **21** (ндз) 13.00.
**«Мір»**
«Мур-р-лі»: **20, 21** (сб, ндз) 13.00.
**«Кастрычнік»**
«Чатыры таксісты і сабака» (МКФ «Лістападзік»): **19** (пт) 14.00.
**«Піянер»**
«Шчаўкунок і мышыны кароль» (МКФ «Лістападзік»): **19** (пт) 12.00.
«Мальвіна», «Мышка.ru» (МКФ «Лістападзік»): **20** (сб) 12.00.
«Ералаш» (МКФ «Лістападзік»): **20** (сб) 14.00.
«Маленькае тыграня» (МКФ «Лістападзік»): **21** (ндз) 12.00.
Зборнік мультфільмаў (МКФ «Лістападзік»): **21** (ндз) 14.00.

Паласу падрыхтавалі Наста Бакшанская, Сяргей Петрыкевіч, Сяргей Будкін, Віктар Лютынскі, Васіль Кроква

КІНАФАРМАТ «4Х4»

# Кіно за кавай і цыгарэтамі

Джым Джармуш здымаў сваю карціну 17 год. Фільм, складзены з 11 кароткіх гісторый-анэкдотаў, атрымаўся надзвычай цэласным.

Джармуш стварае карціну зь нічога, са штодзённасьці, какетлівай нуды і неабавязковых размоў. Кава, цыгарэты, два ці тры чалавекі — і гатовы маленькі кінадыямэнт. Гісторыі абрываюцца, як абрываюцца падзеі ў жыцьці — і сплятаюцца паміж сабой фразамі-спасылкамі й геамэтрыяй кадру. Амэрыканец Джармуш нагадвае кінаэўрапейцаў.

Гэты невялікі фільм караваны зоркамі экрану й сцэны: у ім адвялі душу Рабэрта Бэніні, Стыў Бушэмі, музыка Ігі Поп (навэла зь ім у 1993 г. атрымала ўзнагароду ў Канах). Кейт Бланшэт у адным эпізодзе грае ветлівую і стрыманую зорку — і яе разьвязную стрыечную сястру. Сцэнка паміж дзьвюма іпастасямі Кейт Бланшэт насычана тонкім гумарам і камічнай адчужанасьцю. Альфрэд Маліна (у ролі Альфрэда Маліны) набіваецца фанабэрыстаму Стыву Кугану ў сваякі (бадай, найлепшы анэкдот у фільме), а Біл Мюрэй грае зашмальцаванага афіцыянта Біла Мюрэя, які за кадрам палошча горла перакісам.

«Кава і цыгарэты» («Coffee and Cigarettes»)
ЗША—Італія, 2003, чорна-белы, 95 хв.
**Жанр:** Трагікамэдыя
**Адзнака:** 8 (з 10)



MOVIEWEB.COM

Акторская гульня бліскучая, фільм трымаецца на чэхаўскіх нюансах, адценьнях, позірках, паўзах. Як і ў ранейшай карціне Джармуша «Ноч на зямлі», сьвет паўстае камічным, абсурдным, трагічным і неабавязкова-нудным адначасова.

**Андрэй Расінскі**

# Маладое кіно паміж былым і мінулым

## Сямёра маладых кінарэжысэраў — трэці выпуск, падрыхтаваны ў Беларусі — прэзэнтавалі свае дыплёмныя працы

Працяг са старонкі 2.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Першы справа сярод выхаванцаў Міхаіла Пташука — Дзяніс Скварцоў.


**Аляксандар Канановіч. Ягоныя героі глядзяць сэрыялы і трызьняць Бразыліяй.**


**Андрэй Голубеў, каскадзёр. Зьняў камэдыю пра Заходнюю Беларусь і штрафбат.**

• Час у Беларусі нібы спыніўся, таму аднаўляцца можа толькі старое, што складала калісь славу «Беларусьфільму».

Старшыня Саюзу кінэматаграфістаў Ігар Воўчак сымбалічна перадаў «маладым» ад «старых шасьцідзясятнікаў» кінастужку. Але разам з традыцыямі мастакі, здаецца, атрымалі ў спадчыну й заганы беларускіх кінашасьцідзясятых.

Карціна **Максіма Субоціна** «Аб зьніклых бязь вестак», здаецца, зусім не нагадвае пра 60-я гады. Прыпавесьць пра стомленага чалавека, які набывае ў незнаёмага — ці то д'ябла, ці то анёла — квіток у рай, апавядаецца мовай амаль рэклямных ролікаў і відэаклiпаў. Рух камэры, асьвятленьне, закадравыя гукі — форма падбіраецца дасканалая, але калі героі пачынаюць гаварыць, энэргія зьнікае. Як у 60-я гады, калі культываваны аўтарскі пачатак забіваў часам акторскае выкананьне.

Гульня з формаю ёсьць і ў фільме **Дзяніса Скварцова** «Ліка. Дэмбельская байка». Дзяўчына-фатограф прыгадвае ў параненым на вайне жаўнеры знаёмага, якога яна калісьці фатаграфавала. Успаміны дзяўчыны пераплецены з сучаснасьцю, мастацтва з рэчаіснасьцю — і ад празьмерна закручанай формы заблытваецца сюжэт. На экран выпаўзае вайна — невядомая, незразумелая. Можа, гэта вайна ў Чачні, але, хутчэй за ўсё, гэта проста вайна ці манэўры.

У астатніх дыплёмных працах ужо напоўніцу пануе традыцыйная для 60—70-х гадоў тэма вайны.

Дыплёмная карціна **Зьмітра Ляся** так і называецца — «Вайна». Нямецкі жаўнер гвалціць беларускую жанчыну. Але не зьбіраецца яе пакідаць і спадзяецца выхаваць свайго будучага сына. Калі ж у гераіні нараджаецца дзіцё, яна топіць яго, і ашалелы бацька забівае жанчыну. Фільм трымаецца на моцнай акторскай гульні, і Анатоль Кот, які крычыць і глытае глей, адамкнуў не адно глядацкае сэрца. Але гэта яшчэ не «Акупацыя» Кудзіненкі.

**Яўген Сяцько** паставіў фільм паводле апавяданьня Васіля Быкава «Пайсьці і не вярнуцца». Акторскія вобразы не такія распрацаваныя, як у З. Ляся. І ад Быкава хутчэй засталася сюжэтная схема.

Вайна й дзеці — клясычныя тэмы беларускага кінэматографу — спалучаюцца ў карціне **Людмілы Дуброўскай** «Дзікія жывёлы сьвету». Гэта цёплая і гарманічна зробленая стужка пра хлопчыкаў, якія крадуць куфар у старога ваякі, каб убачыць сапраўдных дзікіх жывёлін.

Нават лёгкая побытавая камэдыя «Казанова» **Андрэя Голубева** не абышлася без вайсковых строяў. У Заходняй Беларусі кватаруе штрафбат. Непрыгожы, але спрытны мужычок панадзіўся хадзіць да маладзіц. На яго палюе НКВДыст, але ўсё завершыцца шчасьліва — з разьвітаньнем ды трыма цяжарнасьцямі.

Фільм даволі прафэсійны, але засмучае нават ня столькі вайсковае ўбраньне, колькі няжжытая каляніяльная спадчына: Беларусь толькі сыравіна для чужых герояў.

Жанравай камэдыяй, але ўжо не на тэму вайны, зьяўляецца і карціна **Аляксандра Канановіча** «Дон Пэдра» пра двух старых, якія, нагледзеўшыся сэрыялаў, вырашылі адправіцца ў Бразылію. Праўда, стужка так і не была паказана публіцы.

Чаму такая асьцярожнасьць і архаічнасьць выпускных твораў?

«Гэта наша сытуацыя, наша памяць, наша традыцыя. Гэта ў мастакоў сядзіць дзесьці на генэтычным узроўні — вайна, памяць пра вайну і раскрыцьцё характараў у канфліктных сытуацыях, — кажа кінакрытык і выкладчык Людміла Саянкова. — Характары найбольш яскрава раскрываюцца ў канфліктных сытуацыях. Вайна якраз і была той самай крытычнай сытуацыяй. Таму гэта не папрок, а проста канстатацыя — так, гэта ў традыцыі нашай культуры».

Рэжысэр і журналіст Алег Дашкевіч больш катэгарычны: «Фільмы зробленыя пісьменна, але яны ня вырваліся за межы беларускага савецкага кінэматографу».

«Гэта гісторыя Сомэрсэта Моэма «Непакорная», — распавядае Зьміцер Лось пра сваю карціну. — Я проста перанёс яе на беларускую глебу. Але такая ж гісторыя магла адбыцца паміж расейскім жаўнерам і чачэнкай ці паміж амэрыканскім жаўнерам і іракскай жанчынай. Гісторыя гэтая мяне закранула, і я хацеў, каб яна зачапіла і гледача».

«Ёсьць хатняе заданьне, якое старанна спрабуюць выканаць, але ці адпавядае гэта ўнутранаму адчуваньню — для мяне гэта загадка», — дзеліцца ўражаньнямі кінааналітык Ігар Сукманаў. Ён скардзіцца: «Забівае афіцыёз, забівае гэтая традыцыя вайсковага мастацтва, за якой не заўжды прагглядаецца самастойнае рашэньне… Ёсьць адчуваньне дзяржзамовы, якая вісіць над хлопцамі».

Што да дзяржаўнай замовы, то яна сапраўды ёсьць — вусная і пісьмовая. А калі час у Беларусі нібы спыніўся, то аднаўляцца можа толькі старое, што складала калісь славу «Беларусьфільму».

Вайна — адзіная ўлюбёная тэма з гісторыі, якую схільна прыгадваць сёньняшняя ўлада, бо менавіта на гэтай памяці яна спрабуе паразытаваць. Вайна і дзеці — гэта ключавыя тэмы «Беларусьфільму», але грамадзтва, у адрозьненьне ад вярхоў, не зьдзяцінела. Новыя жанры і формы — гэта рызыка, сыстэме ж прасьцей абаперціся на старое, і існуюць тысячы абмежаваньняў для маладых творцаў.

«Я ведаю, як часам абмяркоўваюцца фільмы альбо сцэнары, — расказвае Людміла Саянкова. — Гэты сцэнар кепскі, бо там гераіня не такая, тут няма сацыяльнага фону, там няма дабрыні, там няма станоўчага героя… Калі маладому чалавеку паставіць такія ўмовы і сказаць, што толькі такі сцэнар будзе запушчаны, а ня іншы, якая ўжо тут свабода. У *нашым* кіно зашмат абмежаваньняў: туды нельга, сюды нельга, тут няма магчымасьцяў і гэтага нельга».

Каб вырвацца з такіх умоў, трэба *ўжо* вырасьці ў моцнага мастака.

Але тэматычныя абмежаваньні й архаічная сыстэма прыняцьця рашэньняў у беларускім кіно — гэта толькі адна спарахнелая спадчына новым мастакам.

Ёсьць яшчэ адно. Так, усе-ўсе (!) выпускныя творы, у тым ліку і фільм паводле Быкава, зробленыя на расейскай мове. Ёсьць асобныя моўныя рэверансы мясцовых гутарак у фільме «Казанова», але гэта ў межах этнаграфічнага каларыту.

Праўда, вінаваціць маладых беларускіх рэжысэраў у сталым моўным прыстасавальніцтве й каляніяльным канфармізьме не выпадае. Так, у курсавой працы Людмілы Дуброўскай «Каханьне» беларуская мова займае пачэснае месца. Але патрабаваньні «Беларусьфільму» да карціны «Дзікія жывёлы сьвету» ўжо былі катэгарычныя: толькі на расейскай мове. (Беларуская мова «Каханьня» нат гледачам у Расеі чамусьці не замінала — і рэжысэр нават атрымала ад гледачоў допіс з падзякай.)

Каляніяльнасьць і разваленасьць індустрыі ставіць пад пагрозу й саму прафэсію.

«Засталіся лічаныя адзінкі людзей, якія могуць працаваць і працуюць яшчэ ў тых прыніжальных умовах. Заробкі проста мізэрныя, людзі ня могуць паважаць сябе за такі заробак, а людзі дастойныя, якія ўсё жыцьцё працавалі на кінастудыі. І цяпер яны фактычна ў нейкім стане жабракоў. На кінастудыі цяпер добра сябе адчуваюць прыежджыя групы. А на нашых дзяржаўных карцінах сабраць групу — праблема», — распавядае пра свой яшчэ кароткі, але шокавы досьвед Людміла Дуброўская.

«Што будзе далей, ці будуць яны працаваць у кіно? — задае пытаньне пра выпускнікоў Людміла Саянкова. — Але штосьці ёсьць у іхніх карцінах, гэтыя маладыя рэжысэры не бяз таленту, не бяз здольнасьцяў. Аніводны фільм не пакінуў нас абыякавым. Яны прымусілі нас эмацыйна адклікнуцца, а гэта ўжо нямала».

Прымусіла яе спачуваць карціна «Вайна», зьдзівіў Андрэй Голубеў, які раней не здымаў камэдый, «і здольнасьць выяўляць новы й новы патэнцыял — гэта добра, такі чалавек свабодны», а пра экспэрымэнты з формай Дзяніса Скварцова і Максіма Субоціна кінакрытык згадала з асаблівай цеплынёй. Дарэчы, карціна Субоціна ўжо пасьпела пабываць на фэстывалях і атрымаць узнагароду.

Мінуўшчына новымі рэжысэрамі засвоена.

Пра будучыню маладыя мастакі гавораць з рэвалюцыйным імпэтам і надзеяй: «Трэба ўсё зламаць і будаваць па-новаму», — кажа Людміла Дуброўская.

Максім Субоцін спадзяецца на прадусарскі кінэматограф і зазначае, што «лёс такога кіно, якое будзе стварацца ў Беларусі за кошт дзяржавы, — прадвызначаны і тэматычна, і жанрава на найбліжэйшыя тры гады». І дадае: «Я ня думаю, што гэтыя фільмы ў найбліжэйшы час выведуць краіну на прэстыжныя кінафэсты».

І ўсё ж такі ці не застануцца маладыя мастакі паміж былым і мінулым, ці не застануцца ў межах беларускіх шасьцідзясятых?

На гэтае пытаньне Ігар Воўчак адказаў так: «Яны маюць будучыню, таму што яны, па-першае, маладыя, а, па-другое, таленавітыя. У іх ёсьць час, яшчэ выйдуць за гэтыя межы. Трэба спачатку асвоіць рамяство — і гэта адбылося. А далей — выйдуць яны».


**Зьміцер Лось. Перанёс Сомэрсэта Моэма на беларускую глебу. Прымусіў плакаць Анатоля Ката.**


**Яўген Сяцько. Паставіў фільм паводле апавяданьня Быкава «Пайсьці і не вярнуцца».**

• Лёс кіно, якое будзе стварацца ў Беларусі за кошт дзяржавы, прадвызначаны.


**Людміла Дуброўская. Працуе з клясычнымі беларусьфільмаўскімі тэмамі — дзеці і вайна.**


**Максім Субоцін. Заснавальнік акторскага агенцтва. Здымае фільмы, падобныя да відэаклiпаў.**

# Дзеці нашыя і дзеці чужыя

Тэда Лі


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Калі крочыш віленскімі дварамі, бачыш дзясяткі розных дзетак — з багацейшых сем'яў і зь сем'яў тых, хто зь цяжкасьцю дацягвае да чаргавага заробку, дзетак літоўцаў, дзетак літоўскамоўных расейцаў і дзетак «палякаў з-пад Горадні». Сьвежых і прыгожанькіх, кволых і хваравітых, бойкіх і актыўных, запаволеных і мэлянхалічных дзетак. Гэткіх жа, як у мяне на Радзіме. Нічым не адрозных ад менскіх.

Але калі я праходжу міма дому, каля якога яшчэ не старая літоўская бабуля разьвешвае намытую бялізну, ейная зусім маленькая ўнучка, кінуўшы свае справы, падыходзіць да мяне і глядзіць да сьмешнага бессаромным позіркам проста ў вочы. Я ўсьміхаюся, як бы я ўсьміхнулася сваёй аднакурсьніцы, і гэтак жа безь дзіцячаньняў кажу: «Здарова». Яна таксама шырока ўсьміхаецца, уся зіхаціць і адказвае мне: «Здарова». Пасьля какетліва закочвае вочы і паказвае пальчыкам на кінуты праз маё зьяўленьне занятак. На ўзроўні маіх каленяў бабуля павязала ёй уласную вяроўку, дзе яна разьвешвае ўласныя кашулькі і нагавічкі. Пасьля мы махаем адна адной, і я іду шпацыраваць далей.

Кожны раз пасьля нечаканых сутыкненьняў з разьняволенымі незакамплексаванымі замежнымі дзецьмі мне прыгадваецца сяброўскі пляменьнік Уладзік, беларускае малое, падобнае да купідона з касьцельнай ляпніны. Гэтае бездакорна прыгожае стварэньне кожны раз, сустракаючыся са мною, паказвае на мяне пальцам і зь недаверлівай непрыязнасьцю шыпіць: «Цёёёёёёця…». Вядома, свае выключэньні можна знайсьці паўсюль, але я заўсёды адчуваю ў такіх паводзінах беларускіх дзетак нейкую схаваную пагрозу. Гэта нібыта паказвае ўсю нездаровую сытуацыю ў нашай краіне. Бо нашы дзеці яшчэ ў самым сваім, здавалася б, несьвядомым узросьце, калі не адчуваецца небясьпекі, калі хочацца засунуць палец у тостэр і скочыць з даху бацькавага гаража на дах суседзкага, пры гэтым саромеюцца людзей і не пачуваюцца камфортна ў асяродку чужых дарослых (ці, прынамсі, сталейшых). Яны выхоўваюцца ў грамадзтве, дзе прынята асьцерагацца адно аднаго, дзе *нада быць паслушным*, дзе трэба *васьпітываць* дзяцей, даваць ім дзягі, раўсьці ім на вуха, казаць *«Нязьзя»*, загадваць: *«Стань красіва»* і *«Паздаровайся зь дзядзям»*. Між тым мае падазрэньні пра віну грамадзтва пацьвярджаюць і дзеці яго так званай альтэрнатыўнай часткі: беларускія «хіпары» сваіх *дзетак сонца* цягаюць на канцэрты і фэстывалі, дзе апошнія бяруць кожнага за руку і радасна паведамляюць усяму сьвету сваё імя і прозьвішча. Тое ж адбываецца і ў асяродках свабодных і сьвядомых беларусаў, дзе малыя растуць як сабе хочацца, ходзяць куды ўзбрыдзе, апранутыя бог ведае як, вечна ўсьмешлівыя і да ўсіх прыязныя ды ветлівыя. І першыя, і другія хутчэй сталеюць, робяцца самастойныя і могуць паапекавацца самі сабой з раньніх гадоў жыцьця. На жаль, гэта не стандарт.

Сыстэма вучыць чалавека быць падначаленым і ня тое каб баяцца, але недзе глыбока ўнутры ціхенька так *пабойвацца* кожнага мацнейшага, бо варожы інтарэс можа быць нават за самым добразычлівым тварам. І нашы малыя чалавечанятkі прыпадабняюцца да малых кацянят ці галубоў, якіх інстынкт прымушае асьцерагацца людзей, хаця, як правіла, ніхто не жадае зла гэтым насельнікам гораду. І што ўжо казаць пра дарослых, якім крылы паабломваў досьвед, калі іх дзеткі, якім трэба было б глядзець на сьвет шырока расплюшчанымі вачамі, быць наіўнымі і цікаўнымі, з раньніх гадоў навучаюцца саромецца і не давяраць.

> У параўнаньні зь беларускімі літоўскія дзеці мацней паважаюць адно аднаго. А яшчэ літоўскія дзяўчынкі ведаюць нашмат болей песень, як па-літоўску, так і па-ангельску.

Напрыканцы нядаўна мінулага жніўня мой хрышчоны бацька разам зь сям'ёй узяў мяне на адпачынак на поўнач Літвы, пад горад Шылуце. Гэтая цікавая і вясёлая сям'я жыве ў цалкам жывой заходняй беларускай вёсцы. У бацькі з жонкай двое дзетак — адзінаццацігадовая дзяўчынка задуменнага складу характару і шасьцігадовы хлопчык — крыклівы і энэргічны «хуліган». Апроч нас на адпачынку былі тры літоўскія сям'і — сябры майго хрышчонага бацькі. Літоўцы прывезьлі з сабой тры дзяўчынкі ўзросту маёй хрышчонай сястрычкі, яшчэ аднаго «хулігана» і пакуль незнаёмага гэтаму сьвету чалавека ў жываце адной з мам.

Шчыра скажу, нашы звычайна такія яскравыя і разумненькія дзеці на фоне дзяцей тамтэйшых выглядалі надзвычай *шэра*. Калі б у мяне спыталі, якімі дзеці павінны выхоўвацца ўвогуле, я б найперш прыгадала тых сьмелых, камунікабэльных і таварыскіх дзетак, для якіх Эўропа — гэта ўжо ў літаральным сэнсе Радзіма. Паколькі ўсе дзеці, так ці інакш, былі з правінцыі і ўсе былі аднолькавага ўзросту, у той сытуацыі я насамрэч мела права параўноўваць.

Па-першае, мова. Літоўскія малыя і блізка ня ведаюць, што такое расейская (тым больш беларуская) мова, таму з нашымі яны так і не змаглі паразумецца. Праз колькі хвілін знаёмства мая сястрычка прыбегла да мяне і з жахам сказала: «Ведаеш, мы паспрабавалі па-ангельску, але я пакуль толькі словы вучыла, а яны са мной цэлымі сказамі размаўляюць». Хлапцы, безумоўна, мелі больш пасьпех: у іх узросьце яшчэ дастаткова выклічнікаў.

Па-другое, настрой. Ад усіх чужых дзяцей я за ўвесь час ня чула, каб яны сварыліся між сабой. Ніякай ваяўнічасьці. Дзяўчынкам, відома, цікавей бегаць босымі па расе і сьпяваць песьні (якіх і па-літоўску, і па-ангельску яны ведаюць безьліч) паміж сабой, іх малы тым часам цудоўна знаходзіў сабе ўласныя занятkі. Ня думаю, што моцна памылюся, калі скажу, што ўсе яны вельмі паважаюць адно аднаго. Нашы дзеткі за той жа час ледзьве не забілі адно аднаго, і да канца падарожжа бойкі, спрэчкі і грубыя выкрыкі ў нашым «лягеры» не сьціхалі.

Па-трэцяе, адказнасьць. Мой брацік сеў у надзіманы човен і нейкім чынам перакуліўся проста ў ваду. Надзіманыя чаўны, як і любыя іншыя, калі яны не навязаны, заўсёды адбіваюцца ад берагу. І наша беднае дзіця (абое нашы ня ўмеюць плаваць, бо жывуць далёка ад вадаёмаў), учапіўшыся ў край чаўна, цеплялася ў вадзе, нікім не заўважанае. Яго літоўскі прыяцель, не перарываючы весялосьці астатніх просьбамі дапамагчы, зайшоў у ваду і выцягнуў човен разам з напалоханым дзіцем, а пасьля яшчэ цэлы вечар катаў дзевак па возеры, дастаўляючы ім шмат асалоды і не прыносячы ніякага клопату дарослым.

> Беларуская сыстэма выхаваньня вучыць чалавека быць падначаленым, саромецца і не давяраць.

Я ніякім чынам не зьбіраюся папракаць у нечым ні нашых дзяцей, ні іх бацькоў. Яны — якраз адна з па-сапраўднаму *сапраўдных* сямей у сваёй вёсцы. Гэта менавіта той прыклад, калі асяродзьдзе і агульны ўклад не даюць дзецям расьці цалкам незалежнымі і непасрэднымі.

Калі праходзіш міма звычайнай віленскай пачатковай школы, хлапцы тут, як і належыць любым хлапцам, хаваюцца ў кустах і сур'ёзна выцягваюць нікацін з аднае на ўсіх цыгарэты, атрыманай шляхам неймаверных махінацый. У нас тое самае.

На літоўскіх курортах дзеці павісаюць на бацькоўскіх руках, кленчаць папкорну і пакатацца вось на гэтым атракцыёне. У нас яны такія ж.

Бяда тут ня ў тым, што дзеці робяць альбо чаго яны рабіць не асьмельваюцца. Пытаньне ў тым, што яны пры гэтым думаюць і наколькі яны вольныя ў сваіх думках. Вольныя зь дзяцінства.

Быць дзіцем — гэта як сэкта, якую пакідаеш, выходзячы з пэўнага ўзросту. Малыя ўсё роўна заўсёды будуць не такімі, як дарослыя: яны паўсюль будуць маляваць карцінкі з галюцынагенным эфэктам, прыдумляць свае сьветы і расстаўляць у іх крэслы і рассаджваць уласных пэрсанажаў (у сваёй галаве ці кампутарных Sim's'ах), яны будуць плянаваць ажыцьцяўленьне тысяч жаданьняў для свайго дарослага, поўнага магчымасьцяў, жыцьця («А калі ў мяне будзе сто тысяч мільёнаў баксаў, я куплю цэлы грузавік жуйкі…»), якія са сталеньнем распусьціцца ў паветры, як мыльныя бурбалкі. Хацелася б проста, каб аднойчы і ў нашай краіне нарадзіліся дзеці, чые мары змогуць зьдзейсьніцца…

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Кансэрватары ўсіх краін, не яднайцеся!

**Паводле апытаньняў, калі б беларусы выбіралі паміж Керы і Бушам, за дэмакрата прагаласавалі б 62%. Ведалі б яны, каго падтрымліваюць...**

Электаральная Фалуджа, якую Буш-юніёр зрабіў дэмакратам, абламала ўсю прагрэсіўную фракцыю чалавецтва. Самыя дэмаралізаваныя вырашылі проста нажрацца і глядзець на палітыку як на шоў, накшталт праграмы «За шклом». Сапраўды, цікава, каго сёньня выкінуць з адміністрацыі — Паўэла або Рамсфэльда?

Буйныя не здаюцца. Правадыр зялёных Даніель Кон-Бэндыт агітуе эўрапейцаў выдаваць гранты на падтрымку грамадзянскага руху ў ЗША. Я адразу ўявіў адмарозкаў Бівіса і Батхеда з руху «Бізон», якія бамбяць сьцены ў Алабаме графіці «Дзе Бэн Ладэн? Дзе Садам?». Частка дэмакратаў заявіла, што яны ня хочуць заставацца віртуальнымі вязьнямі бушаўскага Абу-Грайба, і ініцыявала рух за далучэньне ціхаакіянскіх і паўночна-ўсходніх штатаў (выбарчая маліна дэмакратаў) да лібэральнай Канады. Вам не здаецца, што гэты кампакт мы ўжо недзе чулі? Тыя ж варыянты — пайсьці ў запой, эміграваць або працягваць барацьбу — стаяць перад кожным прыхільнікам беларускай дэмакратыі пасьля кастрычніцкага рэфэрэндуму. І гэта ня проста супадзеньне па часе выбараў у іх і плебісцыту ў нас.

Бушмэны прызнаюць, што замачылі Керы дзякуючы палітэхнолягу Карлу Роўву. Заакіянскі Глеб Паўлоўскі яшчэ пасьля выбараў 2000 г. канстатаваў, што падчас галасаваньня чатыры мільёны кансэрватыўных хрысьціян замест таго, каб падтрымаць GOP («Great Old Party» — паганяла рэспубліканцаў), слухалі па «Family Radio» цікавую перадачу «Людзі ня могуць паходзіць ад малпаў, бо ў чалавека няма хваста». Роўв прапанаваў гопнікам весьці электаральную кампанію з пазыцыі абароны маральных прынцыпаў і здолеў дастукацца да сэрцаў апалітычных каўбоеў, мармонаў і аматараў госпэлаў. Піяр-кампанія Роўва была кангеніяльнай: прыходзіць GOP-агітатар на фэрму да каўбоя і адразу яму ў лабэшнік: «Вы ведаеце, што сюды ідуць чарнаскурыя гомікі-дэмакраты, якія забяруць у вас стрэльбу, мясцовую царкву перабудуюць у гей-клюб «Бабілён», жонку зробяць фрыгіднай фэміністкай, а з вамі зробяць такоооооое! Дык калі вы не жадаеце дэм-Садому, скачыце галасаваць за Буша».

Цяпер уявіце, што Магілёўскую вобласьць напярэдадні 2 лістапада — дзень выбараў за акіянам — прынялі ў склад ЗША. Пастаўце перад згаданай дылемай — Буш або Керы — жыхароў Краснаполья, дзе за Луку прагаласавала 99%. Упэўнены, за тое, каб не дапусьціць «блакітчыны», прагаласуюць тыя ж 99%. І наадварот, дайце каўбою з Паўночнае Дакоты бюлетэнь аб трэцім тэрміне — яго маральныя прынцыпы падкажуць, што выбіраць, і лепей датэрмінова, трэба праваслаўнага атэіста. Выходзіць, што электарат Буша і Лукашэнкі гамагенны, нягледзячы на тое, што абодва палітыкі адзін з адным полі ня сядуць гуляць у шахматы. Парадокс гісторыі, а магчыма, гістарычнае наканаваньне. Як ні дзіўна, у геапалітычнай канфрантацыі лідэраў кансэрватараў і ёсьць шанец левых ды лібэралаў. Калі б электараты Лукашэнкі і Буша пакарашыліся, то дэмакратыі сапраўды прыйшоў бы капец.

**Лёлік Ушкін, левы радыкал**




**Моладзевая вечарына**

**26** лістапада (пятніца)

адзначаем 84-я ўгодкі



**Слуцкага збройнага чыну**

выступы адмыслоўцаў з гісторыі паўстаньня і барда Андрэя Мельнікава
Варвашэні 8. Сядзіба Партыі БНФ.
Пачатак а 18, уваход вольны
Даведкі: 284-50-12, 408-09-25, 668-58-21, 767-01-34

Беларускі ПЭН-цэнтар запрашае Вас на прэзэнтацыю кнігі
**а.Аляксандра Надсана «Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус»**,
якая адбудзецца 8 сьнежня ў дольняй залі Чырвонага Касьцёлу.
Пачатак а 18-й гадзіне.

**Запрашаем у падарожжа**
**21** лістапада (нядзеля)
**«Нёманская каса»**
па маршруце: **Менск—Вузда—Кухцічы—Наднёман—Нясьвіж—Вішнявец—Новы Сьвержань—Менск**. 18000
**28** лістапада (нядзеля) **«Замкі Беларусі»: Мір—Наваградак—Любча—Ліда**. 20000
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем Юр'я і Наташу Барысоў** з нараджэньнем дачкі. Сям'я Качынскіх

**Віншуем Ганну і Алеся Юркойцяў** з узяцьцем шлюбу. Вашы былыя госьці, якія позна дазналіся навіну

**Вітаем нашага Волата** Зьмітра Бародку з 30-годзьдзем. Горад-зубр Барысаў

**Прыхільніцу Гаспадыніча** віншую з Днём народзінаў. Aut Caesar aut nihil. 19 гадоў — якія жарты? Bill

**Даволі млява**, без энтузіязму віншуем-такі самую зялёную жабу серабранскіх багнаў зь неабавязковым зусім не юбілеем. Аматары жабіных лапак: амёба, бэгемот, злосны Віні-Пух, інфузорыя-лапаць

### КАНТАКТЫ

**Студэнтка** 5-га курсу БДУК шукае месца для пастаноўкі дыплёмнага спэктаклю паводле сьвята восеньскага раўнадзенства «Багач». Т.: 243-39-00, 8-029-761-98-51 (пасьля 14-й). Галіна

### КНІГІ

**Прадаю** поўны камплект газэты «Прессбол» за 1991 год (першы год выхаду) у добрым стане. Кошт — 25 тысяч рублёў. Зьвяртацца на электронны адрас hlinka2004@yahoo.com

**Прадам кнігі**: Я.Сямашка «Армія Краёва»; В.Ластоўскі «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік», факс. выд. 1924 г.; «Словарь современного литовского языка», 1953, літ. мова, 990 с.; У.Галубок «Творы»; Я.Дыла «Творы» ды іншае. Т.: 8-029-753-70-05, 236-02-15

**Набуду** «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» В.Ластоўскага. Т.: 234-93-71. Сяржук

**Кніга Аляксандра Фядуты** «Александр Лукашенко. Его время, его народ» замест лістапада выйдзе ў студзені 2005 году. Папярэднія замовы можна дасылаць на электронны адрас: feduta-book@mail.ru

**Прадам кнігі:** энцыкляпэдыі «Этнаграфіі Беларусі», «Археалёгія і нумізматыка», «Мысьліцелі і асьветнікі Беларусі», «Беларусь у гады ВАВ», «Живописная Россия. Белорусское и литовское Полесье» ды інш., паэзія, мовазнаўства. Т.: 8-029-753-70-05, 236-02-15

**«Споведзь»** Ларысы Геніюш, «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва» М.Шчакаціхіна, «На крыжовай дарозе» А.Калубовіча, «Лексычны атляс беларускіх народных гаворак», іншыя кнігі, дапаможнікі, слоўнікі, відэа, аўдыё, CD, майкі на Румянцава, 13 (ТБМ) з панядзелка па пятніцу (11.30—18.00). Т.: 707-40-01

**Набуду** старыя нумары часопісу «Arche» (да 2002 г.); №2 за 2003. Набуду «Беларуска-літоўскі слоўнік». e-mail: siarzhukBaj@tut.by, тэл. 685-52-39. Сяржук

**Прадам** кнігі: В.Ластоўскі «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (Коўна, 1924), Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска-расійскі слоўнік», В.Ластоўскі «Творы» («Беларускі кнігазбор»), збор твораў В.Быкава ў 6 тамах, 1994 ды інш. Т.: 236-02-15

**Прадам** кнігі: Я.Сямашка «Армія Краёва», «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне», энцыкляпэдыі «Археалёгія і нумізматыка», «Архітэктура Беларусі», «Этнаграфія Беларусі». Т.: 236-02-15

**Прадам** кнігі: В.Ластоўскі «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік», 1924; Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска-расійскі слоўнік», 1926; Л.Юрэвіч «Камэнтары»; паэзія: Элюар, Уітмэн, Гайнэ, Маракоў, Пушча, У.Галубок, Я.Дыла ды інш. Т.: 236-02-15

**Увага!** Штосуботу з 11-й да 15-й пры клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ (ст.м. «Трактарны завод») працуе гандлёва-абменны пункт беларускай музыкі. Вас чакаюць сустрэчы зь вядомымі музыкамі, знаёмства з аднадумцамі, музычныя навінкі, прадукцыя па самых нізкіх цэнах, квіткі на канцэрты і шмат іншага. 20 сьнежня — сустрэча з Варашкевічам і «Крамай». Даведкі: 241-24-74, 766-24-25 (Янак)

**Увага!** Кожны чацьвер у офісе Таварыства беларускай мовы (пл.Перамогі, Румянцава, 13) адбываюцца сходы фан-клюбу беларускай музыкі

**Прадаю** CD: «NRM»: «Spravazdača» (з аўтографам Вольскага), «Стары Ольса», «Шлях», «Ulis»: «Падарожжа», «Viza NRM». Т.: 8-029-509-18-23, Зьміцер

**Новыя ды старыя** нумары «Arche», «Лексычны атляс беларускіх народных гаворак» (т.3, 5), «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (т.13, 15. 18, 19), «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» (т.2, 5, 6, 7), іншыя кнігі, слоўнікі, энцыкляпэдыі, а таксама відэа, аўдыё, CD, майкі на Румянцава, 13 (ТБМ) з панядзелка па пятніцу (11.30—17.30). Т.: 8-029-707-40-01

### ПАКОЙ

**Дзьве дзяўчыны** здымуць пакой або аднапакаёвую кватэру (да 50 у.а.) у Менску на працяглы тэрмін. Т.: 8-029-336-67-36

**Беларуская сям'я** (3 чалавекі) здыме аднапакаёвую кватэру (да 60 у.а.) у Менску. Т.: 8-029-766-72-88

**Здыму** аднапакаёвую кватэру ці пакой у Фрунзэнскім раёне Менску. Т.: 8-029-766-72-88

**Прыстойны студэнт**-ліцьвін здыме з Новага року аднапакаёвую кватэру недалёка ад станцыі мэтро. Найлепшы варыянт — раён ад Кастрычніцкай да Акадэміі навук. Т.: 8-029-678-33-38. Уладзь

### ПРАЦА

**Для працы ў Швэцыі** патрабуецца беларускамоўная гувэрнантка. Умовы: жыцьцё ў сям'і, двое дзяцей (дзяўчынкі), праца афіцыйная, першапачатковы тэрмін ад 4 месяцаў да 1 году, пачатак — люты—сакавік 2005. Патрабаваньні: дзяўчына, узрост 18—30, валоданьне беларускай і ангельскай мовамі, уменьне ладзіць зь дзецьмі. Кантакт праз электронную пошту: andrus_s@tut.by. Т.: 8-029-647-71-12

**Павал Севярынец** шукае працу ў Менску. Грамадзкі мэнэджмэнт, адукацыя, публіцыстыка. Т.: 8-0212-21-45-31

**Якасна выканаю** пісьмовыя работы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

**Беларускамоўная студэнтка** 5 курсу БДУК шукае працу ў наступных кірунках: арганізатар сьвяточных мерапрыемстваў, кіраўнік фальклёрнага, тэатральнага гуртка. Т.: 8-029-761-98-51. Галіна

**Ладныя пераклады** з ангельскай, польскай, французкай, украінскай, маскоўскай на беларускую/ангельскую. Т: 8-029-678-33-38

### СПАЧУВАНЬНІ

**Шчырыя спачуваньні Алесю Пушкіну** з прычыны сьмерці маці. Сябры з Нальшчанскага краю

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Раману С. зь Львова.** Дзякуй за ліст. У Вас у краіне адбываюцца гістарычныя падзеі. Нам з адлегласьці гэта бачыцца яшчэ выразьней. Вас цывеляць дробязі, нас захапляе агульная карціна.

**Ірыне З. зь Менску.** У сваёй дзейнасьці Вы падмянілі няпростае змаганьне супраць сапраўднага ворага й душыцеля беларушчыны камфортнай барацьбой супраць, як Вы называеце, «псэўдаапазыцыі». Адпаведна нецікавы і артыкул.

## КАІСА

### Ад «Стратэга» да «Патрыёта»

Першы беларускі шахматны кампутар зваўся «Стратэг», яго распрацаваў Артур Белавусенка на Менскім заводзе вылічальнай тэхнікі пры канцы 80-х. Важкая скрыня, самавітыя фігуркі, якія належала перастаўляць туды, дзе запаліцца сьвятладыёд… Цяпер з гэтым партнэрам гуляюць пераважна дзеці-пачаткоўцы — узровень 4-га разраду для сёньняшніх аматараў малацікавы. Неўзабаве па зьяўленьні «Стратэга» ў Беларусь сталі паступаць «прасунутыя» шахматныя прадукты з Захаду. Пад канец 90-х пабольшала іх і ў Сеціве.

Людзі з пакаленьня *next* забаўляюць сябе самі, пішучы праграмкі для гульні ў шахматы. Камусьці ўдаецца пашырыць даляглядзі й паваяваць з наймацнейшымі — «Фрыцам», «Джуніёрам», «Шродэрам»... Кагадзе завяршылася неафіцыйнае першынство сьвету сярод кампутарных праграм. Гэтая «пятая шахматная вайна» праходзіла на швайцарскай сыстэме, у 11 тураў, з падлікам рэйтынгаў — усё як у людзей. Раней беларусы ня бралі ўдзелу ў спаборніцтвах такога рангу. У першай лізе — турніры «В» — праграма Ўладзімера Еліна «Patriot 1.3.0» аказалася чацьвёртай сярод паўсотні аналягаў. Праўда, у фінале «Патрыёт» заняў сьціплае 38-е месца з 40 (першае — у француcкага «Фараону»). Другой беларускай праграме «Wildcat» ужо ў турніры «В» цяжка было супрацьстаяць італьянскім «Лейлам» ды брытанскім «Постмадэрністам» — і яна галянтна прапусьціла іх наперад, застаўшыся ў чацьвёртай дзясятцы…

Дадамо, што ў віртуальным чэмпіянаце СНД, што адбыўся ўвесну, елінская «Каіса» (папярэднік «Патрыёта») выйшла пераможцам, абагнаўшы сем расейскіх і ўкраінскіх праграм. Праўда, і апошняе месца заняў беларускі прадукт — просьценькі «Мустанг»… «Дзікі кот» работы Ігара Каршунова ўзяў тады бронзу. Каб усіх гэных зьвяроў упрэгчы ў адзін вазок і напусьціць на ганарыстую арабскую «Гідру», якой баяцца бялковыя «гросы»…

**ВР**

Карысныя адрасы: «Каіса», «Патрыёт» — gladiatorshop.com/patriot.htm; «Дзікі кот» — sdchess.narod.ru/wildcat.htm; «Мустанг» — chessmustang.narod.ru

### Як бы вы згулялі?

**«Патрыёт» (Беларусь) — «Крафці 19.17» (ЗША). Ход белых. Знайдзіце плян дасягненьня перамогі.**



**Адказ**: 1. Са6! з ідэяй 2. Фb6, 3. Сb7 і 4. а8Ф. Чорныя адчайна ахвяравалі пешку (1…с4), аднак пляну белых перашкодзіць ня здолелі.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3499. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 17.11.2004.
Замова № 7023.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а